Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

23 МАЯ 2007 г. СЕРАДА

№ 93 (25958)

Кошт 400 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Выпускныя экзамены — без «спонсарства» бацькоў

У Міністэрстве адукацыі лічаць недапушчальнай практыку збору грашовых сродкаў з бацькоў навучэнцаў на правядзенне экзаменацыйнай кампаніі.

У загадзе «Аб арганізацыі вывучэння работы органаў управаўлення адукацыяй, агульнаадукацыйных установаў па падрыхтоўцы і правядзенню выніковай атэстацыі», які падпісаў міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў, падрабязна прапісаны дзеянні ўсіх зацікаўленых бакоў. У прыватнасці, управаўленню агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі даручана ўстанавіць кантроль за аператыўным разглядам паступіўшых у міністэрства зваротаў грамадзян, якія датычацца выніковай атэстацыі выпускнікоў, і наладзіць работу «гарачай» лініі па пытаннях арганізацыі і правядзення выпускных экзаменаў. Як паведамілі журналісту «Звязды» ў міністэрстве, з 28 мая па 7 чэрвеня атрымаць усю патрэбную інфармацыю можна будзе па тэлефоне 222-68-48.

Управаўленням адукацыі аблвыканкамаў і Камітэту па адукацыі Мінгарвыканкама даручана наладзіць кантроль за разглядам управаўленнямі і аддзеламі адукацыі рай(гар)выканкамаў і мясцовых адміністрацый матэрыялаў па выніках правядзення выніковай атэстацыі і прыняццем рашэнняў аб узнагароджанні выпускнікоў залатымі і сярэбранымі медалямі, стварыўшы для гэтых мэтаў камісіі.

Асобны пункт загада прысвечаны даволі распаўсюджанай у беларускіх школах з'яве, аб якой не прынята гаварыць услых. Практыка збору грашовых сродкаў на правядзенне экзаменацыйнай кампаніі павінна быць выключана. Адказнасць за выкананне гэтага пункта ўскладаецца на абласныя ўпраўленні адукацыі і Камітэт па адукацыі Мінгарвыканкама.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«БЕЛАРУСЬ І ІРАН ЗНЯЛІ ЎСЕ ПЕРАШКОДЫ ДЛЯ НАРОШЧВАННЯ АБ'ЁМАЎ УЗАЕМНАГА ГАНДЛЮ»

Такі асноўны вынік афіцыйнага візіту прэзідэнта Ісламскай Рэспублікі Іран у Беларусь.

22 мая Аляксандр Лукашэнка і Махмуд Ахмадзінежад прадоўжылі сустрэчу. У Нацыянальнай бібліятэцы адбылося снеданне ад імя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з нагоды завяршэння візіту прэзідэнта Ірана.

«Мы задаволены вынікамі перагавораў і дамоўленасцямі. Мы дасягнулі тых мэт, якія ставілі перад сабой, — заявіў беларускі лідар на падагульняючай прэс-канферэнцыі. — Сёння няма тых пытанняў, па якіх мы не дамовіліся б».

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў іранскаму прэзідэнту за разуменне праблем, якія ёсць у Беларусі, перш за ўсё ў энергетычнай сферы.

«Для нас з'яўляецца праблемай найвялікшая залежнасць ад адной дзяржавы па пастаўках энергарэсурсаў. Мы аб гэтым шчыра гаворым. Беларусь папрасіла іранскі бок дапамагчы вырашыць гэту праблему», — падкрэсліў беларускі Прэзідэнт. Ён растлумачыў, што ў час візіту на вышэйшым узроўні ў Тэгеран у 2006 годзе прэзідэнт Ірана і духоўны лідар гэтай краіны прапанавалі Беларусі здабываць нафту ў IPI і выкарыстоўваць на сваё вырашэнне. Акрамя таго, іранскі бок выказаўся за стварэнне сумесных вытворчасцяў у Беларусі і Іране.

Для аптымізацыі фінансавых разлікаў паміж краінамі было прынята рашэнне аб тым, што іранскі банк адкрые сваё прадстаўніцтва ў Беларусі. У нашай краіне таксама адкрыецца банк са 100-працэнтным іранскім капіталам. Такім чынам, бакі выйшлі на прамыя фінансавыя разлікі. «Гэта вырашыць праблемы па дыверсіфікацыі беларускага экспарту», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

«Для Беларусі з'яўляецца праблемай дыверсіфікацыя знешняга гандлю, перш за ўсё экспарту. Мы сёння вельмі залежныя ад Расіі і Еўрасаюза па продажы нашых тавараў. Іран у год закупляе тавараў на $60 млрд. І мы атрымалі запэўненне прэзідэнта Ірана, што гэта краіна будзе закупляць беларускія тавары сусветнай якасці па прымальных цэнах. Нас гэта задавальняе», — падкрэсліў беларускі лідар. Аляксандр Лукашэнка перакананы ў добрых перспектывах супрацоўніцтва з Іранам. «Што датычыцца палітычных і дыпламатычных адносінаў Беларусі і Ірана, то дай Бог, каб у нас з іншымі дзяржавамі было такое разуменне і супрацоўніцтва, — сказаў ён. — Мы будуем супрацоўніцтва ў інтарэсах дзяржаў і народаў». Пры гэтым, каментуючы вынікі двухдзённых сустрэч з іранскім калегам, Прэзідэнт адзначыў: «Калі нехта думае, што сустракаюцца, як кажуць, краіны-ізгоі, і яны сустракаюцца дзеля самога факта сустрэчы, то ён глыбока памыляецца».

Махмуд Ахмадзінежад у сваю чаргу адзначыў: адносіны Беларусі і Ірана, хоць развіваюцца параўнальна нядоўга, знаходзяцца на этапе нарошчвання. Паводле яго слоў, іранскі бок мае намер зрабіць усё неабходнае для пашырэння супрацоўніцтва паміж краінамі. Сярод перспектыўных напрамкаў узаемадзеяння ён назваў энергетыку, інжынерна-тэхнічную сферу. Махмуд Ахмадзінежад пры гэтым заявіў, што Беларусь і Іран не паддадуцца націску з боку іншых дзяржаў. «Мы не паддадзімся на той націск, які спрабуюць на нас рабіць», — сказаў ён. — Нашы пазіцыі па міжнароднай тэматыцы празрыстыя і зразумелыя: мы супраць аднапалярнага свету, нанясення ўрону народам, прымянення стандартаў адносна іншых краін у эканамічнай сферы. Ніхто не мае права ў манапольным парадку выкарыстоўваць перавагі сваёй краіны супраць іншай дзяржавы».

«За тыя два дні, якія мы правялі ў Беларусі, мы не адчувалі сябе чужымі, а знаходзіліся ў асяроддзі сяброў і братоў, — сказаў прэзідэнт Ірана. — Поспехі Беларусі мы разглядаем як уласныя. Лічым, што аналагічныя адносіны прысутнічаюць і з боку Беларусі да Ірана».

У той жа дзень у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі Экспартны гарантыйны фонд Ірана і страхавая кампанія «Белэксімгарант» падпісалі мемарандум аб узаемаразуменні. Падпісаны таксама мемарандум аб узаемаразуменні паміж Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі і Арганізацыяй дакументацыі і нацыянальнай бібліятэкі Ірана.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

У. Канаплёў сустрэўся з М. Ахмадзінежадам

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір Канаплёў лічыць, што заявы, якія былі зроблены прэзідэнтам Ірана Махмудам Ахмадзінежадам у першы дзень яго візіту ў нашу краіну, ужо атрымалі рэзананс у грамадстве. Нагадаем, што напярэдадні іранскі прэзідэнт заяўляў аб гатоўнасці супрацоўнічаць па ўсіх напрамках, канкрэтныя ж крокі павінны быць зроблены ў такіх сферах, як энергетыка, транспарт, гандаль, інвестыцыі. Такім заявам у Беларусі рады.

Уладзімір Канаплёў таксама адзначыў, што ў гісторыі ўзаемадзеяння парламентаў Беларусі і Ірана існуюць добрыя традыцыі. У прыватнасці, у Нацыянальным сходзе Беларусі і ў Сходзе Ісламскага Савета Ірана сфарміраваны і дзейнічаюць рабочыя групы па супрацоўніцтву паміж парламентамі дзвюх краін.

Сяргей КАРАЛЕВІЧ.

Наймалнік шукае... рабочых

У Беларусі практычна зраўнялася колькасць вакансій, звесткамі аб якіх валодаюць службы занятасці насельніцтва, і колькасць беспрацоўных. У прыватнасці, як паведаміў карэспандэнту «Звязды» начальнік галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Мікалай Коханаў, у пачатку мая ў краіне было зарэгістравана 50,2 тыс. беспрацоўных і адначасова налічвалася 48,9 тыс. свабодных працоўных месцаў.

Апошнім часам у большасці гарадоў назіраецца значны попыт наймалнікаў на вадзіцеляў аўтамабіляў, грузчыкаў, муляраў, страхароў, маляроў, машыністаў бульдозераў і экскаватараў, наладчыкаў абсталявання, абліцоўшчыкаў, цесляроў, слесараў-рамонтнікаў, слесараў-сантэхнікаў і слесараў механазборачных работ, сталяроў, токараў, трактарыстаў, фрэзераўшчыкаў, швачак-матарыстак, тынкоўшчыкаў, электраманцёраў, а таксама на інжынераў-праграмістаў і інжынераў будаўнічага профілю. Праблематычна знайсці сабе месца кухару, гандляру харчовымі і нехарчовымі таварамі, бухгалтару, эканамісту і юрысту. Што да сельскай мясцовасці, то тут найбольш запатрабаванымі з'яўляюцца аграномы, урачы, ветэрынарныя ўрачы, заатэхнікі, тады як найменш «папулярнымі» — тыя ж бухгалтары, эканамісты і настаўнікі.

Сяргей ГРЫБ.

ISSN 1990-763X

Увага!

Праводзіцца падпіска

на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі

на II паўгоддзе 2007 года

Нашы паслугі па падпісцы:

- падпіска на абанементную скрыню
- падпіска на даму
- дастаўка да кватэры з уручэннем «з рук у рукі»
- падпіска ў кіёсках РУП «Белпошта»
- падпіска праз Інтэрнэт
- магчымасць аплаты пры дапамозе пластыкавых картак

www.belpost.by

Для юрыдычных асоб:

- прыём падпіскі па факсу

Падрабязную інфармацыю вы можаце атрымаць у любым аддзяленні паштовай сувязі ці па тэлефонах у г. Мінску:

222-72-17, 293-55-95, 227-20-31

Брэсцкі філіял (8-0162) 200-804
Віцебскі філіял (8-0212) 476-139
Гомельскі філіял (8-0232) 715-342
Гродзенскі філіял (8-0152) 757-159
Мінскі філіял (8-017) 222-75-65
Магілёўскі філіял (8-0222) 310-882

БЕЛПОШТА

Фота Наталлі ТАЛІВІНСКАЙ.

СПАЧАТКУ ЛЮБОЎ

Артыкул чытайце на 2-й стар.

НА ВЫСТАЎЦЫ MILEX-2007 — ЛЕПШЫЯ РАСПРАЦОЎКІ БЕЛАРУСКАГА ВПК

Аб гэтым заявіў дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Беларусі генерал-палкоўнік Віктар Шэйман, выступаючы на адкрыцці выстаўкі ў Мінску.

Паводле яго слоў, сваю прадукцыю на выстаўцы прадставілі больш як 130 прадпрыемстваў Беларусі, Расіі, Украіны і Швецыі. Беларускія распрацоўшчыкі дэманструюць стацыянарныя і мабільныя аўтаматызаваныя сістэмы кіравання, сістэмы вядзення разведкі і радыёэлектроннай барацьбы, лічбавыя валаконна-аптычныя сістэмы перадачы інфармацыі, праекты мадэрнізацыі шэрагу сістэм бранятанкавага, авіяцыйнага ўзбраення. «Большасць прадстаўленых узораў эксплуатуецца ва Узброеных Сілах Беларусі. Шэраг замежных дзяржаў выкарыстоўвае іх для аснашчэння і мадэрнізацыі ўзбраення ўласных армій», — сказаў Віктар Шэйман.

На цырымоніі адкрыцця выстаўкі MILEX-2007 прысутнічалі міністры абароны Беларусі, Казахстана, Судана і Таджыкістана, намеснікі міністраў абароны Англіі, Арменіі, Туркменістана і Украіны, намеснік міністра абароннай прамысловасці Азербайджана, начальнік генеральнага штаба ўзброеных сіл Сірыі, прадстаўнікі абаронных і ваенна-тэхнічных ведамстваў Расіі, Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў, Кітая, Венесуэлы і Амана.

БЕЛТА.

Прамая лінія

СЯМ'Я, ДЗЕЦІ, ДАПАМОГА

Упершыню перавышэнне паказчыкаў смяротнасці над паказчыкамі нараджальнасці было адзначана яшчэ ў 1993 годзе. Прычым зараз менавіта дэмаграфічная праблема прызнаецца адной з найбольш вострых. Між тым, якія стымулы да павелічэння нараджальнасці ёсць у Беларусі зараз, як прызначаюцца і выплачваюцца дапамогі па догляду дзяцей, хто і на якіх умовах можа атрымліваць бясплатнае харчаванне на дзяцей ва ўзросце да 2 гадоў, якія льготы і гарантыі вызначаны сем'ям, нарэшце, вядомае «жыллёвае пытанне» — усё гэта стала тэмай гаворкі падчас «прамой лініі» газеты «Звязда» з намеснікам начальніка галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццянай Васільеўнай ШЭМЕТАВЕЦ. Такім чынам, сёння мы пачынаем друкаваць адказы на найбольш цікавыя з вашых пытанняў.

☎ ***— Ці павінны цяжарную жанчыну перавесці на скарочаны працоўны дзень? І ці можа такая жанчына адмовіцца ад паездкі ў камандзіроўку?***

Алена Міхайлаўна, *г. Мінск*

— Наконт скарочанага працоўнага дня вам неабходна дамаўляцца непасрэдна з наймальнікам. Разам з тым трэба мець наступнае. Паводле Працоўнага кодэкса, цяжарным жанчынам на падставе медыцынскага заключэння павінны зніжацца нормы выпрацоўкі, нормы абслугоўвання або такія жанчыны павінны пераводзіцца на больш лёгкую, без уздзеяння шкодных вытворчых фактараў, работу з захаваннем сярэдняга заробку па ранейшым месцы працы. Прычым да вырашэння пытання аб пераводзе на больш лёгкую, без уздзеяння неспрыяльных вытворчых фактараў, пасаду цяжарная жанчына ўвогуле вызваляецца ад работы з захаваннем свайго сярэдняга заробку за кошт наймальніка за ўсе дні «пропуску».

Што ж да накіравання цяжарнай жанчыны ў службовую камандзіроўку, то тут адказ адназначны — гэта забараняецца Працоўным кодэксам. Як, дарэчы, забараняецца і прыцягненне цяжарных жанчын да работ у начны час, да звышурочных, а таксама да работ па выхадных і святочных днях.

☎ ***— Ці магу я працаваць падчас водпуску па догляду дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў? І ці магчыма падчас такога водпуску выйсці на работу толькі на некалькі месяцаў, а потым — зноў займацца доглядам?***

Алена МАКОЎСКАЯ, *Рэчыцкі раён*

— Водпускам па догляду дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў можна скарыстацца як цалкам, так і падзяліць яго на часткі любой працягласці. Словам, выходзіць на работу і вяртацца ў адпачынак магчыма нават некалькі разоў.

Аднак тут трэба памятаць адну акалічнасць. Каб працягваць атрымліваць дапамогу на дзіця да 3 гадоў у поўным памеры, вы можаце працаваць па сваім асноўным або іншым месцы толькі на ўмовах няпоўнага працоўнага дня або з выкананнем не больш чым паловы месячнай нормы.

☎ ***— Калі першаму дзіцяці было паўтара года, я нарадзіла другое. Ці павінны зараз працягнуць са мной кантракт да таго часу, пакуль малодшаму не споўніцца 5 гадоў?***

Алена ЖЫХАВА, *г. Мінск*

— Сапраўды, Алена, у такім выпадку наймальнік павінен працягнуць кантракт, прынамсі, да моманту, пакуль 5 гадоў не споўніцца малодшаму дзіцяці.

☎ ***— Патлумачце, калі ласка, ці можна ў выпадку хваробы дзіцяці афармляць бальнічны не на маці, а на бацьку?***

Андрэй СВІРКО, *г. Мінск*

— Адкажу коратка — можна.

☎ ***— Апошнім часам шмат кажуць аб спісанні часткі нявыгатных крэдытаў на будаўніцтва жылля маладым сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей. Калі пачнецца гэта спісанне?***

Святлана Іванаўна ВЯРШЫЛА, *г. Мінск,*
Вольга Іванаўна ТАМАШЭВІЧ, *Маладзечанскі раён*
і іншыя чытачы

— Сапраўды, сёння распрацаваны праект указа аб дапамозе маладым сем'ям у пагашэнні камерцыйных крэдытаў. Зрэшты, варта паўтарыцца — гэта толькі праект. І якім будзе канчатковае рашэнне па камерцыйных крэдытах для маладых сем'яў з дзецьмі, казаць пакуль рана.

☎ ***— Ці будзе спісвацца частка нявыгатнага крэдыту на будаўніцтва, калі і сам крэдыт, і кватэра аформлены на бабулю дзіцяці?***

Святлана Фёдараўна РАКІЦКАЯ, *г. Мінск*

— Не, Святлана Фёдараўна, у такой сітуацыі разлічваць на пагашэнне часткі камерцыйнага крэдыту на будаўніцтва жылля ўжо не выпадае.

☎ ***— Наколькі вядома, шматдзетная сям'я можа ўзяць банкаўскі крэдыт на суму, якая адпавядае 95 працэнтам ад кошту рэканструкцыі жылога памяшкання. Паводле ацэнак, кошт рэканструкцыі нашага жылля вызначаны ў 14 мільёнаў рублёў. Аднак крэдыт нам далі толькі на 10 мільёнаў. Чаму?***

Анатоль, *г. Клецк*

— Лепш за ўсё, Анатоль, задаць гэта пытанне ў банку. Бо, як падаецца, тут ёсць варыянты сітуацый. Магчыма, на момант афармлення крэдыту ў банку проста не было дастатковай колькасці крэдытных рэсурсаў. А магчыма, рэканструкцыю жылога памяшкання вам пракрэдытавалі не згодна з агульным коштам работ, а згодна з нарматывам — з разліку 20 квадратных метраў на кожнага члена сям'і. Словам, у дадзеным выпадку трэба разбірацца на месцы.

☎ ***— Маем 6 дзяцей, пяцёра з якіх — непаўналетнія. У свой час мы ўзялі на будаўніцтва жылля адразу два крэдыты — на 40 і на 10 гадоў. Ці павінны былі нам іх скасаваць?***

Наталля Іванаўна НАВАЦКАЯ, *Петрыкаўскі раён*

— Як сям'і, што мае пяцёра непаўналетніх дзяцей, вам павінны былі пагасіць ільготны крэдыт, што выдаваўся на 40 гадоў. У той жа час, наколькі я ведаю, тэрмінам на 10 гадоў выдаюцца камерцыйныя крэдыты. А наконт спісання часткі камерцыйных крэдытаў рашэння зноў-такі пакуль няма.

(Працяг будзе)

Сяргей ГРЫБ.

РОЗГАЛАС

РАЗВІТАННЕ З ПРАПІСКАЙ

Да канца гэтага года ў Мінску можа быць адменены «савецкі анахранізм» — прапіска.

Пра гэта журналістам паведаміў начальнік управаўлення грамадзянства і міграцыі ГУУС Мінгарвыканкама Мікалай Шэўчык. Паводле яго слоў, замест прапіскі будзе ўведзена рэгістрацыя грамадзян па месцы іх жыхарства. Прычым зарэгістравацца будзе значна лягчэй і прасцей, чым прапісацца. Для рэгістрацыі аднаго чалавека спатрэбіцца наяўнасць жылля агульнай плошчай не менш за 15 квадратных метраў (для прапіскі неабходна не менш 12 «жылых квадратаў»). Зарэгістравацца можна будзе не толькі ў кватэрах самых блізкіх сваякоў, але і больш далёкай радні. Словам, стаць на законных падставах сталічным жыхаром будзе лягчэй. Разам з тым узрасце і адміністрацыйная адказнасць за парушэнне рэжыму рэгістрацыі. Мікалай Шэўчык, дарэчы, засцярог грамадзян ад вырашэння праблем з прапіскай праз рэкламныя аб'явы. Бо нярэдка бываюць выпадкі, калі прайдзісветы за пэўную суму грошай ставяць фальшывыя штампы аб прапісцы, а іх кліенты нічога не падазраюць. Падман, як правіла, выяўляецца пры першым жа звароце ў дзяржаўныя ўстановы, і тады ў людзей з падробленым штампам аб прапісцы ўзнікае нямала непрыемнасцяў.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

МІНАБЛВЫКАНКАМ ПАБУДУЕ ДЛЯ ЛЕПШЫХ МЕДРАБОТНІКАЎ 40 КАТЭДЖАЎ НЕДАЛЁКА АД СТАЛІЦЫ

40 катэджаў для медыцынскіх работнікаў будзе ўзведзена па рашэнню сталічнага аблвыканкама ў вёсцы Ляскоўка Бараўлянскага сельсавета. Аб гэтым заявіў журналістам пасля адкрыцця завода па вытворчасці цеплавых труб у пасёлку Гатава Мінскага раёна старшыня Мінаблвыканкама Мікалай Дамашкевіч.

Губернатар адзначыў, што на рэалізацыю гэтага буйнога сацыяльнага праекта з рэзерваў абласнога бюджэту плануецца выдзеліць каля Br5 млрд. Сучасныя добраўпарадкаваныя дамы бясплатна атрымаюць, у першую чаргу, урачы Мінскай абласной клінічнай бальніцы, якія шматгадовай працай заслужылі прызнанне пацыентаў. Каля 20 працэнтаў катэджаў будзе прадастаўлена маладым медыкам, як практыкуючым, так і тым, хто займаецца навуковай работай, паведаміў Мікалай Дамашкевіч.

Таццяна ШАБЛЫКА, БЕЛТА.

МІНСК — ГОРАД НЯВЕСТ

У беларускай сталіцы зараз працуюць на законных падставах 9 шлюбных агенцтваў.

Паводле звестак управаўлення па грамадзянству і міграцыі ГУУС Мінгарвыканкама, летась праз пасрэдніцтва гэтых устаноў у нашу сталіцу прыязджалі амаль 150 замежных жаніхоў. У асноўным гэта былі грамадзяне еўрапейскіх краін: Аўстрыі, Францыі, Іспаніі, Італіі, Германіі, Бельгіі, Нарвегіі. Колькі знаёмстваў завяршыліся рэгістрацыяй шлюбу, міліцыі невядома.

Дарэчы, бываюць выпадкі, калі беларускія нявесты самі едуць за мяжу для знаёмства з патэнцыйнымі жаніхамі. Летась, напрыклад, з такімі мэтамі выязджалі ў іншыя краіны 10 мінчанак.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

ВАДА НЕ ДАРУЕ БЯСПЕЧНАСЦІ...

Спякотнае надвор'е, што ўсталявалася, прыцягвае зараз тысячы людзей да вадаёмаў. Аднак не заўсёды такі адпачынак дае добры зарад бадзёрасці і энергіі: часам людзі, якія не звяртаюць увагі на элементарныя правілы паводзінаў на вадзе, становяцца ахвярамі сваёй бяспечнасці.

Так, як паведаміў карэспандэнту «Звязды» вядучы спецыяліст Рэспубліканскага таварыства ратавання на водах Віктар Харошка, толькі за мінулы тыдзень зарэгістравана 14 выпадкаў утаплення, у тым ліку 5 чалавек сталі ахвярамі вады пры купанні. Прычым апошнія знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення. Астатнія 9 выпадкаў звязаны з падзеннем у ваду пры захворваннях, рыбалцы, катанні на катамаране і іншых абставінах. У прыватнасці, у Магілёве на рацэ Дубровенка патануў 19-гадовы студэнт адной з ВНУ, які катаўся на катамаране.

Трагедыі на вадзе ў асноўным адбываюцца таму, што пацярпелыя купаюцца ў неўладкаваных для гэтага месцах, не прызначаных для гэтага вадаёмах. Больш за 50 працэнтаў здарэнняў звязана са спажываннем алкаголю. Дзеці ж у асноўным гінуць на водах таму, што застаюцца без бацькоўскага нагляду. У гэтай сувязі спецыялісты АСВОД зноў нагадваюць, што не трэба ні ў якім выпадку грэбаваць правіламі бяспечных паводзінаў на водах, у тым ліку пры карыстанні плаўсродкамі. І ні ў якім разе нельга падыходзіць да вады пасля выпітага алкаголю, нават калі вам падаецца, што выпілі вельмі мала.

Ігар ГРЫШЫН.

У ДНЯПРЫ ПАТАНУЛІ ДВА ХЛОПЧЫКІ

Два вучні 9-га класа патанулі ў Магілёве на рацэ Днепр. 22 мая апоўдні кампанія з сямі хлопчыкаў, без дарослых, адправілася купацца на неабсталяваны пляж у раёне вуліцы Чавускай. Адзін пачаў тануць, і другі, які кінуўся на дапамогу, таксама аказаўся зацягнуты пад ваду. Відаць, дзеці трапілі на глыбокае месца альбо ў хуткае цячэнне ракі, разгубіліся, спужаліся...

Трагедыі не здарылася б, калі б хлопчыкі купаліся на санкцыянаваным пляжы, дзе ёсць ратавальнікі. У сувязі са спякотным надвор'ем, калі людзі імкнуцца ахаладзіцца ў вадаёмах, служба ратавання на вадзе нагадвае пра элементарныя правілы бяспекі: не пускаць дзяцей купацца адных і адпачываць толькі на афіцыйных пляжах.

ДЗІЦЯ ВЫПАЛА З БАЛКОНА

У ноч з 21 на 22 мая ў Магілёўскую гарадскую бальніцу хуткай медыцынскай дапамогі трапіў у вельмі цяжкім стане 4-гадовы хлопчык. Аказалася, што ён выкінуўся з балкона на 5-м паверсе дома ў завулку Таварным. Цяпер медыкі змагаюцца за жыццё дзіцяці. А праваахоўным органам яшчэ давядзецца высветліць, што рабіла 4-гадовае дзіця ўначы на балконе і дзе былі ў той момант яго бацькі.

Алена КАЗЛОВА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА ЛАТВІІ АДБУДУЦЦА НА ТЫДЗЕНЬ РАНЕЙ

Выбары прэзідэнта ў Латвіі пройдуць 31 мая — на тыдзень раней, чым было запланавана.

Прычынай такога рашэння стала тое, што існуючыя кандыдатуры на пасаду кіраўніка дзяржавы, які ў Латвіі абіраецца парламентам, не задавальняюць многіх прадстаўнікоў выканаўчай улады, якія ў сваю чаргу заклікаюць «абнуліць» спіс кандыдатаў і распачаць пошукі наноў. Дэпутаты ж не хочуць зацягваць выбранне прэзідэнта.

Цяпер Камісія сейма па мандатах і заявах пачне ацэнку існуючых кандыдатур. Парламентарыі дадуць ацэнку кандыдату ад апазіцыйнай партыі «Новы час» Сандрэ Калніеце, якая мае толькі тэарэтычныя шанцы на перамогу, і фаварытам ад кіруючай кааліцыі — Марысу Рыексціншу (Народная партыя) і Карыне Петэрсоне (Першая партыя). Акрамя таго апошнім часам з'явілася інфармацыя, што партнёры па кааліцыі могуць аддаць пасаду прэзідэнта «чалавеку збоку». На мінулым тыдні было агучана імя аднаго з самых верагодных прэтэндэнтаў. Гэта суддзя Суда Еўрапейскіх супольнасцяў Эгіл Левітс, які хоць і нарадзіўся ў Рызе, але большую частку жыцця пражыў у Германіі.

Тэрмін паўнамоцтваў дзеючага прэзідэнта краіны — Вайры Віке-Фрайбергі — заканчваецца 7 ліпеня.

РАСІЯ НЕ ВЫДАСЦЬ ЛУГАВОГА ВЯЛІКАБРЫТАНІІ

Каралеўская пракурорская служба Вялікабрытаніі ў аўторак прад'явіла абвінавачанні расійскаму бізнэсмену Андрэю Лугавому ў забойстве экс-супрацоўніка ФСБ Аляксандра Літвіненкі шляхам атручвання палоніем-210. Лугавы і Літвіненка сустракаліся ў Лондане ў дзень атручання — 1 лістапада. Пракурорская служба патрабуе ад Расіі выдачы былога супрацоўніка КДБ Андрэя Лугавога. Сам Лугавы шматразова адмаўляў сваё дачыненне да атручвання Літвіненкі.

Рашэнне, аб якім было абвешчана ўчора, паследавала пасля некалькіх месяцаў бурнага «абмену меркаваннямі» паміж Масквой і Лонданам па дыпламатычных каналах. Раней Крэмль папярэджваў, што справа Літвіненкі ставіць пад пагрозу брытанска-расійскія ўзаемаадносіны.

Генеральная пракуратура Расіі выключае магчымасць экстрадыцыі бізнэсмена ў Вялікабрытанію. Паводле крыніцы ў пракуратуры, «па Канстытуцыі РФ расійскія грамадзяне не могуць быць выдадзены замежным краінам для ажыццяўлення над імі правасуддзя, а Лугавы з'яўляецца грамадзянінам Расіі».

ЮШЧАНКА НАЗАВЕ ДАТУ ВЫБАРАЎ У БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ

Падчас выступлення ў Каневе, прэзідэнт Украіны Віктар Юшчанка паабяцаў, што на гэтым тыдні будзе названа дата датэрміновых парламенцкіх выбараў. Прэзідэнт таксама абяцаў, што выбары гэтыя будуць дэмакратычнымі, справядлівымі і зробяць «прышчэпку вельмі многім палітычным дзеячам Украіны на многія дзесяцігоддзі наперад ад здрадніцтва і парушэння ўкраінскай канстытуцыі».

Між тым, прэм'ер-міністр Украіны Віктар Януковіч выказаў апасенне, што датэрміновыя выбары аслабяць дзяржаву. «Мы павінны прыняць цэлы шэраг законаў на выпадак, калі будзе патрэба праводзіць датэрміновыя выбары. Гэта прынцыповая пазіцыя — каб выбары былі сумленнымі», — падкрэсліў прэм'ер.

Адзначым, што дата датэрміновых выбараў, якая называлася раней — 24 чэрвеня, ніводнай з палітычных сіл Украіны ўсур'ёз не ўспрымаецца. Хутчэй за ўсё, выбары адбудуцца восенню, хоць асобныя партыі лічаць гэта непрымальным і хацелі б паскорыць падзеі.

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.05.2007 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 145,00
1 еўра	2 887,92
1 латвійскі лат	4 147,73
1 літоўскі літ	836,39
1 чэшская крона	102,57
1 польскі злоты	765,09
1 расійскі рубель	82,87
1 украінская грыўня	427,29

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	25,8831
10 UAH	51,3482
1000 BYR	12,0359
EUR	34,8619

Курс у гандлёвых кампаніях (на 22.05.2007 г.)

USD 2140 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпісьмецеся на часопіс «Главный бухгалтер. ГБ» на 2007 год у раздачы! па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

Дзеля памяці

СЛОВЫ ВЫЖЫЎШАГА

Сярод звяздоўцаў былі такія, якія не толькі стваралі гонар газеце, а самі сталі прыкладам гонару і чалавечай годнасці. Ёсць імёны, якія трэба памятаць, яны — частка гісторыі не толькі нашай газеты, але і ўсёй краіны, таму што сталі сведкамі яе драматычнага лёсу.

Сто гадоў адзначаецца 23 мая з дня нараджэння Уладзіміра Мяжэвіча. Вясковы хлопец з-пад Оршы стаў журналістам і літаратарам, прыйшоў у «Звязду» ў 1929 годзе і працаваў тут пяць гадоў. Быў таленавітым і перспектыўным маладым чалавекам — у 34-м стаў карэспандэнтам газеты «Известия» ў Беларусі. Але быць навідавоку і ў цэнтры падзей на той час было небяспечна...

Калі б не рэпрэсіі, кар'ера Уладзіміра Мяжэвіча была б больш паспяховай. Васемнаццаць гадоў яго жыцця з'елі лагеры. Хоць прыгаварылі беларускага журналіста ў 1937-м да дзесяці гадоў пазбаўлення волі. «Палітычны» — гэта магло б стаць кляймом на ўвесь астатні яго лёс.

Ён увогуле мог не вярнуцца дадому адтуль, каб не пэўныя падзеі, якія перавярнулі ход савецкай гісторыі. Але нават калі не стала Сталіна, свабода на іх не звалілася з нябёсаў — яе яшчэ прыйшлося адстойваць, чакаючы часу сваёй рэабілітацыі. Гэта здарылася толькі ў 55-м. А ў 56-м Уладзімір Мяжэвіч ужо сталым чалавекам змог вярнуцца да працы журналіста ў часопісе «Вожык», потым была праца ў «Вясёлцы» і «Бярозцы». Выходзілі з-пад пяра нарысы і аповесці, якія потым ядналіся ў кнігі. Словы чалавека, які быў загартаваны жорсткімі выпрабаваннямі і не згубіў сілы духу, вартыя дарагога...

Ларыса ЦІМОШЫК.

Звязда-90: адваротны адлік

Сімвал дзяржаўнасці

Да нашага юбілею застаецца 78 дзён. У гэтыя дні добрыя словы ў адрас газеты выказваюць самыя розныя людзі. Тыя, што звязаныя з ёй адной мовай — хто яе з задавальненнем чытае і хто сам з'яўляецца яе аўтарам. Тыя, пра чые поспехі мы пісалі, з чыімі думкамі пагаджаліся ці спрачаліся. Асобы, якія ўславілі Беларусь і робяць гэта зараз. Людзі, якія ведаюць: іх асабістае «сёння» закладвалася стагоддзямі мінуўшчыны і звязана са шляхам усёй краіны. Так жа, як і лёс нашай газеты.

Аляксей Дудараў, старшыня Саюза тэатральных дзеячаў Беларусі, драматург, аўтар вядомага ў савецкі час спектакля «Радавыя» — даўні сябар газеты. Гістарычныя спектаклі паводле яго п'ес «Князь Вітаўт» і «Чорная панна Нясвіжа» з поспехам прайшлі ў тэатрах Беларусі ў апошнія гады, зрабіўшы аўтара героем многіх нашых публікацый. **Аляксей ДУДАРАЎ выказаў свой погляд на «Звязду»:**

— Газета «Звязда» з самага майго дзяцінства, з тых часоў, калі пачаў пісаць і чытаць па складах, з'явілася для мяне сімвалам беларускасці, дзяржаўнасці і адметнасці нашага народа. — Яна розніцца ад іншых выданняў, яна, так бы мовіць, цяплейшая. Больш шчырая, менш мітуслівая, па-добраму кансерватыўная. А кансерватызм заўсёды быў рысай акадэмізму.

Жадаю, каб «Звязда» пашырала сваю аўдыторыю. Каб была запатрабаваная і чытачамі, і дзяржавай, і нашымі дзеячамі культуры і мастацтва, якім прысвячае шмат артыкулаў. З надыходзячым нараджэннем! І многіх вам гадоў!

Ларыса ЦІМОШЫК.

БІЗНЭС ПА-ЧАВУСКУ

У Чавускім райвыканкаме адабраны 10 прыярытэтных інвестыцыйных праектаў, якія плануецца рэалізаваць ужо сёлета

Адзін з праектаў належыць ТДА «Карбоніс плюс». Назва гаворыць сама за сябе: карбон — гэта вугаль. Таварыства займаецца вытворчасцю драўніннага вугля і паглыбленай пераапрацоўкай драўняных адходаў.

— Ідэя не новая, — тлумачыць кіраўнік «Карбоніс плюс» Глеб Нікулін. — Яшчэ Дзямідаў за сваім часам плавіў сталь на драўнінным вугалі. І ў нас апошнім часам гэта набывае асаблівую актуальнасць, у сувязі з экалагічнымі патрабаваннямі. Я спрабую арыентаваць сваё прадпрыемства на такую пераапрацоўку драўніны, каб ніводная трэска, ніводны рубель не губляліся.

Дрэваапрацоўчае абсталяванне вымае з некандыцыйнай сыравіны, амаль дроваў, дзелавы складнік, а астатняе пераапрацоўваецца на драўнінны вугаль. Любыя абрэзкі і пянькі ідуць у справу.

Кіраўнік прадпрыемства — былы вайсковец. У пачатку 90-х ён звольніўся з Узброеных сілаў і пайшоў у камерцыйныя структуры. Глеб Нікулін працаваў і шукаў новыя ідэі і тэхналогіі. У прыватнасці, вытворчасці драўніннага вугалю.

Увогуле гэта даволі канкурэнтаздольная прадукцыя, у тым ліку і на заходнім рынку. Пакункі з драўнінным вуглем набываюць многія з нас, калі арганізоўваюць пікнікі з прыгатаваннем шашлыкоў. Паводле спецыялістаў, патрэба ў драўнінным вугалі павялічваецца штогод на 10%. Хоць пакуль «Карбоніс плюс» рэалізуе сваю прадукцыю толькі на ўнутраным рынку, попыт на які за апошнія гады павялічыўся кратна.

Прадпрыемства базуецца на тэрыторыі былога асфальтабетоннага завода паблізу чыгуначнай станцыі Благавічы. Завод абанкруціўся і быў ліквідаваны, а «Карбоніс плюс» набыла пляцоўку разам з рэшткамі абсталявання.

— Выбар гэты невыпадковы, — расказвае Глеб Нікулін. — Звычайна такія заводы будаваліся ў аддаленні ад населеных пунктаў, бо гэта даволі брудная вытворчасць. І наша вытворчасць драўніннага вугалю ў адпаведнасці з экалагічнымі нормамі таксама вынесена за гарадскую мяжу. Аднак у перспектыве я паспрабую зрабіць нашу вытворчасць менш брудной. Цяпер на гэты конт вядуцца перамовы з расійскімі прадпрыемствамі аб пастаўцы экалагічна чыстых установак для вытворчасці драўніннага вугалю.

Цяпер на тэрыторыі былога завода зрабілі рэкультывацыю земляў, прыбралі ўсё непатрэбнае жалеззе, аднавілі бытавы будынак. Тут працуе 12 чалавек, а ў бліжэйшай перспектыве плануецца павялічыць колькасць да 28-мі. Толькі нядаўна справа індывідуальнага прадпрымальніка Нікуліна ператварылася ў ТДА, а таму цяпер ідзе працэс атрымання ліцэнзіяў, пабудовы цахоў, набыцця новага абсталявання, навучання работнікаў. Плануецца, што ўсё будзе прыведзена ў парадак і вытворчасць запрацуе належным чынам да сёлетняга жніўня.

* * *

Глеб Нікулін — магіляўчанін, але сваё новае прадпрыемства ён зарэгістраваў у Чавускім раёне з лёгкай рукі мясцовых уладаў, якія і цяпер не пакідаюць па-за ўвагай яго праект. З дапамогай райвыканкама «Карбоніс плюс» атрымаў ад фонда садзейнічання занятасці сродкі на стварэнне новых працоўных месцаў, і графік па ўводу ў эксплуатацыю вытворчасці трымаецца на кантролі. Прыватнік імкнецца не падвесці мясцовыя ўлады, якія аказваюць не толькі тэхнічную падтрымку, але і маральную, што таксама важна.

Апошнім часам прадпрымальнікі рушылі з гарадоў у сельскія раёны, дзе і канкурэнцыя не такая вострая, і арэндная плата ніжэйшая, і з мясцовымі ўладамі часта прасцей знайсці агульную мову. Канечне, ёсць і складанасці: напрыклад, у глыбінцы цяжка знайсці адукаваных і дысцыплінаваных спецыялістаў, і часам даводзіцца вазіць іх на працу з горада. Аднак і гэту праблему з цягам часу можна вырашыць.

Чавускі раён знаходзіцца непадалёк ад абласнога цэнтра. Паўгадзіны на аўтамабілі раздзяляюць Чавусы і Магілёў. Гэта адна з перавагаў для прадпрымальнікаў. Акрамя гэтага, у раёне, асабліва ў сельскіх гаспадарках, хапае памяшканняў і будынкаў, якія не выкарыстоўваюцца. Іх можна свабодна арэндаваць альбо набыць. Другая, не менш важная перавага — мясцовыя ўлады ўмеюць працаваць з бізнэсменамі.

— Мы да прадпрымальнікаў ставімся лаяльна, супрацоўнічаем з імі, — дэкларуе палітыку райвыканкама ў адносінах да прыватнага сектара намесніца старшыні Лариса Шундалава. — Калі ў чалавека ёсць добрая бізнэс-ідэя, мы дапаможам яе ажыццявіць. Зробім усё, што ў нашых сілах.

— Мы не адфутбольваем людзей і не кажам ім, што гэта патрэба толькі ім — маўляў, ідзіце і самі рабіце, — тлумачыць начальнік аддзела эканомікі райвыканкама Ірына Лосева. — Мы падкарэктуем статут, напішам, што трэба згодна заканадаўству. Выправім памылкі і не будзем марна ганяць людзей.

У райцэнтры працуе «Чавускі бізнэс-цэнтр», дзе прыватніку дадуць неабходную для працы інфармацыю і акажуць паслугі. Там можна распрацаваць і бізнэс-план, калі патрэбна. Улада дапамагае атрымаць сродкі на стварэнне новых працоўных месцаў, банкаўскія крэдыты пад мадэрнізацыю вытворчасці, аформіць пазыкі.

* * *

Сёлета ў Чавусах рэалізоўваецца шэраг разнастайных праектаў. Напрыклад, плануе пачаць работу доследна-эксперыментальны завод «Экамаш». Прадпрымальнікі з Магілёва арганізуюць перапрацоўку другаснай сыравіны — аўтамабільных шынаў і будуць вырабляць з гэтага масцікі і лакі. Таксама «Экамаш» будзе пастаўляць абсталяванне — міні-заводы для перапрацоўкі гумава-тэхнічных адыходаў. Інвестыцыі ў новую вытворчасць павінны скласці каля 2-х мільярдаў рублёў. Бізнэс-план прайшоў экспертызу, праект мае добрую перспектыву.

Чавускія ўлады адшукалі для «Экамаша» вытворчыя плошчы: некалькі будынкаў, якія належылі «Белтэлекаму» і ўжо некалькі гадоў не выкарыстоўваліся. Вытворчасць, паводле планаў, павінна запрацаваць у сёлетнім 4-м квартале.

Прыватнае прадпрыемства «ПЭТ Сэрвіс» арганізуе ў Чавусах вытворчасць па вырабу сыравіны для выдуву ПЭТ-бутэлек пад напоі. На мясцовым гародніна-сушыльным заводзе, які цяпер знаходзіцца ў стадыі ліквідацыі, фірма выкупіла два памяшканні. Яны будуць рамантавацца, прыводзіцца ў належны стан. Машыну для ліцця прадпрыемства ўжо набыло. Ёсць папярэднія планы запусціць яе ўжо летам.

Чатыры фермеры з Маладзечанскага і Лепельскага раёнаў стварылі сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Дусен» і прапанавалі чавускім уладам ажыццявіць праект «Саджанец». Яны ўжо заклалі пітомнік на 20 гектарах паблізу вёскі Хацкавічы. Тамтэйшая гаспадарка, дарэчы, калісьці называлася «Магілёўсадам». Можа, фермеры вернуць Хацкавічам былую вядомасць?

* * *

А мясцовая фермерская гаспадарка «Чыстыя пруды» ўзялася за вельмі актуальны цяпер аграэкатурызм. Мікалай Загумённы вырашыў пабудаваць новую вёску пад умоўна-жартаўлівай назвай Лупілаўка — для адпачынку і рыбнай лоўлі. Паблізу ўжо існуючай вёскі Прылессе яму перадалі ў арэнду сажалку, якую фермер спусціў, пачысціў і збіраецца зарыбіць. Ды не проста акунямі ды карасямі, а фарэлямі і іншымі экзатычнымі (ва ўсякім разе, для Чавускага раёна) рыбамі. Каля сажалкі плануецца зрубіць драўляныя домікі для рыбакоў і турыстаў. Праект Загумённага ўжо атрымаў вядомасць у Магілёўскай вобласці: засталося толькі пачакаць яго паспяховага ажыццяўлення.

Два індывідуальныя прадпрымальнікі, Марат Румкін і Эдуард Гурскі, адкрываюць на скрыжаванні ў цэнтры Чавусаў дзве гандлёвыя кропкі: Румкін будзе гандляваць прамысловымі таварамі, а насупраць размесціцца крама-кафэ Гурскага. Улады выдзелілі прадпрымальнікам добрае месца, якое пры належнай арганізацыі гандлю і прадпрымальніцкай удачы дасць прыбытак і ўладальнікам, і мясцоваму бюджэту.

Яшчэ адна крама індывідуальнага прадпрымальніка Канстанціна Бартніцкага адкрыецца ў пасёлку прыватнага сектара, дзе няма пунктаў продажу харчовых тавараў. Будынак пабудаваны, адкрыццё крамы запланавана на сярэдзіну лета.

Ёсць прадпрымальнікі, якія не маюць патрэбы ў дапамозе мясцовых уладаў. Напрыклад, Ігар Мельнікаў выкупіў у СВК «Светлы шлях» былы цялятнік, які пуставаў. Там, разам са сталым бізнэсам — рамонтам каробак перадач для сельскагаспадарчай тэхнікі, прыватнік апрабуе новы напрамак — вытворчасць паліўных брыкетаў з адыходаў дрэваапрацоўкі. Калі добра пойдзе, справа пашырыцца.

З іншага боку, калі ўлада не дапаможа індывідуальнай прадпрымальніцы Жанне Алейнік, то невядома, калі ажыццявіцца яе праект, патрэбны і жыхарам райцэнтра, і аўтамабілістам, якія ездзяць па трасе «Чавусы-Магілёў». На выездзе з горада прадпрымальніца мяркуе пабудаваць станцыю тэхнічнага абслугоўвання, а потым і кафэ. Гэта той самы прыдарожны сэрвіс, які развіваецца на дарогах Магілёўскай вобласці зусім не так хутка, як хацелася б яго патэнцыйным спажыўцам.

Бізнэс-план на гэты праект ёсць, аднак не хапае сродкаў на яго ажыццяўленне. Муж жанчыны працуе на Поўначы, і ўсе зароблены сродкі ўкладае ў справу ў Беларусі, аднак іх недастаткова. Таму райвыканкам плануе аказаць дапамогу прадпрымальніцы і будзе хадайнічаць аб выдзяленні ёй бюджэтнай пазыкі. Калі планы спраўдзяцца — будзе ў Чавусах і свой прыдарожны сэрвіс.

* * *

Ажыццяўленне дзесятка інвестыцыйных праектаў дасць сельскаму раёну сотню працоўных месцаў. За першыя месяцы іх ужо створана прыкладна столькі ж: зарэгістраваны 17 індывідуальных прадпрымальнікаў, яны прынялі на працу 25 работнікаў, новыя месцы адчынілі дзяржаўныя і прыватныя прадпрыемствы.

Такім чынам, за сёлетні год, калі намечанае будзе выканана, у Чавускім раёне з"явіцца больш за дзве сотні працоўных месцаў. І гэта адчувальна для раёна, дзе працуе крыху болей за 7 тысяч чалавек.

У Чавускім раёне нават плануецца правесці абласны семінар, каб прадэманстраваць: якім чынам можна пачаць з нуля і ажыццявіць за год шэраг інвестыцыйных праектаў.

— У нас няма іншага выйсця, — тлумачыць Лариса Шундалава. — Чавускі раён — датацыйны, нам патрэбныя грошы. А паводле цяперашніх законаў, нанова створаныя прадпрыемствы, дзе працуе меней за сотню чалавек, будуць плаціць падаткі ў мясцовы бюджэт. Трэба зарабляць самім і менш залежыць ад іншых. Таму мы і напружваемся, каб мець свае сродкі.

Ілона ІВАНОВА.
Чавускі раён.

Ва ўрадзе

Беларусь нарошчвае энергетычныя запасы...

Нягледзячы на тое, што на дварэ — вясна, у краіне пачата падрыхтоўка народнай гаспадаркі да восені і зімы: ад таго, які ўдасца забяспечыць тут «запас трываласці», будзе залежаць, у тым ліку, і тое, з якім градусам у кватэрах сустрэнуць і праводзяць зіму беларусы. Як зараз у Беларусі ідзе падрыхтоўка да ўстойлівай працы ў асенне-зімовы перыяд, да бесперабойнага забеспячэння насельніцтва паліўна-энергетычнымі рэсурсамі, — гэтыя пытанні ўчора разглядаліся на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў, якое прайшло пад старшынствам першага намесніка прэм'ер-міністра Беларусі Уладзіміра Сямашкі.

Пра шэраг арганізацыйна-тэхнічных мерапрыемстваў, якія неабходна выканаць у міжацяпляльны сезон, каб стварыць дастатковыя рэзервы паліва і прывесці ў належны парадак усю інфраструктуру энергазабеспячэння, распавёў намеснік міністра эканомікі Уладзімір Найдуноў. У прыватнасці, арганізацыямі «Белэнерга» плануецца замяніць і пабудаваць не менш за 193 кіламетры цеплавых сетак. А арганізацыям жыллёва-камунальнай гаспадаркі даводзіцца заданне замяніць каля 631 кіламетра сетак, што на 93 кіламетры (на 17,3 працэнта) больш, чым летась. Практычна вызначаны заданні па павелічэнню выкарыстання мясцовых відаў паліва і другасных энергарэсурсаў з улікам адставання па выкананню гэтага задання ў мінулым годзе. Немалаважны і той факт, што ўжо на 1 мая ў цэлым па краіне мелася на 106 тысяч тон паліўнага мазуту больш, чым на леташні май. Паводле слоў Уладзіміра Найдунова, у сістэме Мінэнерга на сёння назапашана мазуту на 7 працэнтаў больш, чым запланавана на пачатак кастрычніка гэтага года. А на прадпрыемствах жыллёва-камунальнай гаспадаркі цяперашнія запасы паліўнага мазуту прыкладна адпавядаюць таму заданню, якое павінна быць выканана таксама да кастрычніка.

Што ж датычыцца газавых запасаў, то «Белтрансгаз» павінен забяспечыць максімальныя аб'ёмы гэтага паліва ў Асіповіцкім і Прыбужскім падземных газавых сховішчах да 1 лістапада. Між іншым, як зазначыў на пасяджэнні міністр энергетыкі Аляксандр Азярэц, у наступным годзе плануецца павялічыць у рэспубліцы магутнасці па захоўванню газу ў падземных газасховішчах на 270 мільёнаў кубічных метраў. «Першую чаргу Мазырскага падземнага сховішча газу плануецца здаць у эксплуатацыю ў 2008 годзе, што дазволіць Беларусі павялічыць магутнасці па захоўванню газу на 270—290 мільёнаў кубаметраў», — сказаў Аляксандр Азярэц. Да таго ж плануецца развіваць і магутнасці Прыбужскага падземнага газасховішча, весці будаўніцтва новых. Сёлета, як мяркуецца, будзе завершана будаўніцтва другой нітки газаправода да Віцебска. Як разлічваюць у міністэрстве, у эксплуатацыю гэты газаправод будзе ўведзены да пачатку ацяпляльнага сезона. Паводле слоў міністра, у краіне ўжо вядзецца запампоўванне прыроднага газу ў сховішчы: сёння мы ўжо маем 25 працэнтаў запасаў гэтага паліва да плануемага ў гэтым годзе аб'ёму.

Адна з праблем, якую агучылі і намеснік міністра эканомікі, і міністр энергетыкі і якая вылівалася ў той жа дэфіцыт фінансавых сродкаў пры правядзенні рамонтных работ, — запазычанасць суб'ектаў гаспадарання па аплаце прыроднага газу, цеплавой і электрычнай энергіі. Так, запазычанасць па газу складае 2,8 мільярда рублёў, па цеплавой і электрычнай энергіі — 5,4 мільярда. Запазычанасць рэгіёнаў па пастаўленых насельніцтву торфабрыкетах на 1 мая склала 3,9 мільярда рублёў, што ў два разы перавышае аб'ём запазычанасці на 1 мая мінулага года. Гэта запазычанасць павінна быць пагашана рэгіёнамі да пачатку лета.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Пасланнікі міру

Самы просты спосаб руху — бег і самы яркі сімвал — факел аб'ядноўваюць звыш мільёна людзей свету, каб зрабіць яго святлейшым і дабрэйшым

Учора ў Мінск прыбыла інтэрнацыянальная каманда міжнароднай легкаатлетычнай факельнай эстафеты «Бег сяброўства». Яе самая юная ўдзельніца — 16-гадовая Дар'я Собалева са Смаленска, а самы вопытны і сталы — 66-гадовы Клаўс Шульц з Берліна. Па тэрыторыі Беларусі бегуны будуць несці факел каля 750 кіламетраў, а потым (25 мая) адправяцца ва Украіну.

— Асаблівасцю сёлетняй эстафеты, — заўважае масквіч Уладзімір Зубкоў, — стала тое, што раней па тэрыторыі Еўропы бегла адна каманда, а зараз іх дзве — заходняя і ўсходняя. Абедзве злучацца на мяжы са Славакіяй.

Дарэчы, для кожнага з бегуноў эстафета мае асаблівае значэнне. Напрыклад, немец Клаўс Шульц такім чынам стаў пасланнікам міру. «Мой бацька быў пасланнікам вайны, бо ўдзельнічаў у Другой сусветнай вайне і дайшоў да Масквы, а я, яго старэйшы сын, дзякуючы эстафеце, мэта якой — аб'ядноўваць народы, стаў пасланнікам дабрыні і сяброўства», — кажа ён. Уладзімір Зубкоў адчувае сувязь з усімі краінамі Еўропы, бо нечым звязаны з кожнай з іх. «Мая дачка вучыцца ў Кіеве, брат служыў у Беларусі, а дзядзька зараз жыве ў Лідзе, — тлумачыць ён. — Мы вельмі хацелі, каб у наступныя гады эстафета фінішавала ў Санкт-Пецярбургу, але ў вашай краіне нас настолькі цёпла прымалі, што будзем выказвацца і за фініш у Беларусі». Канцавым прыпынкам «Бегу сяброўства-2007» стане галандскі Амстэрдам (9 кастрычніка).

Да бегуноў далучаліся нават дзяўчаты на абцасах. Для цікаўных заўважу, што ўдзельнікі эстафеты бягуць у сярэднім па 20 кіламетраў у дзень. Яны нясуць факелы двух відаў — адзін важыць 500 грамаў, другі — 200.

Ірына ПРЫМАК.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Шайбу, шайбу!

НЕ ХОЧА БЫЦЬ ЧУЖАКОМ У РОДНАЙ КРАІНЕ

Варатар «Магніткі» Андрэй Мезін пасля чэмпіянату свету-2007 вырашыў нарэшце пазбавіцца ад статусу чужаземца ў Расіі. Зняць з сябе статус легіянераў вырашылі таксама маскоўскі дынамавец Віталь Ерамееў і спартакавец Канстанцін Сімчук, адпаведна — варатары зборных Казахстана і Украіны. Іх агенты падалі ў суд на Федэрацыю хакея Расіі.

Андрэй Мезін — ураджэнец Чалябінска, таму варатар лічыць няправільным той факт, што ён з'яўляецца чужаком у роднай краіне:

— Я падаў заяву ў ІІХФ (Міжнародная федэрацыя хакея), у якой сцвярджаю, што закончыў гуляць за Беларусь і хачу выступаць за зборную Расіі, — растлумачвае сваю пазіцыю Мезін. — Па правілах ІІХФ я маю права адзін раз у кар'еры змяніць спартыўнае грамадзянства. Перад Алімпіядай-2006 у Турыне тыповую працэдуру прайшоў Яўген Набокаў. Ён выступаў за зборную Казахстана, але пасля падачы заявы ІІХФ дазволіла яму выступаць за расійскую каманду. І я не разумею, чаму я, чалавек, які нарадзіўся ў Расіі, лічуся ў роднай краіне легіянерам?

Адвакаты Мезіна прытрымліваюцца думкі, што, пазбаўляючы Андрэя працы, Федэрацыя хакея Расіі перавышае свае паўнамоцтвы і парушае расійскае заканадаўства.

Ірына ПРЫМАК.

Крыминал

«МАСКІ» ЎЗЯЛІ КАСУ КАМБІНАТА

Днём па дапамогу ў міліцыю ў Віцебску звярнулася касір камбіната школьнага харчавання: каля а паловы першай у незачыненае памяшканне касы ўварваліся двое злачынцаў у масках і завалодалі грашыма.

Невядомыя, пагражаючы жанчыне прадметам, падобным на пісталет, забралі крыху больш за 22 мільёны рублёў, што знаходзіліся ў скрыні стала, пасля чаго зніклі з месца здарэння. Праваахоўнікамі аператыўна быў уведзены ў дзеянне план «Сірэна» і па падазрэнню ва ўчыненні гэтага злачынства ўжо затрыманы 18-гадовы мясцовы непрацуючы жыхар, раней судзімы за крадзеж, а таксама 16-гадовы вацябчанін.

Ігар ГРЫШЫН.

ЗЛОДЗЕЙ ТРАПІЎ У ДТЗ...

На пачатку дванаццатай ночы, паводле даных аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, на салігарчаніна і яго зямлячку з нажом у руках напаў паблізу Салігорска невядомы: злачынцу спатрэбілася аўтамашына «Рэно-Шафран» пацярпелага.

Прымусіўшы гаспадара машыны і 24-гадовую жанчыну сесці ў машыну на задняе сядзенне, крымінальнік паехаў у бок вёскі Карысць. Толькі даехаць да месца не змог — не справіўся з кіраваннем. «Рэно» з'ехала ў кювет і перакулілася. На шчасце, ніхто ў выніку здарэння не пацярпеў, а злачынца з месца ДТЗ збег. Праваахоўнікамі ўжо ўстаноўлена асоба, якая падазраецца ў злачынстве: расшукваецца 22-гадовы мясцовы жыхар, раней судзімы за хуліганства.

Ігар ГРЫШЫН.

УЛАДЫКА ФІЛАРЭТ: «ЗРОБІМ НАША ГРАМАДСТВА БОЛЬШ МАРАЛЬНЫМ»

Аб гэтым заявіў на ўрачыстай цырымоніі асвячэння Свята-Нікольскага кафедральнага сабора ў Бабруйску (Магілёўская вобласць) Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі. Ён павіншаваў усіх прысутных са святам Мікалая Цудатворца (у чый гонар названы гэты храм) і адзначыў пры гэтым, што не без дапамогі святога і яго хадайніцтва перад Богам адноўлена гэта праваслаўная святыня, якая ў савецкі час была разбурана амаль дашчэнту.

«Я рады, што горад Бабруйск такі малады, энергічны, прагрэсіўны і заўсёды імкнецца быць лідарам, у тым ліку ў справе духоўнага адраджэння. Няхай гэта імкненне застанецца ў бабруйчан і ў далейшым, паколькі яшчэ трэба будзе прыкласці нямала намаганняў і зрабіць шмат добрых спраў, каб поўнасцю завяршыць рэканструкцыю і рэстаўрацыю сабора», — сказаў Уладыка Філарэт.

За вялікі ўклад у аднаўленне храма кіраўнік Беларускай праваслаўнай царквы ўручыў ордэны, медалі і заахвочвальныя граматы шэрагу асобаў. Сярод іх — старшыня канцэрна «Белнафтахім» Аляксандр Бароўскі, дырэктар ААТ «Белшына» Дзмітрый Кацярыніч, старшыня Бабруйскага гарсавета Міхаіл Бандарэнка і іншыя.

БЕЛТА.

З 2004 года ў Мінску 1731 шматдзетная сям'я стала жыць прасторней. Новыя кватэры сёння будуюцца яшчэ для 1119 такіх сем'яў. І толькі 600 стаяць у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў... Гэтыя лічбы амаль штодня мяняюцца, шматдзетных сем'яў становіцца больш. Кватэрнае пытанне іх стала вырашацца хутчэй пасля дапаўнення да Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 185 «Аб прадастаўленні грамадзянам ільготных крэдытаў на будаўніцтва (рэканструкцыю) ці набыццё жылых памяшканняў». Але што стаіць за ўсімі гэтымі лічбамі: якія канкрэтныя сітуацыі і лёсы? У пошуках адказаў на гэтыя пытанні карэспандэнт «Звязды» пазнаёміўся з незвычайнай сям'ёй. Нехта вырашыць, што яны — самыя легкадумныя людзі на свеце, а нехта, паглядзеўшы на іх, зменіць сваё жыццё...

СПАЧАТКУ ЛЮБОЎ

Сям'я Ізотавых з 2000 года стаяла ў чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў у Маскоўскім і Ленінскім райвыканкамах сталіцы. На той час у іх было дзве дачкі: Лізавета і Варвара. Праз два гады на свет з'явіўся Захар, а яшчэ праз два — Іван.

Усе гэтыя гады сям'я жыла ў адным пакойчыку: спачатку ў родных жонкі Ганны, потым — у маці мужа Вячаслава...

— Калі мы пераязджалі да маёй маці, — расказвае Вячаслаў, — я сказаў Ганне: «Ну вось, пяць гадоў пражылі з тваімі, цяпер пяць з маімі, а там з — Божай дапамогай...». Так і адбылося...

У невялічкім пакоі стаяць дзве раскладныя канапы, на адной з іх спяць бацькі, на другой — 9-гадовая Лізавета і 7-гадовая Варвара, а паміж канапамі ўціснуты двух'ярусны ложак для 5-гадовага Захара і 3-гадовага Івана. Ужо сем месяцаў ля канапы бацькоў стаіць каляска для немаўляткі Міколы. Калідор і бабульчын пакой да столі застаўленыя каробкамі з рэчамі — сям'я зноў пераязджае!

— Дзесяць гадоў пражыць у адным маленькім пакоі з дзецьмі... — не стрымала я ўзрушэння.

— Так, гэта было няпроста! — смяецца Вячаслаў. — Але мы верылі, што ўсё будзе добра, што ўсе праблемы, з Божай дапамогай, вырашацца.

— Шматдзетным сем'ям і сапраўды няпроста, але і не цяжка... — умешваецца ў размову Ганна. — Мне муж сказаў, што вы прыйдзеце пісаць аб нашых праблемах — і вось мы шукалі іх, шукалі, ды так і не знайшлі нічога сур'ёзнага. Да нас з усіх бакоў ідзе дапамога. Напрыклад, мы маем льготы па аплаце камунальных паслуг. Нашу сям'ю вызвалілі ад аплаты за заняткі ў музычнай школе і іншых гуртках. Атрымліваем дапамогу на дзетак да трох гадоў і пасля трох гадоў. У Тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання нам дапамагаюць з вопраткай і цацкамі. А цяпер вось і кватэра...

Іх кухня — гэта месца, дзе бацькі з дзецьмі збіраюцца за сталом. На чарзе. Перад тым, як пачаць трапезу, сям'я заўсёды чытае малітву. І цяпер вось, перад тым, як мы сталі піць чай з вафлямі, Ганна і Вячаслаў памаліліся.

— Калі мы пачалі будавацца, — узгадвае гаспадар, — нам, як шматдзетнай сям'і, не патрэбен быў першы ўзнос. Тады ў нас было чацвёра дзетак... Гэта значыць, што крэдыт банк адкрываў на 40 гадоў, а дзяржава пагашала палову яго. Наша чарга падышла вельмі хутка, праз паўгода, але мы адмаўляліся. Спачатку прапанавалі трохпакаёвую кватэру, а нам хацелася чатырохпакаёвую. Праз два гады нам пашанцавала. І ў 2006 годзе мы пачалі будавацца. Пакуль наша чатырохпакаёвая кватэра будавалася, у нас нарадзіўся Мікола... Цяпер нам увогуле не трэба нічога плаціць, нават рубля не паспелі аддаць. А яшчэ — з чаргі на паляпшэнне жыллёвых умоў нас так і не знялі, маўляў, зноў метраў не хапае. Але дзе ж там не хапае — такая прастора!

— Ключы мы атрымалі 28 красавіка! — радасна заўважае Ганна. — Гэта было вялікае свята ў нашай сям'і — 11 гадоў сумеснага жыцця. Бачыце, які гэта падарунак!

Так усё проста. Падарунак... Яшчэ нядаўна я абмяркоўвала са сваёй знаёмай, як гэта НЯПРОСТА падняць на ногі сваіх дзяцей. Аднаго. Адзець, абуць, даць адукацыю і ўсё астатняе — каб не горш, чым у іншых... Маўляў, толькі калі гэта ўсё споўніцца, можна лічыць бацькоўскі абавязак выкананым. Але ў Вячаслава і Ганны разуменне бацькоўскага абавязку іншае. Кватэра, канешне, для іх вялікая радасць. Але галоўным яны лічаць выхаванне годных людзей, якія будуць любіць Бога, сваю краіну, іншых людзей і дапамагаць тым, хто мае ў гэтым патрэбу. І яны не баяцца цяжкасцяў у гэтай справе. Для малодшых дзетак яны абралі садок з праваслаўнай групай. Гэта звычайны дзіцячы садок, у якім стварылі такую групу з дазволу Міністэрства адукацыі і па бласлаўленню Мітрапаліта Філарэта. Асаблівасць яе, напэўна, у атмасферы: дзеткі там моляцца перад і пасля ежы і заняткаў, ладзяць ранішнікі на царкоўныя святы, але галоўнае — яны ў тым жа асяроддзі, што і дома. Старэйшая Лізавета вучыцца таксама ў праваслаўным класе. Праўда, дзеля гэтага ёй даводзіцца ездзіць у іншы край горада. Але гэта не стала для Ізотавых перашкодай. Яны аб'ядналіся яшчэ з дзвюма сем'ямі з Лізавецінага класа, і ўсіх дзетак адвозіць у школу адзін з татаў, які мае машыну.

Якраз падчас нашай размовы пра Лізу, дзяўчынка стала спяваць. Ад нечаканасці я не адразу зразумела, што адбываецца.

— Ліза Міколу спаць кладзе, таму і пяе калыханку, — растлумачыла маці.

І тут я злавіла сябе на думцы, якая вельмі ўразіла: у маленькай кватэры пяцёра малых дзетак — ад 9 гадоў да 7 месяцаў, а я дагэтуль нават не чула іх. Без усялякіх напамінаў вяны ведалі, што дарослым не трэба перашкаджаць гаварыць. За гэтым, што важна, адчувалася не дысцыпліна нават, а клопат — бацькоў аб дзецях і дзяцей аб бацьках.

Няўжо гэтыя людзі ні разу не сварыліся за ўсе гэтыя гады, пакуль жылі ў такой цеснаце, падумала я, агледзеўшыся вакол, няўжо ў іх ніколі не ўзнікала адчування бездапаможнасці?

— Мы жывём дружна, — здзівілася майму пытанню Ганна. — Канешне, бываюць дробныя сваркі, але... Прабачце, сварацца і ў сем'ях з адным дзіцем. Нельга сказаць, што ўсё лёгка. Сям'я, любая, — гэта заўсёды складана. Але не трэба баяцца. Дзеткі — дар Божы. Людзі нездарма кажуць: Бог дае дзіця, дае і на яго. Сапраўды так атрымліваецца.

— Адчування бездапаможнасці не было, — удакладняе Вячаслаў. — Яно і не магло ўзнікнуць, бо мы ведаем, што ўсё, што з намі адбываецца, павінна быць. Разумееце, гэта не проста так. Гасподзь паабяцаў, што нават валасінка з нашай галавы не ўпадзе без Яго на тое волі. І таму мы верылі, што з Божай дапамогай усё вырашыцца, толькі не ведалі як.

І праўда, у сям'і было ўжо чацвёра дзетак, калі Вячаслаў пачуў, што шматдзетныя сем'і могуць даволі хутка атрымаць ільготны крэдыт на будаўніцтва жылля. Галава сям'і адразу не паверыў. Яны і зараз ставяцца да гэтага як да цуду. Але навасселле — не толькі радасць, гэта і вялікі клопат. Патрэбна, напрыклад, мэбля. І я, са сваім, каюся, рацыянальным розумам не магу сабе ўявіць, як з даходамі, якія мае гэта сям'я: 470 тысяч беларускіх рублёў заробку таты — выконваючага абавязкі дырэктара Духоўнага вучылішча ды 370 тысяч дзяржаўнай дапамогі на дзяцей — можна абсталяваць чатырохпакаёвую кватэру.

— Гм... — задумаўся Вячаслаў. — Дык я папрашу пазыку ў кіраўніцт

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

23 мая 2007 г. № 20 (74)

ПАРАДАК У ДОМЕ

НЯШЧАСНЫЯ ВЫПАДКІ ПА... АРГАНІЗАЦЫЙНЫХ ПРЫЧЫНАХ

Паводле інфармацыі дзяржаўнага інспектара працы Гродзенскай вобласці Мікалая Ленкі, апошнім часам да праблем, звязаных з умовамі і аховай працы, ушчыльную падышлі не толькі раённыя органы ўлады, але і сельскія, пасялковыя Саветы. У вобласці праводзіцца шмат сесій і пасяджэнняў па шырокаму спектру гэтых пытанняў, якія датычацца і пажарнай, і дарожнай бяспекі, умоў і гігіены працы, вытворчага траўматызму... Аднак ці заўсёды не толькі канстатуюцца недахопы, але і ствараецца сістэма, якая б забяспечвала парадак на рабочых месцах, каб людзі жывымі і здаровымі вярталіся дахаты?

Гэта пытанне абмеркавалі ў Ваўкавыску ўдзельнікі каардынацыйнага савета органаў дзяржаўнага нагляду і кантролю і грамадскага кантролю за выкананнем заканадаўства аб працы і ахове працы пры Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны. З удзелам кіраўнікоў мясцовых органаў улады і шэрагу прадпрыемстваў, прафсаюзаў, прадстаўнікоў міністэрстваў і ведамстваў былі разгледжаны меры па прадухіленню вытворчага траўматызму ў Ваўкавыскім і Навагрудскім раёнах.

Дзе рвецца «ланцужок»?

У выніку няшчасных выпадкаў на вытворчасці на прадпрыемствах і ў арганізацыях Ваўкавыскага раёна летась пацярпелі 29 работнікаў, у тым ліку 6 чалавек загінулі і 3 — атрымалі цяжкія траўмы. Затраты ў сувязі з гэтымі здарэннямі і прафесійнымі захворваннямі склалі па раёну 175,8 мільёна рублёў. Зрэшты, якімі грашыма вымяраецца гора ў сем'ях?

Асабліва жудасным па траўматызму з цяжкімі наступствамі мінулы год стаў для Ваўкавыскай дыстанцыі пуці Баранавіцкага аддзялення Беларускай чыгункі. У пачатку студзеня пацярпелы самавольна ўстанавіў партальны кран на рэйкі з мэтай перавозкі свідравальнага станка да месца работы, але яму не ўдалося размінуцца з манеўровым цеплавозам — у выніку наезд, смерць. Праз два месяцы, у сакавіку, з-за парушэння патрабаванняў бяспекі пры выкананні манеўровых работ на чыгуначных пуцях загінулі два манцёры. Гэтай трагедыі папярэднічаў яшчэ адзін няшчасны выпадак з цяжкім зыходам, які, дарэчы, быў афармлены як невытворчы — пацярпелы самавольна пакінуў рабочае месца, ужываў спіртное.

Трактарыст СВК «Невяровічы» выехаў на лінію з няспраўнасцямі тармазной сістэмы, рулявога кіравання, хадавой часткі і ў выніку дарожна-транспартнага здарэння загінуў чалавек. Жыццё электраманцёра СВК «Агра-Лозы» спынілася з-за невыканання адказным за электрагаспадарку тэхнічных мерапрыемстваў па бяспецы работ.

Такім чынам, толькі адзін з шасці смяротных выпадкаў (калі ў выніку апоўзню ў мелавым кар'еры загінуў вадзіцель «Краснасельскаўтатранса») адбыўся не па арганізацыйных прычынах. Усе астатнія трагедыі так ці інакш былі справакаваныя чалавечым фактарам.

У Навагрудскім раёне ў 22 выпадках траўмавання на вытворчасці 6 чалавек загінулі і 7 атрымалі цяжкія траўмы. З-за парушэння тэхналогіі апрацоўкі дэталі загінуў шліфоўшчык завода газавай апаратуры. Эксплуатацыя тэхнічна няспраўнага абсталявання стала прычынай гібелі вадзіцеля ДЭУ-56 і бетоншчыка ААТ «Навагрудскае БМУ». Работнік МПМК-156 атрымаў цяжкую траўму, выкарыстоўваючы самаробныя будаўнічыя рыштаванні. Прафесійнай падрыхтоўкі як муляр ён не праходзіў і стажу работы па гэтай спецыяльнасці не меў...

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

БЯГУЦЬ ГАРАДЖАНЕ, БЯГУЦЬ ВЯСКОЎЦЫ...

Куды і з якой мэтай? Па вуліцах гарадскога пасёлка Акцябрскі. Па здароўе і ў масавым парадку, як нам патлумачылі ў мясцовым райвыканкаме, які прыняў рашэнне штогод адзначаць свой «рэгіянальны дзень» — дзень аздараўленчага бегу. Сёлета ён быў арганізаваны ўпершыню. На старт выйшлі прадстаўнікі 46 прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Канспект на ўсё жыццё

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Кажуць, слава — і добрая, і дрэнная — заўсёды бяжыць папярадзе чалавека. Пра Барыса Блахіна, дырэктара Слуцкага прафесійна-тэхнічнага каледжа перапрацоўчай прамысловасці, а таксама дэпутата Мінскага абласнога Саветаў дэпутатаў, даводзілася чуць неаднаразова. «Вось пра каго трэба пісаць», — гаварылі людзі, якія хоць аднойчы ў жыцці «перасякаліся» з Блахіным.

Так склалася, што шаснаццаць гадоў таму Барыс Блахін замяніў на пасадзе дырэктара прафесійна-тэхнічнага вучылішча (цяперашняга каледжа) свайго бацьку, Браніслава Рыгоравіча. Блахін-малодшы перайшоў з пасады намесніка па вучэбна-выхаваўчай рабоце прафесійнага вучылішча № 132, якое знаходзілася па суседству. «Ламаць» карэнным чынам тое, што было «ўзрошчана» бацькавымі рукамі, канешне ж, не стаў. Калектыў захаваў. «Прыціранне» прайшло спакойна — людзі адчулі, што прыйшоў чалавек не на адзін дзень і не для таго, каб проста «пасядзець».

Гаспадар — ён жа здалёк бачны, што на сваім падворку, што на вялікім прадпрыемстве, што ў навучальнай установе. Тым больш, што сёння да паняцця «сапраўдны кіраўнік» не зусім дапасоўваюцца азначэнні накшталт «добры—дрэнны», «мяккі—жорсткі» і да т.п. У першую чаргу і нізы, і вярхі глядзяць, ці можаш ты працаваць на перспектыву, ці здольны рызыкаваць, прымаць рашэнні, браць на сябе адказнасць, прадбачыць вынік і, у рэшце рэшт, забяспечваць устойлівае развіццё.

Каледж, якім кіруе Барыс Блахін, — адзіная ў рэспубліцы навучальная ўстанова, якая рыхтуе рабочых і спецыялістаў для малочнай і цукровай вытворчасці. І вельмі цесна супрацоўнічае з базавымі прадпрыемствамі.

— Вось толькі нядаўна аб'язджаў нашых «базавікоў» — быў у Брэсце, Баранавічах, Кобрыне, Гродне, Шчучыне, Высокім, — расказвае Барыс Браніслававіч. — Там нашы навучэнцы зараз праходзяць практыку. Паглядзеў, як яны ўладкаваліся, як іх прынялі. З кіраўнікамі беларускіх прадпрыемстваў мы даўно працуем на дагаворнай аснове, ведаем іх патрэбы ў кадрах на кожны наступны год. Таму і з размеркаваннем практычна ніякіх праблем не ўзнікае — нашых выпускнікоў усюды бяруць з ахвотай. На сёння мы ўжо нават не «закрываем» патрэбы малочнай перапрацоўчай прамысловасці па асобных спецыяльнасцях.

Для адміністрацыі каледжа размеркаванне — гэта не столькі дадатковы клопат, колькі падстава для радасці: дзеці (так тут называюць навучэнцаў) атрымліваюць не толькі гарантаванае працоўнае месца, але і нармальныя грошы, і жыллё.

— Вось у нас на сцяне вісіць плакат: «Інтэрнат — твой дом». Я і хачу, каб сюды — на працу ці на вучобу — кожны ішоў як да сябе дадому і адчуваў сябе тут утульна. Каб у выкладчыкаў была прыстойная зарплата, а дзеці атрымлівалі трывалыя веды.

Планаў у Блахіна «громадье». Але рэалізоўвае ён іх не імгненна, а паступова і планамерна: рамонт кабінетаў, пераабсталяванне лабараторый, будаўніцтва пляцоўкі для міні-футбола, адкрыццё маладзёжнага кафэ і г.д. Адзін зімовы сад чаго варты... А зрабілі яго літаральна з нічога, на «голым месцы». Кветкі і іншыя расліны прыносілі з дому і выкладчыкі, і навучэнцы. Наперабой прапаноўвалі арыгінальныя ідэі для афармлення інтэр'ера. Самі, сваімі рукамі высадзілі больш за 200 відаў раслін, перацягалі і перакапалі горы зямлі, сплялі габелены з лазы, выслалі мохам падлогу, зрабілі фантанчык і невялікую саджалку.

— Калі ўсё гэта перавесці на грошы, атрымаецца мінімум 100 мільёнаў, — гаворыць намеснік дырэктара па вучэбна-вытворчай рабоце Ала Матусевіч. — А нам наш сад абышоўся, лічы, дарам — толькі абласное ўпраўленне адукацыі выдзеліла 5 мільёнаў на набыццё экзатычных раслін. Астатняе — справа рук нашых дзяцей, нашых выкладчыкаў і майстроў.

«Мы — самі» — адно з непахісных правілаў гэтай установы, незалежна ад таго, усім яно падабаецца ці не. Усё, што можна зрабіць сваімі сіламі (а значыць, без прыцягнення дадатковых сродкаў), так і робіцца.

...Ала Мікалаеўна запрашае нас з фотакарэспандэнтам на своеасаблівую экскурсію па вучэбных кабінетах каледжа. Разглядваючы «хіт-распляценні» разнастайных шкляных трубачак, колбачак і ўвогуле незразумелых ёмістасцяў, цікавімся: а ці можа навучэнец каледжа ўзбіць масла ў хатніх умовах? Ці зварыць сыр? Словам, прымяніць на практыцы тэарэтычныя веды?

— Запраста! — адказвае Ала Мікалаеўна.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

НЕ ХУЖЕ ЕВРОПЫ

В Беларуси сформировано прогрессивное законодательство

В процессе учебы в Институте высших управленческих кадров Академии управления при Президенте Республики Беларусь председатели Советов депутатов первичного уровня имеют возможность встретиться со многими высокопоставленными чиновниками и руководителями высшего звена, получить из первых рук информацию, а также компетентные ответы на интересующие вопросы. На прошлой неделе в учебную аудиторию к депутатам была приглашена председатель Постоянной комиссии Совета Республики по законодательству и государственному строительству Наталия Андрейчик.

В своем выступлении Наталия Иосифовна отметила, что в законотворческой деятельности за последние годы достигнуты позитивные результаты, приняты основополагающие законы и кодексы, которые направлены на упрочение белорусской государственности. Созданная правовая база позволяет всем ветвям власти реализовывать свои полномочия, обеспечивать защиту прав и законных интересов граждан. Наталия Иосифовна подчеркнула, что наличие современной законодательной базы, отвечающей мировым стандартам, устойчивость правового регулирования, разделение и взаимодействие властей, гарантированность прав и свобод граждан, судебная защита, развитие конструктивного правосудия — это и есть те правовые ценности, которые присущи сегодня белорусскому государству и которые необходимо укреплять и развивать.

«Вы не раз, наверное, слышали упреки в адрес белорусского законодательства в том, что оно не является демократичным, что в нем отсутствуют нормы, соответствующие мировым стандартам, — обратилась Наталия Иосифовна к председателям. — Я должна сказать, что это совершенно не так». В качестве доказательств своей правоты она привела несколько примеров из важнейших кодексов и законов, в частности более подробно остановилась на Уголовном кодексе, вступившем в силу в 2001 году. По словам Наталии Андрейчик, в нем реализованы основные общемировые тенденции развития уголовного права, а именно: с одной стороны смягчение ответственности за преступления, совершенные впервые и не представляющие большой общественной опасности, а с другой — усиление уголовной ответственности за отдельные, имеющие тенденцию к росту опасные виды преступлений, борьба с которыми как раз и основывается на международных правовых актах. Это преступления, связанные с коррупцией, распространением наркотиков, с торговлей людьми, терроризмом.

Если в городах уровень преступности падает, то в деревнях — продолжает расти.

В новом УК появилась статья, дающая возможность не доводить дело да суда, если человек, совершивший преступление, возместил причиненный вред (эта норма не распространяется на людей, совершивших преступление, сопряженное с посягательством на жизнь и здоровье человека). Как во всех демократических странах, в Беларуси в новом УК повышена роль потерпевшего. Уголовное преследование по многим преступлениям возможно теперь только по его требованию. Есть дела, где обязательно учитывается мнение потерпевшего при назначении наказания. Если произошло примирение с потерпевшим, это является основанием для освобождения от уголовной ответственности.

За 6 лет действия УК он пополнился всего 13 новыми видами составов преступлений. Среди прочих: вовлечение в занятие проституцией, незаконные действия по усыновлению, по трудоустройству граждан за границу, изготовление, использование и сбыт поддельных акцизных марок и т.д.

Согласно оценки международных экспертов Евросоюза, в Беларуси сформировано прогрессивное законодательство в области противодействия торговле людьми. За последние 6 лет в стране выявлено около тысячи преступлений подобного рода, прекращена деятельность 48 организованных преступных групп и 10 международных преступных организаций, к уголовной ответственности привлечены 1,5 тысячи человек.

Террористическая атака в США 11 сентября 2001 года заставила весь мир обратить внимание на степень своей правовой защищенности по этому вопросу. В нашем УК криминальной ответственностью охвачены все типичные проявления этого страшного явления.

Что касается состояния преступности в целом, Наталия Андрейчик озвучила следующие цифры: за первый квартал 2007 года в стране было совершено 41 458 преступлений (что на 10 процентов меньше, чем за аналогичный период прошлого года). Уменьшение произошло в основном за счет тяжких, менее тяжких преступлений и преступлений, совершенных с участием подростков. Несмотря на имеющиеся основания для некоторого оптимизма, отметила выступающая, преступность продолжает оставаться очень серьезным фактором социальной напряженности — не приостановлен ее рост в Минской и Гродненской областях, не найдены виновные в совершении более 90 тысяч преступлений, треть из которых — кражи.

Говоря об эффективности принимаемых правоохранительными органами мер по снижению уровня криминализации в сельской местности, Наталия Иосифовна привела следующие факты: сегодня в сельской местности проживает 28 процентов населения, а количество преступлений в деревнях в сравнении с 2001 годом возросло в 2,3 раза (при сокращении численности сельских жителей больше чем на 170 тысяч). Если в городах уровень преступности падает, то в деревнях — продолжает расти. Причем наибольшими темпами — в Минской (на 21 процент), Гомельской (на 15 процентов) и Витебской (на 6 процентов) областях. Среди основных причин такой ситуации Андрейчик назвала, во-первых, недостаточный уровень взаимодействия правоохранительных и иных госорганов в оптимизации преодоления негативных тенденций. Во-вторых, указала на отсутствие эффективных мер по противодействию пьянству на селе. Так, в текущем году в ЛТП было изолировано 2,3 тысячи лиц (в том числе 220 женщин), систематически нарушавших общественный порядок на почве пьянства. Кроме того, отрицательное влияние на криминагенную ситуацию в деревне оказывает увеличение объемов реализации алкогольной продукции организациями потребкооперации и подпольными производителями самогона, а также низкий уровень соблюдения трудовой дисциплины среди работников СПК. На тысячу работающих в сельском хозяйстве приходится 70 правонарушений, в промышленности — 19, в сфере строительства — 46. Анализ материалов уголовных дел показал, что основными причинами, влияющими на состояние преступности в сельской местности, наряду с пьянством являются незанятость общественно полезным трудом, отсутствие организации досуга молодежи.

В завершении своего выступления Андрейчик попросила председателей местных Советов оказать помощь в налаживании контактов между адвокатами и руководителями СПК. Она напомнила, что глава государства в свое время обращал внимание на необходимость юридической поддержки предприятий АПК. Коллегия адвокатов со своей стороны сделала все возможное, чтобы эту поддержку оказать. Учитывая сложное положение хозяйств, юристы минимизировали оплату своего труда, но сами предприятия все еще очень неохотно идут на заключение договоров.

Подводя итог своего выступления, Наталия Андрейчик еще раз подчеркнула, что белорусское законодательство совсем не хуже европейского и ничуть не менее демократичное.

Инга МИНДАЛЕВА.

АКТУАЛЬНА

Барыс БАТУРА:

«МЯСЦОВЫЯ САВЕТЫ ПАВІННЫ АРГАНІЗАВАЦЬ ПРАЦУ ПА АКАЗАННЮ ПАСЛУГ НАСЕЛЬНІЦТВУ»

На нядаўняй прэс-канферэнцыі старшыні Магілёўскага аблвыканкама Барыса Батуры закраналіся некалькі тэм, звязаных з дзейнасцю мясцовых Саветаў дэпутатаў. «Мясцовае самакіраванне» друкуе адказы кіраўніка вобласці на актуальныя для сельскіх Саветаў і выканкамаў пытанні.

Пра ўклад Саветаў у агульную справу

Ёсць закон аб мясцовым самакіраванні, і ў яго межах мясцовыя Саветы і сельвыканкамы павінны дзейнічаць. Стан могілак, знешні выгляд вёсак, выкананне сацыяльных стандартаў на месцах, падтрымка насельніцтва, асабліва састарэлага, работа з ім — вось іх галоўныя задачы.

Чаму абавязкова апрацоўваць агарод павінен нехта збоку? Ёсць спецыяльныя брыгады пры сельвыканкамах, якія аказваюць гэты від паслуг і адначасова зарабляюць грошы, фарміруючы свае бюджэты.

Такія асноўныя задачы Саветаў, і яны павінны арганізоўваць іх выкананне. Канешне ж, у сельвыканкаме працуе 3—4 чалавекі, і зразумела, што яны не возьмуць у рукі рыдлёўкі і сякеры і не пойдуць працаваць самі, але арганізацыя такой працы — гэта за імі. І мы будзем сур'ёзна патрабаваць яе выканання.

Пра старастаў вёсак і аплату іх працы

Ёсць адпаведны Указ № 21 па фарміраванню бюджэтаў сельвыканкамаў. У прынцыпе, у іх ёсць магчымасць зарабляць грошы і накіроўваць іх у тым ліку і на заахвочванне старастаў. Калі чалавека заахвоцілі за добрую грамадскую працу, ці гэта дрэнна? Канешне, добра! І грошы ў сельвыканкамаў павінны на гэта быць.

Мы калісьці паказвалі, як у Быхаўскім раёне сельскі Савет і аўтамабіль набыў толькі за кошт аднаго збору малака ў насельніцтва. Каб грошы былі, трэба «круціцца».

Пра вёскі, якія паміраюць

Калі ў вёсках засталіся адна-дзве сям'і ці некалькі жыхароў, трэба падцягваць іх на цэнтральныя сядзібы, даваць жыллё там. А такая магчымасць ёсць. А ў старых вёсках усё ліквідаваць, каб не было рассаднікаў смецця.

Я не магу зразумець, чаму ёсць праблемы з вёскамі што паміраюць. Праблем не павінна існаваць, калі на тэрыторыі ёсць нармальны гаспадар. Няма вёскі, ніхто не жыве — значыць, трэба яе ліквідаваць.

Няўжо мы спадзяёмся, што людзі валам паваляць у вёску? Я, дапусцім, на гэта сур'ёзных надзей не ўскладаю. Пры наяўнасці сучаснай тэхнікі ў сельскай гаспадарцы ў нас у працы задзейнічана 25—30 працэнтаў насельніцтва, а на Захадзе — усяго 3—5 працэнтаў спраўляюцца з вытворчасцю прадукцыі сельскай гаспадаркі і забяспечваюць ёй астатніх удосталь.

І ў нас тое ж самае намячаецца. Напрыклад, у Магілёўскай вобласці было пад 3 тысячы камбайнаў. Цяпер у нас засталося 1600, і нам болей не трэба. А калі гаварыць дакладна, то нам патрэбны 1200 камбайнаў — але нармальных, каб яны працавалі належна. Тое ж самае і з трактарамі. Іншымі словамі — патрэбы сельскай гаспадаркі ў працоўнай сіле таксама скарачаюцца. Сельская праца таксама павінна быць высокапрадукцыйнай.

Запісала Ілона ІВАНОВА.

МЯСЦОВЫ ЧАС

Тэльмінскі сельсавет асаблівы. Па сутнасці — кавалак горада ў прыгарадзе. Што гэта значыць? З пачаткам перабудовы і асабліва пасля развалу вялікай краіны ўсе буйныя гарады пачалі абрастаць так званымі «царскімі сёламі». Нябедны люд стаў будаваць сабе элітнае жыллё за межамі горада, на свежым паветры. Вычулкі, Задворцы, Плоска — у нядаўнім мінулым вёскі, цяпер сталі, можна сказаць, асаблівымі мікрараёнамі горада з сельскім статусам. З дня на дзень быццам бы чакаецца рашэнне аб уваходжанні гэтых зямель у склад абласнога цэнтра. Але гэта «з дня на дзень» расцягнулася ўжо на гады. І па-ранейшаму сельсавет застаецца тут адзінай уладай з усімі характэрнымі функцыямі.

АЎКЦЫЁН ПА-СЕЛЬСАВЕЦКУ

Каго падманваем?..

У 16 населеных пунктах сельсавета жыве каля сямі з паловай тысячы чалавек. Гэта амаль што насельніцтва невялікага райцэнтра. І сельвыканкам са штатам у пяць адзінак з раніцы да вечара працуе як штаб юрыдычных, натарыяльных дзеянняў. Складзены графік дзяжурстваў супрацоўнікаў штодня да 19 гадзін і ў суботу з 8 да 14 гадзін. «Вось, — адкрывае адзін журнал сакратар Святлана Гапановіч, — з пачатку года ўжо выдала 1173 розныя даведкі. Звычайна за дзень даводзіцца выдаваць каля 30 такіх дакументаў. Але, бывае, і паўсотні набіраецца. Да таго ж, кожную даведку неабходна зарэгістраваць. Кожнаму чалавеку, які звярнуўся, удзяліць хоць мінімум увагі. Адна справа, калі гутарка ідзе пра стандартную даведку аб складзе сям'і. Бланк-нарыхтоўка ёсць у камп'ютары, і запоўніць яго справа адной-дзвюх хвілін. Але з пачаткам вясны людзі ўсё больш звяртаюцца па дакументы, што падцвярджаюць наяўнасць у іх падсобнай гаспадаркі, без якіх не прадасі нават жменю пятрушкі. І гэта больш складаная пісаніна».

Літаральна днямі ў сельсавеце валяр'янкай адпойвалі жыхарку вёскі Вычулкі. Пажылая жанчына разам з мужам жывуць на сціплыя пенсіі ў доме, які яны будавалі доўгія гады, але так і не змаглі поўнасцю скончыць да выхаду на заслужаны адпачынак. І вось, каб сабраць якую капейку і адкласці яе на любімую пабудову ўсяго жыцця, трымаюць агарод. У маі, як пачынаецца зяленіва, гаспадыня спяшаецца на бліжэйшы рынак. У той дзень, паводле яе слоў, у яе было толькі пяць пучкоў зялёнай цыбулі — самы першы ўраджай. А злашчасную даведку ўзяць не тое што забылася — часу пашкадавала. У сельсавеце, як правіла, з ранку чарга. Вось і затрымалі каля гастранома ў мікрараёне «Усход» гандлярку супрацоўнік міліцыі і служачы падатковай інспекцыі, склалі пратакол і сказалі, што паперы на аплату штрафу яна атрымае па пошце. «Што ж я такое зрабіла, — плакала жанчына, — што мяне, як злодзейку тую, пакаралі?». Яе доўга супакойвалі, тлумачылі, што законы і правілы трэба выконваць, добрыя яны ці дрэнныя.

Хоць падрабязна разбіраючы гэты выпадак, мы з сакратаром Святланай Гапановіч прыйшлі да высновы: той, хто такія правілы пісаў, рэальнае жыццё бачыў, хіба, на паперы. Даведка, якую выдае сельвыканкам вяскоўцу, павінна адлюстроўваць пералік усіх відаў культур, што вырошчваюцца ў агародзе, пасадачныя плошчы і мяркуемую ўраджайнасць. Калі аўтары згаданых цыркуляраў думаюць, што сакратар сямітысячнага сельсавета пабяжыць да кожнага ў агарод вымяраць пасадачную плошчу, то ён, мякка кажучы, глыбока памыляецца. А ўжо наконт мяркуемай ураджайнасці — нават калі ў цябе сем пядзяў лоб, вылічыць яе ў нашай зоне рызыкоўнага земляробства ў кожным асобна ўзятым агародзе... самі разумееце. Тады каго падманваем? Саміх сябе, як гэта не сумна. Але ж сельвыканкам спраўна пераводзіць паперу на тысячы даведак, запытаў, адказаў. Святлана Адамаўна як сакратар з дзесяцігадовым стажам лічыць, што дакументаабарот за гэты час узрос разоў у 20. Праўда, ёсць апошнім часам намеры яго скараціць. І гэта пакідае некаторую надзею на лепшае.

Галоўнае — знайсці паразуменне

Са старшынёй Савета Мікалаем Палешкам размаўляем пра тое, з чаго складаецца бюджэт мясцовай улады ці, прасцей кажучы, адкуль бяруцца сродкі на тыя або іншыя патрэбы. Аказваецца, у розных населеных пунктах пытанні вырашаюцца зыходзячы з розных крыніц фінансавання.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

КАНСПЕКТ НА ЎСЁ ЖЫЦЦЁ

Цэх хлебабулачных вырабаў.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— У нас нават ёсць такі ўрок, калі ва ўмовах лабараторыі навучэнцы павінны зварыць адыгейскі сыр ці ўзбіць вяршкі на ручным сепаратары, каб атрымалася масла. Атрымліваецца вельмі смачна, смачней, чым у магазіне». (Дарэчы, гэтым сырам частавалі нават міністра адукацыі, калі ён наведваў каледж падчас выязной калегіі.) А сакрэт той акалічнасці, што выпускнікоў нашай навучальнай установы, як кажуць, з рукамі адрываюць, вельмі просты: яны ведаюць не толькі тэорыю, а і непасрэдна вытворчасць. Калі мы рыхтуем повараў, яны праходзяць практыку ў нашым жа кафэ, непасрэдна на працоўных месцах. Для тых, хто збіраецца працаваць на масларобных і сыраробных прадпрыемствах, поўнасцю абсталяваны дзве лабараторыі — там увесь працэс прадстаўлены ў натуральным выглядзе. Для кандытараў ёсць свой кандытарскі цэх, для пекараў — зноў жа свой невялікі цэх па выпяканню хлебабулачных вырабаў. (Нас, дарэчы, таксама пачаставалі свежым — толькі з печкі — іржаным хлебам. Смаката! — **Н.К.**)

Сувязі з базавымі прадпрыемствамі ў каледжа наладжаны настолькі трывала, што сёння ААТ «Слуцкі сыраробны камбінат» — адно з буйнейшых перапрацоўчых прадпрыемстваў рэспублікі — без пытанняў прадастаўляе навучэнцам каледжа магчымасць праходзіць практыку ва ўсіх цэхах. Вытворчасць на камбінаце поўнасцю аўтаматызавана і камп'ютарызавана. Таму і навучэнцам каледжа без ведання камп'ютара — нікуды. На базе навучальнай установы ўжо створана два камп'ютарныя супер-класы, трэці — у праекце. А навучэнцы Сяргей Жыхарка, Іван Нарановіч і Дзмітрый Жогаль занялі сёлета першае і другое месцы ў розных намінацыях абласнога конкурсу па практычнаму выкарыстанню персанальных камп'ютараў (сярод устаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі).

— Вы пытаецеся, навошта хлебапёку камп'ютар?.. Ды сёння на буйных заводах увесь працэс выпякання — пачынаючы ад разліку колькасці кампанентаў і заканчваючы замесам і выхадам прадукцыі — рэгулюецца аўтаматыкай і занесены ў камп'ютары. Калі аператар памыліцца хоць бы на грам, працэс дасць збой, — тлумачыць Ала Матусевіч.

Увогуле, складваецца ўражанне, што каледж працуе як адзін вельмі зладжаны механізм, у якім кожная «дэталь» ведае сваё месца. За мінулы год даходы пазабюджэтнай дзейнасці склалі тут амаль 913 мільёнаў рублёў, або 35 працэнтаў ад бюджэтнага фінансавання гэтай установы. Самымі «важкімі» з'яўляюцца даходы ад вытворчай практыкі навучэнцаў на прадпрыемствах рэспублікі (больш за 335 млн рублёў), далей ідзе прыбытак ад работы сталовай, ад дзейнасці вучэбных майстэрань (тут вырабляюць пад заказ і на продаж розныя інструменты і інвентар), ад аказання платных адукацыйных паслуг насельніцтву (у плане перакваліфікацыі) і іншыя.

Будучыя тэхнікі і механікі выконваюць курсавы праект.

Сваіх навучэнцаў дырэктар каледжа называе дарослымі дзецьмі і ставіцца да іх па-добраму патрабавальна. Або... з патрабавальнай дабрынёй. Як, уласна кажучы, і да ўсяго педагагічнага калектыву. Гаворыць, што ніколі не карыстаецца дэпутацкім пасведчаннем і статусам, каб «выбіць» для «свайго» каледжа нейкія спецыяльныя прывілеі. І ўвогуле не аддзяляе праблем адной асобна ўзятай навучальнай установы ад праблем вобласці і краіны ў цэлым.

Дарэчы, не магла не спытаць у Барыса Браніслававіча, як ужываюцца пад адным дахам два дэпутаты (жонка Наталля Віктараўна Блахіна — член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу)? Адказаў, што ніякага «ціску» з боку сваёй «палавіны» не адчувае — наадварот, агульныя інтарэсы зближаюць, прымушаюць знаходзіць кампраміс і дапамагаць адно аднаму.

Напрыканцы размовы пацікавілася ў Блахіна ўзнагародамі, якімі была адзначана навучальная ўстанова за гады свайго існавання. Папрасіла назваць «самыя-самыя»...

— Калі я быў у Гродне, наведаў там фабрыку па вытворчасці марожанага. З 44 работнікаў палова — нашы выпускнікі. Не паспеў агледзецца, падышла тэхнолаг: а я ў вас вучылася!... Яна і сёння памятае. Ці узяць, да прыкладу, дырэктара прадпрыемства ААТ «Гроднамалкамбінат» Іосіфа Шышко. У яго да гэтага часу ляжаць на стале нашы канспекты, і ён імі карыстаецца... Ведаеце, наша ўстанова шэсцьдзесят гадоў свайго існавання атрымлівала розныя ўзнагароды. Але такія я лічу самымі дарагімі.

Наталля КАРПЕНКА.
Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.
г. Слуцк.

У зімовым садзе намеснік дырэктара Ала МАТУСЕВІЧ і Таццяна АЛЕШКА.

АЎКЦЫЁН ПА-СЕЛЬСАВЕЦКУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

У Вычулках, Задворцах, Плосцы, дзе колькасць насельніцтва даўно пераваліла за тысячу, дзе дамы растуць як грыбы, распаўсюджаны долевы ўдзел грамадзян. Так былі праведзены газіфікацыя, падсыпка дарог. Талакой вырашаюцца і іншыя праблемы па меры іх узнікнення. Але ёсць у Тэльмінскім сельсавеце і Буякі, дзе пражывае 24 чалавекі, Очкі — 32, Булькова — 57, Смолін — 9 чалавек. Такім, вядома, забяспечыць неабходную якасць жыцця дапамагае сельская ўлада. Ва ўсе маленькія вёскі ходзіць аўталаўка, усе яны забяспечаны транспартным абслугоўваннем, на вуліцах з наступленнем цемнаты ўключаецца святло. Сельсавет узяў на сябе клопат і аб тым, каб наўкол былі прыстойныя дарогі. Так што перадаваць гаспадарку на баланс дарожнікам, як таго патрабуюць апошнія рашэнні, будзе нясорамна.

На свае невялікія праекты па добраўпарадкаванню і падтрыманню населеных пунктаў у добрым выглядзе, расказвае Мікалай Іосіфавіч, грошы збіраюцца з падаткаў і збораў. Як вядома, за дазвол на будаўніцтва, скажам, дома цяпер трэба плаціць. Ды і на мясцовыя прадпрыемствы, паводле слоў старшыні Савета, грэх было б нараkаць. Кіраўніцтва саўгаса «Брэсцкі» і цяплічнага камбіната «Бярэсце» ўсе патрэбы вяскоўцаў, мясцовай камунальнай гаспадаркі, сацыяльных аб'ектаў чужымі не лічыць. Дому культуры дапамаглі агульнымі намаганнямі. А зараз цяплічны камбінат абсталёўвае па самых сучасных патрабаваннях школьны кабінет рускай мовы і літаратуры. Асобнае слова сказаў кіраўнік мясцовай улады і пра начальніка ДЭУ-1 Аляксея Грачаніка. Дарожная арганізацыя, што размяшчаецца на тэрыторыі сельсавета, таксама ніколі не апускаецца да дробязных высвятленняў, калі трэба прагрэйдаваць, скажам, лішні метр вясковай дарогі.

> Сакратар з дзесяцігадовым стажам лічыць, што дакументаабарот за гэты час узрос разоў у 20.

На тэрыторыі сельсавета размешчана частка прадпрыемстваў-рэзідэнтаў свабоднай эканамічнай зоны «Брэст». З імі таксама, калі ўмела правесці работу, лічаць у сельсавеце, можна знайсці паразуменне. Так, вытворцы мэблі дапамагалі ў правядзенні святаў невялікіх вёсак і іншых мерапрыемстваў.

Не варта, мусіць, гаварыць, што ў Тэльмах, цэнтральнай вёсцы, добра развіта гандлёвае і бытавое абслугоўванне. Гэта і так зразумела. У прыгарадзе побач з дзяржаўнымі сацыяльнымі аб'ектамі развіваецца і прыватны бізнэс. Ёсць дзве цырульні, вялікая майстэрня па пашыву і рамонту адзення. Паводле падлікаў, на тэрыторыі сельсавета маецца 250 лазняў, уключаючы прыватныя. Ёсць і грамадская лазня — хоць яна і перайшла ў прыватныя рукі, але ж карыстаецца папулярнасцю нават у заезджых гасцей. Кошт на паслугі ўсяго комплексу з парыльняй, басейнам, фітабарам даволі прымальны, а для ветэранаў вайны ён зніжаны напалову.

Аўкцыён? Чаму б і не?!

Сацыяльныя стандарты па вулічнаму асвятленню, гандлёваму абслугоўванню выкананы ва ўсіх без выключэння населеных пунктах», — канстатуе старшыня сельскага Савета. Але і добраўпарадкаванне, і іншыя сацыяльныя праекты патрабуюць укладання сродкаў кожны год, і вось у Тэльмах падышлі да неабходнасці правядзення аўкцыёнаў. На адкрытых таргах будуць прадаваць хаты з участкамі зямлі, якія засталіся без гаспадароў і нашчадкаў. У глыбінцы такія пабудовы часта пускаюць пад бульдозер, а ў прыгарадзе ўмовы іншыя. Тут, паводле меркавання спецыялістаў, знойдуцца пакупнікі перш за ўсё на ўчастку зямлі. Землеўпарадчык Уладзімір Трухноў сказаў, што пакуль ідуць актыўныя падрыхтоўчыя работы да магчымых аукцыёнаў. Яшчэ раз накіраваны запыты патэнцыяльным спадкаемцам пакінутых сядзіб, прапрацоўваюцца ўсе юрыдычныя нюансы.

Мікалай Палешка лічыць, што з цягам часу аўкцыёны стануць адной з крыніц папаўнення бюджэту. У недалёкім будучым з аўкцыёна можна будзе купіць і ўчастак пад будаўніцтва. Для забудовы саўгас «Брэсцкі» выдзяляе амаль 20 гектараў. 75 працэнтаў участкаў будуць размеркаваны сярод тых, хто стаіць у чарзе, а астатнія сельвыканкам мае права рэалізаваць праз аўкцыён.

Будзе больш грошай у сельсавеце — з'явіцца і больш магчымасцяў падтрымаць старых адзінокіх людзей, ветэранаў. Іх, удзельнікаў вайны, дарэчы, на 16 вёсак засталося ўсяго 28 чалавек. Напрыклад, Андрэй Нікандравіч Чабаткоў, кавалер многіх баявых узнагарод, за мірную працу пасля вайны ўдастоены ордэнаў Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга. У Андрэя Нікандравіча кіраўнік мясцовай улады — нярэдкі госць.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

НЯШЧАСНЫЯ ВЫПАДКІ ПА... АРГАНІЗАЦЫЙНЫХ ПРЫЧЫНАХ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Удзельнікі пасяджэння каардынацыйнага савета прыйшлі да высновы, што патрабаванні прэзідэнцкай Дырэктывы «Аб мерах па ўмацаванню грамадскай бяспекі і дысцыпліны» дайшлі толькі да ўзроўню кіраўнікоў галоўнага звяна, — гаворыць Мікалай Ленка. — А вось на ўзроўні сярэдняга звяна — майстроў, загадчыкаў участкаў, гаражоў, машынных двароў, якія непасрэдна сутыкаюцца з выканаўцамі работ, гэты «ланцужок» працуе слаба. Як вынік — шматлікія парушэнні, у тым ліку і з трагічнымі наступствамі.

Хоць кантралёраў шмат...

На Гродзеншчыне сёння налічваецца амаль тысяча спецыялістаў па ахове працы ды яшчэ каля 7400 грамадскіх інспектараў. Вялізная армія! Аднак чаму ж выяўляецца маса парушэнняў? У многіх спецыялістаў, лічыць Мікалай Ленка, крайне недастатковая прафесійная падрыхтоўка. А што датычыцца грамадскага кантролю... Да прыкладу, у ААТ «Краснасельскбудматэрыялы» па кожнаму факту парушэння інструкцыі па ахове працы грамадскі інспектар, майстар і яшчэ адзін член камісіі складаюць акт, які захоўваецца ў асабістай справе — два—тры разы чалавек заўважаны ў парушэннях, і яму пагражае звальненне. Што і садзейнічае ўмацаванню дысцыпліны. Але асноўная частка грамадскіх інспектараў (якія павінны прыняць адпаведныя меры рэагавання, калі ўбачылі парушэнні з боку сваіх калег па рабоце) больш значыцца на паперы, чым працуе.

— Раней найбольш праблем па ахове працы было ў сельскагаспадарчых прадпрыемствах, — адзначае Мікалай Ленка. — Аднак у вобласці праведзена каласальная работа ў гэтым накірунку (у прыватнасці, усе суб'екты гаспадарання ўкамплектаваныя спецыялістамі па ахове працы, у некаторых — па некалькі чалавек) і сітуацыя палепшылася. Цяпер самая праблемная галіна — прамысловасць, затым — будаўніцтва. Шмат парушэнняў і ў недзяржаўным сектары эканомікі, дзе нямала кіраўнікоў, для якіх вытворчасць — на першым плане, а ахова працы — на другім. Людзей не навучаюць, не забяспечваюць сродкамі індывідуальнай аховы, неабходнай тэхнічнай і тэхналагічнай дакументацыяй. На пасяджэнні каардынацыйнага савета пастаўлена задача абсталяваць на кожным прадпрыемстве, у кожнай арганізацыі сучасныя кабінеты па ахове працы, каб праз іх праводзіць усю тлумачальную і выхаваўчую работу па гэтай праблематыцы.

І яшчэ адно прынцыповае пытанне, якое заслугоўвае ўвагі не толькі канкрэтных прадпрыемстваў і арганізацый, але і мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў улады, якія адказваюць за кіраванне аховай працы на сваіх тэрыторыях. Пакуль на Гродзеншчыне нідзе не сертыфікаваны сістэмы кіравання аховай працы ў адпаведнасці з нацыянальнымі стандартамі СТБ 18001-2005 і СТБ 18002-2005, якія забяспечваюць выяўленне вытворчых небяспек і ацэнку рызык траўмавання работнікаў, распрацоўку і рэалізацыю эфектыўных мераў па іх зніжэнню. На думку Мікалая Ленкі, гэта дазволіла б падняць узровень адказнасці не толькі кіраўнікоў і галоўных спецыялістаў, але і непасрэдных выканаўцаў работ, кадраў сярэдняга звяна.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ПАРУШЭННІ Ў ГАНДЛІ

ХЦІВАСЦЬ ПРАДАЎЦОЎ ЗАГУБІЦЬ

За першы квартал гэтага года на Чыжоўскім рынку сталіцы зафіксаваны 83 выпадкі абважвання.

Работа індывідуальных прадпрымальнікаў і прадаўцоў, якія дапусцілі парушэнні, разгледжана на пасяджэнні камісіі рынку. Прадаўцы, якіх злавілі на аблічванні і абважванні ў першы раз, строга папярэджаны, а чатыры чалавекі, якія дапусцілі парушэнне паўторна, адхілены ад працы.

Так як Чыжоўскі рынак — прыватнае ўнітарнае прадпрыемства, падведамаснае Беларускаму рэспубліканскаму саюзу спажывецкіх таварыстваў, спецыялісты галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама накіравалі на адрас Белкаапсаюза інфармацыю аб парушэннях у гандлі для прыняцця мераў.

Аляксандр ФІЛІПОВІЧ, «Мінск-Навіны».

АЛЬТЭРНАТЫВА

КОМПЛЕКСЫ ДЛЯ ВЫТВОРЧАСЦІ БІЯГАЗУ

Сёлета будзе закончана будаўніцтва біягазавых энергетычных комплексаў на селекцыйна-гібрыдным цэнтры «Заходні» (Брэсцкая вобласць), Гомельскай птушкафабрыцы і Беларускай занальнай доследнай станцыі па птушкагадоўлі (г. Заслаўе).

Яны прызначаны для вытворчасці біягазу з адходаў жывёлагадоўлі і птушкаводства. Рост цэн на энергарэсурсы павышае эканамічную канкурэнтаздольнасць гэтага віду паліва ў параўнанні з іншымі, упэўнены ў міністэрстве.

Акрамя таго, асноўная экалагічная складовая заключаецца яшчэ і ў тым, што без дадатковых энергетычных выдаткаў можна атрымліваць экалагічна чыстае высакакласнае арганічнае ўгнаенне.

Выкарыстанне біягазавых установак дазволіць таксама палепшыць экалагічную абстаноўку паблізу буйных фермаў і жывёлагадоўчых комплексаў, гэтак жа, як і на пасяўных плошчах, куды зараз вывозяцца адходы жывёлагадоўлі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДАЕШ 20 ЗДАРОВЫХ ЗУБОЎ!

Пашырэнне ў дзяржаўных медыцынскіх установах платных стаматалагічных паслуг дазволіла істотна абнавіць парк стаматалагічнага абсталявання.

— Калі да 2002 года мы закупляліў год усяго 50 новых стаматалагічных установак па краіне, то з 2003 года, пасля пераходу на аказанне платных стаматалагічных паслуг, мы пачалі закупляць штогод 250—280 новых установак, — паведаміў на калегіі Міністэрства аховы здароўя галоўны пазаштатны стаматолаг міністэрства Сямён Навумовіч. — І калі гэтыя тэмпы захаваюцца і далей, то ў бліжэйшыя тры—пяць гадоў мы зможам замяніць увесь свой састарэлы парк абсталявання. Сёння мы замянілі практычна ўсе маральна састарэлыя тэхналогіі. Разам з тым мы не забываем і пра аказанне стаматалагічнай дапамогі льготным катэгорыям насельніцтва — іх у нас дастаткова вялікая колькасць. Як і пра аснашчэнне ўрачэбных амбулаторый — нашы вяскоўцы заслужылі, каб іх абслугоўвалі на самым высокім тэхналагічным узроўні.

З 1998 года ў Беларусі рэалізуецца Нацыянальная праграма прафілактыкі карыесу зубоў і захворванняў на перыядонт, якая пачала прыносіць станоўчыя вынікі. Так, за апошнія 10 гадоў паказнікі стаматалагічнага здароўя палепшыліся ў Беларусі ў 2,2 раза. Паводле еўрапейскага прагнозу на бліжэйшыя 10—15 гадоў, пацыенты ва ўзроставай групе ад 65 да 74 гадоў павінны мець 20 здаровых зубоў. Беларусы ў гэтым узросце маюць пакуль што толькі 13,5 здаровага зуба. Да 2015 года, як спадзяецца Сямён Навумовіч, мы выйдзем на лічбу ў 16 здаровых зубоў. Але 20 здаровых зубоў для беларусаў — гэта проста раскоша...

Надзея НІКАЛАЕВА.

КАМАНДЗІРОЎКА ПА ПІСЬМУ

САМАЕ ПРОСТАЕ — БЫЦЬ ПАСІЎНЫМ СПАЖЫЎЦОМ

У рэдакцыю па электроннай пошце прыйшоў ліст з пасёлка Калодзішчы Мінскага раёна. Аўтар, які пакінуў толькі ініцыялы Ж.К., у падрабязнасцях і вельмі эмацыянальна апісаў цяжкія ўмовы існавання мясцовых жыхароў. Разбураныя незаасфальтаваныя дарогі, недастатковае вулічнае асвятленне, праблемы з грамадскім транспартам, адсутнасць «приличных» магазінаў і свайго рынку — такі спіс прэтэнзій выставіў Ж.К. мясцовым уладам. «Местные жители с болью называют свой паселок Кошмарищи. По телевизору показывают обустройство агрогородков, а про Колодищи, наверное, совсем забыли. Нам ведь тоже хочется жить по-человечески... Вот бы приехала сюда проверка, посмотрела да навела порядок!»

Праверка ў Калодзішчанскі сельскі Савет сапраўды прыехала. Прадстаўнікі пракуратуры займаюцца высвятленнем правамернасці выдзялення і канфіскацыі зямельных участкаў, якое праводзіў папярэдні старшыня сельвыканкама. Сёння яго пасаду займае новы чалавек — Алег Іванько, па адукацыі ваенны медык, які да апошняга года не меў ніякага дачынення да дэпутацкай дзейнасці і работы старшыні Савета і сельвыканкама. Хутка асвоіцца на новым месцы заўсёды складана, асабліва калі ў спадчыну ад папярэдніка застаюцца развал і хаос.

— Прызнаць чалавека вінаватым можа толькі суд, — гаворыць Алег Іванько. — Я прад'яўляць прэтэнзіі былому кіраўніцтву не буду, але стан спраў у сельсавеце на момант майго абрання красамоўна гаворыць сам за сябе. Фронт работ сёння такі, што мне не пазайздросціць ні адзін старшыня сельвыканкама... Мы месцімся зусім побач з Мінскам, — таму зямельныя пытанні для нашага сельсавета — адны з самых балючых і праблемных. Вы самі папрысутнічалі ў мяне на прыёме грамадзян і пабачылі, што амаль кожны другі зварот датычыўся менавіта зямлі. Людзі імкнуцца атрымаць запаветныя «сотні», каб потым з выгадай іх рэалізаваць. Праўда, змяненні ў заканадаўстве крыху астудзілі іх запал. Цяпер, каб прадаць участак, неабходна пабудаваць на ім дом, «голую» зямлю прадаць нельга.

Электронны ліст, з якім мы прыехалі да Алега Леанідавіча, старшыню не здзівіў: падобныя спісы прэтэнзій былі разасланы ў шматлікія рэдакцыі і ведамствы. «Я не зусім разумею, чаму зараз скаржнікі так актывізаваліся, — паціскае плячыма Іванько. — Няўжо думаюць, што прыйшоў новы чалавек і праз тыдзень тут павінен быць квітнеючы край. Гэта ж нерэальна».

Першай у лісце прыводзіцца «дарожная» праблема: *«Дороги почти на всех улицах разрушены, имеются многочисленные ямы, выбоины, рытвины и глубокие трещины, обочины размыты. Отсутствуют тротуары и заасфальтированные пешеходные дорожки...»*

— Сапраўды, тут ёсць пэўныя цяжкасці, — пагаджаецца старшыня. — Сёння я нават падсыпку зрабіць не магу, бо ў мяне ў бюджэце — нуль. Вось пачнём зарабляць грошы, як прапісана ва Указе Прэзідэнта № 21, тады з'явіцца магчымасць нешта зрабіць. Натуральна, у першую чаргу возьмемся за сацыяльна значныя ўчасткі — упарадкуем пад'езды да школ, дзіцячых садкоў, магазінаў. Усё будзе залежыць ад нашых фінансавых магчымасцяў.

У працяг «дарожнай» тэмы аўтар ліста звяртае ўвагу на адасобленасць жыхароў пяцідзесяці павярховак на вуліцы Геафізікаў геафізгарадка. *«Живем как на необитаемом острове, оторванные от благ цивилизации — общественного транспорта, торговли. Пешком добраться к пятиэтажкам можна через лес и гаражный кооператив по трудно проходимым дорожкам. На большей части пути слабое уличное освещение».*

— У канкрэтным выпадку размова ідзе пра пратаптаную мясцовымі жыхарамі сцяжынку праз лясны масіў. А ўсё, што датычыцца лясной гаспадаркі, павінна ўзгадняцца на высокім узроўні. Мы, сельвыканкам, нават не маем права зрабіць са сцяжынкі пешаходную дарогу.

Наконт вулічнага асвятлення старшыня адзначыў, што ў самім пасёлку сітуацыя яшчэ цярпімая. Праблемнымі сёння з'яўляюцца маленькія вёсачкі сельсавета, асабліва Дубраўка. «Калі я сюды прыйшоў 4 месяцы таму, запазычанасць сельвыканкама перад спецыялізаванымі службамі перавышала 100 млн рублёў, — адзначыў Алег Леанідавіч. — Патроху мы выпраўляем становішча. Як толькі ў нас з'явяцца грошы, мы набудзем новыя ліхтары, заключым дагавор з электрыкамі на іх замену. Пачнём, канешне, з Дубраўкі, дзе існуючыя электрасеткі прыйшлі ў непрыгоднасць. Да мяне часта звяртаюцца жыхары Калодзішчаў з патрабаваннем павялічыць колькасць ліхтароў на вуліцах. За ўзор яны бяруць сталіцу і пераносяць мінскія паказчыкі асвятлення ў сельскую мясцовасць. Аднак тут устаноўлены іншыя нарматывы. Ёсць пэўныя сацыяльныя стандарты, у сярэднім па нашаму сельсавету яны вытрымліваюцца. Калі заменім сеткі ў маленькіх вёсачках, увогуле закрыем гэтае пытанне».

Не задавальняе аўтара ліста забяспечанасць грамадскім транспартам. Асабліва той факт, што аўтобусы не даходзяць да аддаленых пяціпавярховак геафізгарадка.

— Падпісаны дагавор з раённымі дарожнікамі на выкананне работ па добраўпарадкаванню разваротнага кальца, праектаванне якога ўжо вядзецца. Пасля завяршэння работ аўтобусы пачнуць даязджаць да азначаных пяціпавярховак, — запэўніў старшыня. — Увогуле, сур'ёзных праблем з транспартам у сельсавеце я не бачу. Да нас з Мінска ходзяць электрычкі, прыгарадныя аўтобусы, маршруткі. Натуральна, заўсёды ёсць што ўдасканаліць. Напрыклад, добра было б пусціць дадатковы транзітны аўтобус, які б заязджаў на наш новы ўчастак забудовы — былы ваенны палігон, што месціцца за пяціпавярхоўкамі геафізгарадка. Але для гэтага трэба заасфальтаваць грунтовую дарогу. І зноў мы прыходзім да фінансавага пытання.

Магазінаў у Калодзішчах таксама хапае, падкрэсліў Алег Леанідавіч, калі працягваў адказваць на прэтэнзіі. Ёсць і дзяржаўныя, і прыватныя. Асартыментны пералік, натуральна, не сталічны, але сацыяльныя стандарты выконваюцца. Работа санітарных службаў у раёне пастаўлена на вельмі высокім узроўні, таму сапсаваны і пратэрмінаваны тавар на паліцах мясцовых магазінаў — рэдкі выпадак, а ніяк не норма. Рынак, на думку старшыні, у Калодзішчах ладзіць нерацыянальна: за 5 кіламетраў знаходзяцца сталічныя ўніверсальныя рынкі «Аквабел» і «Экспабел». Пры жаданні ўсё неабходнае можна набыць там. А сваю садавіну-гародніну мясцовыя жыхары колькі гадоў прадаюць у цэнтры пасёлка.

Для таго каб вырашыць усе балючыя пытанні, сельвыканкаму патрэбны грошы, што неаднаразова падкрэсліваў старшыня ў нашай размове. А якія крыніцы папаўнення бюджэту ён бачыць з выхадам Указа № 21? Асобыя спадзяванні Алег Леанідавіч усклада на рэалізацыю зямельных участкаў праз аўкцыён. (Як мы ўжо казалі, зямля ў Калодзішчанскім сельсавеце амаль што залатая). Пры сельвыканкаме дзейнічае КУП, які нядаўна атрымаў старэнькую піларраму. Трэба знайсці сродкі на яе рамонт і тады можна будзе аказваць насельніцтву платныя паслугі. Не глабальны — але ўсё ж даход.

Яшчэ ў планах старшыні — аформіць дакументацыю на мясцовы палігон цвёрдых бытавых адходаў. «Тады ў нас з'явіцца магчымасць зарабляць на смецці грошы, — растлумачыў Алег Леанідавіч. — Гэта выгадная справа. Верагодна, мы будзем здаваць палігон у арэнду спецарганізацыі, якая займаецца перапрацоўкай і ўтылізацыяй цвёрдых бытавых адходаў». Спадзяецца старшыня і на спонсарскую падтрымку.

— Карыстаючыся магчымасцю, я хацеў бы прапанаваць аўтару ліста і іншым незадаволеным прыходзіць у сельвыканкам і не толькі агучваць праблему, але і са свайго боку прапаноўваць нейкія шляхі яе рашэння, бо быць пасіўным спажыўцом — самая лёгкая, але не самая правільная пазіцыя.

Інга МІНДАЛЁВА.
Мінскі раён.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:

САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,

ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,

УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

ГРАМАДСКІ САВЕТ:

МАЛАФЕЕЎ А. А., старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню;

САСОНКА М. П., старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту;

СЯЛІЦКІ В. С., старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў;

СІВАКОЎ В. А., старшыня Аршанскага гарадскога Савета дэпутатаў;

ЯРКОВІЧ В. І., старшыня Круглянскага сельскага Савета Магілёўскай вобласці.

АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК: Наталля КАРПЕНКА.

Кантактны тэлефон 292-21-03.

КУПІ ЛЕПШАЕ!

ТАВАРЫ ПАСЛУГІ ЦЭНЫ

Выпуск № 4 (16)

«БІТВА» ЗА НАВЕДВАЛЬНІКА ПАЧАЛАСЯ

Барацьба за кліентаў паміж сталічнымі рынкамі і буйнымі ўніверсальнымі магазінамі, гіпермаркетамі, разгараецца ўсё больш актыўна. Згодна з прагнозамі спецыялістаў, у бліжэйшыя гады доля рэалізацыі тавараў на сталічных рынках зменшыцца да 30 працэнтаў у агульнагарадскім аб'ёме продажу. Паступова рынкі будуць пераходзіць да гандлю толькі прадуктамі харчавання, у тым ліку і сельскагаспадарчымі.

Як мяркуе Аляксандр Лукашэвіч, начальнік аддзела гандлю і паслуг Мінскага гарвыканкама, гэта тэндэнцыя мае станоўчы характар, таму што сведчыць: прыбыткі насельніцтва павялічваюцца. Адпаведна патрабаванні пакупнікоў і гандляроў да ўмоў работы, асартыменту тавараў і якасці абслугоўвання прад'яўляюцца ўсё больш жорсткія.

За пяць гадоў у Мінску адчыніліся амаль сорак новых гандлёвых цэнтраў сярэдняга ўзроўню, якія людзі наведваюць з усё большай ахвотай. А гіпермаркеты сталі вядомыя не толькі сярод жыхароў сталіцы, але і бліжэйшых населеных пунктаў.

Паводле інфармацыі Аляксандра Лукашэвіча, перад гарадскімі ўладамі паўстала неабходнасць мадэрнізацыі існуючай сістэмы арганізацыі гандлю на рынках. Напрыклад, пасля правядзення атэстацыі 22 гандлёвых аб'ектаў было прызнана, што пяць рынкаў не выконваюць неабходныя нормы і патрабаванні да правілаў вядзення гандлю. На сёння атэставаныя толькі ўмоўна рынкі «Чыжоўскі», «Курасоўшчынскі», «Чэрвенскі», «Гандлёвыя рады», рынак у Шабанах. Зараз яны цалкам не могуць адпавядаюць свайму статусу. Таму іх прыводзяць у «рабочую» форму.

— Два ці больш грубых парушэнняў прыводзяць да пазбаўлення ліцэнзіі на права гандлю. Найбольш распаўсюджанымі праблемамі рынкаў, з якімі мы сутыкаемся, з'яўляецца парушэнне падатковых і гандлёвых правілаў, санітарных нормаў, — кажа А. Лукашэвіч.

Дарэчы, кантроль прыносіць свае вынікі. Летась упершыню была вырашана праблема перадсвяточнага павышэння кошту на прадукты. Пакупнікі не адзін год накіроўвалі скаргі на тое, што напярэдадні святаў цэны на асобныя віды харчовых тавараў, неабгрунтавана павялічваліся. І толькі напрыканцы 2006 года гарадскія ўлады змаглі вырашыць праблему.

— Прызнаюся, перш-наперш нам дапамог адміністрацыйны рэсурс. Асноўнай формай работы з аптовымі пастаўшчыкамі, вытворцамі і кіраўнікамі сталічных рынкаў стала рэгулярнае правядзенне нарад, — кажа начальнік аддзела гандлю і паслуг Мінскага гарвыканкама. — Такія сустрэчы арганізуюцца за месяц да свята. Мы абмяркоўваем пытанні наяўнасці тавараў і іх кошту. Для таго каб перад святамі не ствараўся ажыятаж, дадаткова мы арганізоўваем пункты продажу прадукцыі вытворцаў.

Пад кантролем горада знаходзіцца і арэндная плата. Яе павелічэнне можа паўплываць на канчатковы кошт продажу прадукцыі. Дзякуючы прэзідэнцкаму Указу № 148 «Аб неадкладных мерах па падтрымцы прадпрымальнікаў» кошт арэнды гандлёвых пунктаў на рынках знізіўся на 15—35 працэнтаў.

На сёння магутнасць усіх мінскіх рынкаў складае 12 300 гандлёвых месцаў, задзейнічана ж — 11 800. У мінулым годзе аб'ём рознічнага гандлю на рынках горада склаў 3 трыльёны 194 мільярды рублёў.

Пры гэтым доля рынкавага гандлю ўжо знізілася з 37 да 34 працэнтаў. Такім чынам, гіпермаркеты бяруць сваё. Аднак, як бачна, у гэтым няма нічога страшнага, таму што так было прадвызначана. Застаецца пачакаць, калі «вайна за пакупніка» завершыцца і ўсталюецца трывалы баланс паміж аб'ёмамі продажу тавараў на рынках і ў магазінах. Пры тым, што гіпермаркетаў з кожным годам становіцца ўсё больш, у будучым такая форма гандлю, як гарадскі рынак, канешне ж, не знікне, аднак часткова памяняе сваё аблічча. Можна ўжо зараз убачыць, што канкурэнцыя штурхае мінскія рынкі да рэфармавання прынцыпаў сваёй работы, і гэта ідзе на карысць усім удзельнікам гандлёвых адносінаў.

Дзмітрый АЛЬФЕР.

У СЯДЗЕЛКІ ТОЛЬКІ З ПАДРЫХТОЎКАЙ?

Міністэрства працы і сацыяльнай абароны падрыхтавала рэкамендацыі па разліку тарыфаў на паслугі сядзелкі.

У прыватнасці, паведаміла кансультант галоўнага ўпраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Яніна Ладышава, згодна з рэкамендацыямі, пры доглядзе сацыяльна неабароненых катэгорый насельніцтва гадзіна работы сядзелкі павінна каштаваць каля 2 тыс. рублёў. Але ў асобных рэгіёнах гэта лічба можа адрозніваца.

Пры гэтым у Рэспубліканскім інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі міністэрства ўжо распачалося навучанне сядзелак. Навучанне наладжана для 30 супрацоўнікаў тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Падчас падрыхтоўкі па новай спецыяльнасці ўдзельнікам курсаў плануецца даць спецыяльныя веды па асновах медыцынскага абслугоўвання цяжка хворых людзей і інвалідаў, арганізацыі іх догляду, сацыяльнай псіхалогіі.

Дарэчы, адзначаюць у міністэрстве, паслугі сядзелак аказаліся па-сапраўднаму запатрабаванымі. На сёння такі від догляду практыкуецца ў 56 раёнах Беларусі, а як чакаецца, да канца года сядзелкі будуць працаваць ва ўсіх рэгіёнах без выключэння.

Сяргей ГРЫБ.

Цэны на харчовыя тавары ў красавіку ўзраслі на 0,5 працэнта

Індэкс цэн на харчовыя тавары ў Беларусі ў красавіку гэтага года ў адносінах да сакавіка склалі 100,5 працэнта, да снежня 2006 года — 103 працэнты. Рост цэн на харчовыя тавары ў красавіку 2007 года ў параўнанні з сакавіком гэтага года даў 0,3 працэнта прыросту зводнага індэкса цэн.

Паводле даных статыстыкі, больш за ўсё ў красавіку ў параўнанні з сакавіком узрасла ў цане свежая капуста — на 25 працэнтаў. Буракі падаражэлі на 3,5 працэнта, рэпчатая цыбуля — на 9, морква — на 9,1 працэнта. Яблыкі сталі даражэй на 4,6 працэнта, бананы — на 9,3 працэнта. Цэны на нятлусты тварог павялічыліся на 1,1 працэнта, на рыс — на 1,2, гарэлку — на 1,5 працэнта.

Разам з тым сала патаннела на 1,3 працэнта, свежая рыба — на 3,1 працэнта. Знізіліся таксама цэны на свежыя памідоры — на 7,9 працэнта, зялёную цыбулю — на 15,7, агуркі свежыя — на 20,8 працэнта.

Што датычыцца іншых прадуктаў харчавання, то ў красавіку гэтага года ў параўнанні з сакавіком цэны на кансервы з агародніны ўзраслі на 0,2 працэнта, бульба падаражэла на 0,3, мяса і мясапрадукты, кандытарскія вырабы — на 0,4, яйкі, мука — на 0,5, малако і малочныя прадукты, цвёрдыя сыры, крупы і бабовыя, хлеб і хлебабулачныя вырабы — на 0,6, сметанковае масла і безалкагольныя напоі — на 0,7, алкагольныя напіткі — на 1,1 працэнта. Не змяніліся цэны на цукар і алей, а цэны на гародніну ў цэлым знізіліся на 4,2 працэнта.

Таццяна ЛОБАС, БЕЛТА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхарка в. Стрэшын Жлобінскага раёна Анастасія АРНОВА.

У Італію — па новыя ўражанні

З наступленнем сезона водпускаў многія з нашых чытачоў цікавяцца, дзе можна адпачыць так, каб і свет пабачыць, і ў моры пакупацца

Адразу скажам, што зараз існуе багаты выбар аўтобусных маршрутаў, каб з карысцю пакалясіць па Еўропе і паспець атрымаць асалоду ад спаткання з морам. Традыцыйна адным з самых папулярных накірункаў з'яўляецца італьянскі. Што зусім не дзіўна, бо нямногія дзяржавы могуць пахваліцца багатым антычным мінулым: старажытнымі гарадамі з іх непаўторнымі помнікамі і здабыткамі мастацтва, архітэктуры, музычнымі і літаратурнымі традыцыямі. Дадайце сюды выдатны клімат, раскошу прыроды, адмысловую кухню... Усе сумненні наконт ехаць ці не адразу адыдуць убок.

Сённяшні наш суразмоўца — дырэктар турыстычнай кампаніі «Трэйд-Ваяж» Таццяна ШАМАЦЕНКА.

— Курс на Італію, — гаворыць Таццяна Іванаўна, — мы ўзялі нядаўна, і вельмі задаволеныя: колькасць беларусаў, якія хочуць адправіцца на Апеніны, асабліва на камфартабельным аўтобусе, хутка расце.

— Што ў самых бліжэйшых планах?

— Туркампанія «Трэйд-Ваяж» рада прапанаваць 16-дзённы аўтобусны тур у Італію з наведваннем асноўных славутасцяў краіны і адпачынкам на Венецыянскай Рыўеры ў гарадку Лідо Дзі Езоло.

— Пэўна, для многіх турыстаў, тым больш для навічкоў, гэтая назва мала аб чым гаворыць?

— Магчыма. Лідо дзі Езоло — дэмакратычны і вельмі камфартабельн курот, размешчаны за 30 км ад Венецыі на беразе Адрыятычнага мора. Самі італьянцы называюць гэтую дзівосную курортную зону «горадам канікулаў у венецыянскіх садах». Дарэчы, ён даўно стаў адным з самых папулярных месцаў адпачынку на моры. Вакол яго няма прамысловых аб'ектаў. Славіцца гэты курорт чыстым і мелкаводным морам, шырокімі, ідэальна дагледжанымі і абсталяванымі пляжамі з дробным залацістым пяском. Як вялікі плюс — асаблівы мікраклімат: з-за блізкасці Альпаў тут не бывае моцных вятроў, бурнага мора і высокіх хваляў. Пра сэрвіс у гэтым мястэчку і ўзровень прапануемых гатэляў скажу коратка — на высокім еўрапейскім узроўні. Дадам, што ўваход на пляж і пляжная атрыбутыка ўжо ўключаны ў кошт пуцёўкі.

— Што чакае беларускіх «італьянцаў» у раздзеле «экскурсійная праграма»?

— Калі коратка — шмат чаго цікавага. Падчас экскурсійнай праграмы кожны можа азнаёміцца з гісторыяй і архітэктурай Вены — сталіцы Аўстра-Венгерскай Імперыі, з Веронай — горадам, дзе разыгралася шэкспіраўская трагедыя Рамео і Джульеты, возерам Гарда — найпрыгажэйшым у Італіі з яго утульнымі гарадкамі і паркамі забаў. Далей у паездцы — знаёмства з Фларэнцыяй, музеем пад адкрытым небам, горадам Падуя — італьянскай навуковай Мекай, Венецыяй — унікальным горадам на вадзе. Пра Будапешт таксама можна гаварыць бясконца. Гэта горад, якія спалучае ў сабе гістарычную спадчыну і магчымасць аздараўлення ў водалячэбніцах... Так што запрашаем жадаючых на паездку ў Італію — краіну гасціннасці, гармоніі і вяселля.

Кар. «Звязды».

Италия
Автобусный тур 16 дней
9 дней отдыха на Венецианской Ривьере + экскурсии
заезды с 24.06 по 19.09 (от 500 €)
Отель 4* (завтрак, ужин). Пляж, зонтик и шезлонг бесплатно!)
Проезд автобусом Интеркарс
Экскурсионный тур 8 дней
по городам: Вена-Верона-озеро Гарда-Флоренция-Падуя-Венеция-Будапешт
заезды с 16.06 по 20.09 (от 270 €)
АВИА из Минска и Польши
все побережье Италии
Отдых на острове солнца и любви – Сицилии
Туристическая компания «ТрейдВояж»
ул. Богдановича, 7, к. 4 (Троицкое предместье)
тел.: 288-60-82, 234-04-82
факс: 286-03-39, моб.: (029) 669-03-39, 772-86-77
www.tradevoyage.com, e-mail: tradevoyage@tut.by

По просьбе чытача

АДПАЧЫНАК У СЕЛЬСКІХ СЯДЗІБАХ: «ВЕРАСЕ», «НАД НЁМАНАМ», «ЛЯ ПАРОМА»...

Паслугі і ўмовы розныя, цэны, адпаведна — таксама

Набліжаецца лета і, натуральна, усё больш актуальным становіцца пытанне: дзе адпачыць? Наша чытачка Людміла Петрашкевіч патэлефанавала ў гродзенскі карпункт «Звязды» з просьбай паведаміць каардынаты размешчаных на тэрыторыі Прынямоння агратурыстычных гаспадарак. Мяркуем, што гэта інфармацыя будзе карыснай не толькі для яе.

Паводле апошніх звестак, на Гродзеншчыне агратурыстычнай справай займаюцца ў 17 сядзібах. Адна з лепшых не толькі ў вобласці, але і ва ўсёй рэспубліцы — фермерская гаспадарка **«Верас» (Зэльвенскі раён, в. Казловічы, тэл. (8-01564) 3-92-93, 8-0296-22-33-39)**. Тут вырочшваюць агародніну і збожжавыя культуры, закладзены сад з 800 дрэў, вырабляюць корпусную мэблю і тратуарную плітку. І яшчэ адзін «козыр» — створана зайздросная інфраструктура для прыёму на адпачынак гасцей — да трыццаці чалавек. У доме з усімі выгодамі — сем пакояў, зала для пасяджэнняў, дзе можна праводзіць канферэнцыі і семінары, лазня. Побач — карчма на сорак месцаў з афармленым у нацыянальным стылі інтэр'ерам і, канешне, стравамі беларускай кухні.

Сядзіба «Верас» у вёсцы Казловічы Зэльвенскага раёна

Ірына, жонка кіраўніка гаспадаркі Міхаіла Макея, паклапацілася аб непаўторнай прыгажосці каля дома. Стаў з лебедзямі акружаны кветнікамі, дэкаратыўнымі дарожкамі і альтанкамі, невялікімі мастакамі і скульптурнымі кампазіцыямі, збанамі на плоце і іншымі вырабамі народнай творчасці. Тут маецца каля 250 (!) відаў толькі шматгадовых раслін, не гаворачы ўжо пра аднагадовыя. Можна не толькі палюбавацца гэтым гадавальнікам, але і набыць тут насенне і расаду.

Раслінныя «цуды» — гэта ўжо сама па сабе цікавая экскурсія. Але ж можна азнаёміцца не толькі з імі. Побач з фермерскай гаспадаркай — унікальны помнік архітэктуры XVI стагоддзя — Сынкавіцкая царква, у рэканструкцыі якой удзельнічалі гаспадары сядзібы, непадалёк — Жыровіцкі манастыр, Косаўскі замак, старажытны горад Слонім.

На Зэльвеншчыне вас гасцінна сустрэнуць і ў яшчэ адной сельскай сядзібе — **«Лаўрыновічы» (тэл. (8-01564) 2-35-13, 2-12-74)**. Гаспадары, Генадзь Трацяк і яго жонка Валянціна, рады прапанаваць вам драўляны жылы домік на 4—6 чалавек з печкай, газавай плітой, халадзільнікам, тэлевізарам, наборам посуду. Вёску Лаўрыновічы акружаюць лясы на гарыстай мясцовасці, азёры і рэкі, балоты і затокі. Можна адпачыць у некранутай цішыні, атрымаць асалоду ад рыбнай лоўлі, збору грыбоў альбо купання ў вадасховішчы, якое знаходзіцца на адлегласці 300 метраў ад сябзібы. Гэта, дарэчы, другое па велічыні штучнае вадасховішча ў Беларусі (1190 га). І яшчэ адзін «канёк» — славуты Анненскі кірмаш, які ў канцы XVIII — пачатку XIX стагоддзя па свайму значэнню быў другім у Еўропе пасля Лейпцыгскага. На Зэльвеншчыне яго адрадзілі і праводзяць штогод у сярэдзіне лета.

Што ні сядзіба — то свае асаблівасці. Скажам, на тэрыторыі сядзібы Вольгі Шуляк **«Навасёлкі» (тэл. 8-0296- 58-29-81)**, якая знаходзіцца ў аднайменнай вёсцы Мастоўскага раёна ў цяхім, маляўнічым месцы на беразе Нёмана, можна ўбачыць прадметы культуры і быту вёскі XIX стагоддзя, прыемна адпачыць пад галасы фазанаў, цэсарак, перапёлак, не толькі паназіраць за афрыканскімі страусамі, але і пры жаданні пакаштаваць стравы са страусавых яек. У гасцей будзе магчымасць прагуляцца на брычцы альбо верхам на кані ўздоўж Нёмана і Шчары, пракаціцца на водных лыжах, адпраўзаўка, знаходзіцца таксама сядзіба Валерыя і Аксаны Салькоўскіх **«Над Нёманам» (тэл. 8-0296-43-97-60)**. Акрамя належных умоў пражывання і смачнай ежы, яны прапануюць сваім гасцям багатую культурную праграму — экскурсіі, вечарынку з удзелам мясцовых музыкантаў, а галоўнае, гаспадара сядзібы — адзінага ў Беларусі прафесіянала ігры на гуслях-звончатых, лаўрэата міжнароднага конкурсу ў Італіі. Можна ўбачыць звычай раздзелкі свініны і пакаштаваць свежаніну, прадэгуставаць настойкі з траў, якія зроблены гаспадыняй згодна са старажытнымі беларускімі традыцыямі...

Сядзіба «Верас» у вёсцы Казловічы Зэльвенскага раёна

віцца ў турпаход па гэтых рэках на турыстычных лодках альбо плоце.

Літаральна ў 100 метраў ад сядзібы — чыстае глыбокае лясное возера, дзе можна пакатацца на лодцы і вывудзіць карася, пасля чаго ў спецыяльна абсталяваных месцах на беразе адпачыць з шампурам з шашлыком альбо ля кацялка з выдатнай юшкай.

Гэта сядзіба знаходзіцца ў адным з цэнтраў партызанскага руху 1941—1944 гадоў, і яе гаспадыня арганізуе для гасцей экскурсію па тагачасных партызанскіх сцежках і зямлянках з наведваннем мемарыяла «Шчара». А ў Мастах можна будзе азнаёміцца з экспанатамі краязнаўчага музея і адзіным у Беларусі падвясным мостам праз Нёман.

Працягваем знаёмства з агратурыстычнымі сядзібамі Гродзеншчыны. У сядзібе **«Лебядзінае» (в. Абруб Шчучынскага раёна, тэл. (8-01514) 3-00-80, 8-0296-60-75-50)**, дзе гаспадарыць Іван Куц, ужо паспелі пабываць турысты з Германіі, Польшчы, Расіі, Англіі, Францыі. Для прыёму гасцей маецца сем пакояў, канферэнц-зала, на тэрыторыі сядзібы — сад, возера, руская лазня, два басейны, пляцоўка для валейбола, некалькі стацыянарных мангалаў...

Сядзіба Юрыя Палякова **«Парэчча» (Гродзенскі раён. в. Парэчча, тэл. (8-0152) 99-31-41, 99-38-83, 8-0293-91-78-86)** летам літаральна патанае ў кветках. Месца цікавае тым, што знаходзіцца за 200 метраў ад санаторыя «Парэчча». Яго медыцынскі профіль — лячэнне захворванняў органаў стрававання, касцёва-мышачнай сістэмы і іншых. Выкарыстоўваюцца сапрапелевыя гразі, сухія вуглякіслыя ванны, ручны і падводны масаж, іголкатэрапія, праводзіцца камп'ютарная дыягностыка. Плюс унікальныя лячэбныя ўласцівасці тутэйшай мінеральнай вады.

А цяпер накіроўваемся ў вёску Дакудава Лідскага раёна, якая знаходзіцца за сем кіламетраў ад трасы Мінск—Гродна на маляўнічым беразе Нёмана. На сёння гэта найбольш «прасунутая» ў агратурыстычным накірунку вёска на Гродзеншчыне, паколькі адпаведнай працай там ужо займаюцца ў дзвюх сядзібах.

— Акрамя пражывання і харчавання, мы прапануем гасцям экскурсіі па наваколлю, — расказвае гаспадар сядзібы **«Дакудава» (тэл. (8-01561) 7-82-40)** Юрый Агарка. — Пакажам бабровыя плаціны, хаткі, стаянкі першабытных людзей, аб'екты знакамітай Дугі Струвэ, якая праходзіць праз нашу мясцовасць. Можам таксама арганізаваць сплаў па Нёману на лодках ці плытах.

Паходы на байдарках, пешыя і веласіпедныя прагулкі прапануе для гасцей і гаспадар сядзібы **«Ля парома» (в. Дакудава, тэл. 8-0296-3-91-57)** Сяргей Дубовік. Абсталяваны пляж, валейбольная і баскетбольная пляцоўкі, вечарам можна папарыцца ў лазні з бярозавым, дубовым ці ядлоўцавым венікам. Тут створаны ўмовы для правядзення мядовага месяца, сямейных святаў і карпаратыўных вечарынак, для рыбакоў, паляўнічых, аматараў беларускай кухні.

У Лідскім раёне, побач з г. Бяроза, знаходзіцца сядзіба Валянціны Ціхановіч **«Сонечны бераг» (тэл. 8-0296-43-97-60)**. Тут можна адпачыць з дзецьмі, бо ёсць пляцоўка для гульняў, трэнажорная зала, лазня, сауна, басейн, більярдная, сталовая на 50 чалавек. Ёсць і свая царква, дзе можна павянчацца. Гаспадыня сядзібы — вопытны педагог, таму ўмее знайсці падыход да дзяцей, якія ў яе ахвотна едуць зноў і зноў.

Сядзіба Ірыны і Аляксандра Ліпскіх **«Ля Нёмана» (Гродзенскі раён, в. Падлессе, тэл. (8-0152) 99-31-41, 99-38-83, 8-0293-91-78-86)** размешчана ў 30 км ад Гродна. Тут можна адпачыць з дзецьмі, бо ёсць пляцоўка для гульняў, трэнажорная зала, лазня, сауна, басейн, більярдная, сталовая на 50 чалавек. Ёсць і свая царква, дзе можна павянчацца. Гаспадыня сядзібы — вопытны педагог, таму ўмее знайсці падыход да дзяцей, якія ў яе ахвотна едуць зноў і зноў.

Сядзіба Ірыны і Аляксандра Ліпскіх **«Ля Нёмана» (Гродзенскі раён, в. Падлессе, тэл. (8-0152) 99-31-41, 99-38-83, 8-0293-91-78-86)** размешчана ў 30 км ад Гродна. Тут можна адпачыць з дзецьмі, бо ёсць пляцоўка для гульняў, трэнажорная зала, лазня, сауна, басейн, більярдная, сталовая на 50 чалавек. Ёсць і свая царква, дзе можна павянчацца. Гаспадыня сядзібы — вопытны педагог, таму ўмее знайсці падыход да дзяцей, якія ў яе ахвотна едуць зноў і зноў.

Сядзіба Ірыны і Аляксандра Ліпскіх **«Ля Нёмана» (Гродзенскі раён, в. Падлессе, тэл. (8-0152) 99-31-41, 99-38-83, 8-0293-91-78-86)** размешчана ў 30 км ад Гродна. Тут можна адпачыць з дзецьмі, бо ёсць пляцоўка для гульняў, трэнажорная зала, лазня, сауна, басейн, більярдная, сталовая на 50 чалавек. Ёсць і свая царква, дзе можна павянчацца. Гаспадыня сядзібы — вопытны педагог, таму ўмее знайсці падыход да дзяцей, якія ў яе ахвотна едуць зноў і зноў.

(Заканчэнне на 6-й стар.)

Пра магчымыя змяненні ў раскладзе – даведкі па тэлефоне 105

РАСКЛАД РУХУ ЭЛЕКТРАЦЯГНІКОЎ ПА СТАНЦЫІ МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ З 27 МАЯ 2007 ГОДА

Маршрут	Адпраўленне	Дні	Прыпынкі
НА БАРАНАВІЧЫ, БРЭСТ			
Адпраўленне са ст. Мінск-Пасажырскі			
Баранавічы	4-16	штодз.	б/п Пціч, Воўчкавічы, Бярэжа, Пяцігор'е, Станькава, Дзяржынск, Клыпаўшчына, Асіно, Мезінаўка, Кучкуны, Цёмныя Ляды
Стоўбцы	5-52	штодз.	усюды
Стоўбцы	7-31	вых.	усюды
Стоўбцы	7-58	штодз.	усюды
Баранавічы	8-42	штодз.	усюды
Стоўбцы	9-02	вых.	усюды
Брэст	12-45	штодз.	б/п Пціч, Воўчкавічы, Бярэжа, Пяцігор'е, Станькава, Дзяржынск, Клыпаўшчына, Асіно, Мезінаўка
Стоўбцы	13-32	вых.	усюды
Баранавічы	15-34	штодз. хутк.	з прыпынкамі па п.п. Курасоўшчына, ст. Фаніпаль, Койданава, Негарэлае, Стоўбцы, Гарадзея, Пост 1
Стоўбцы	16-29	пт., вых.	усюды
Стоўбцы	17-45	штодз.	усюды
Стоўбцы	18-24	штодз.	усюды
Баранавічы	20-17	штодз.	да ст. Стоўбцы — усюды, далей з прып. па станцыях Гарадзея, Пагарэльцы і п.п. Пост 1
Стоўбцы	21-30	штодз.	усюды
Адпраўленне з п.п. Інстытут культуры			
Брэст	0-50	штодз.	да ст. Памыслішча — усюды, далей з прып. па станцыях і п.п. Воўчкавічы, Энергетык
Стоўбцы	6-47	штодз.	усюды
Баранавічы	7-23	вых.	да ст. Негарэлае — б.п. п.п. Рошча ўсюды, далей з прып. па п.п. Энергетык, Асіно, Коласава, Стоўбцы, Гарадзея, Пагарэльцы, п.п. Перамога, Крошына, Пост 1
Стоўбцы	9-23	штодз.	усюды
Брэст	10-16	штодз.	усюды
Стоўбцы	11-11	вых.	усюды
Баранавічы	11-46	вых.	б/п Станькава, Мезінаўка, Атцэда, Кучкуны
Стоўбцы	12-09	штодз.	усюды
Стоўбцы	13-05	вых.	усюды
Баранавічы	14-02	штодз.	усюды
Гарадзея	14-36	пт., вых.	усюды
Стоўбцы	14-58	штодз.	усюды
Брэст	16-23	штодз.	б/п Асіно, Мезінаўка, Атцэда, Кучкуны
Баранавічы	17-09	штодз.	б/п Асіно, Мезінаўка, Атцэда
Коласава	18-07	пт., нядз.	усюды
Баранавічы	19-09	штодз.	усюды
Стоўбцы	23-02	штодз.	б/п Асіно, Мезінаўка, Атцэда, Кучкуны, Цёмныя Ляды
НА МАЛАДЗЕЧНА			
Адпраўленне са ст. Мінск-Пасажырскі			
Маладзечна	0-25	штодз.	б/п Лябяжы, Мясота, Крыніца, Татаршчызна, Селівонаўка; па нядзелях — б/п Лябяжы, Татаршчызна, Селівонаўка
Маладзечна	4-36	штодз.	б/п Лябяжы, М. Мора, Крыжоўка, Зялёнае, Хмелеўка, Анусіна, Вязынка, Пралескі
Маладзечна	5-23	штодз.	б/п Лябяжы
Аляхновічы	6-09	штодз.	б/п п.п. Хмелеўка
Маладзечна	6-38	штодз.	б/п Лябяжы, М. Мора, Крыжоўка
Аляхновічы	7-01	штодз.	усюды
Аляхновічы	7-20	вых.	усюды
Маладзечна	7-33	штодз.	усюды
Аляхновічы	8-06	вых.	усюды
Маладзечна	8-22	штодз.	усюды
Аляхновічы	8-46	вых.	усюды
Маладзечна	9-14	штодз.	усюды
Аляхновічы	9-43	вых.	усюды
Маладзечна	10-00	штодз.	усюды
Аляхновічы	10-50	вых.	усюды
Маладзечна	11-11	штодз.	усюды
Аляхновічы	11-48	вых.	усюды
Маладзечна	12-40	штодз.	усюды
Маладзечна	13-34	штодз.	усюды
Аляхновічы	13-56	нядз	усюды
Аляхновічы	14-29	пт., вых.	усюды
Маладзечна	14-46	пт., вых.	б/п М. Мора, Раманы, Крыніца, Селівонаўка
Уша	15-04	нядз.	усюды
Маладзечна	15-23	штодз.	усюды
Аляхновічы	16-09	пт., вых	усюды
Маладзечна	16-30	штодз.	усюды
Аляхновічы	17-18	штодз.	усюды
Маладзечна	17-36	штодз.	усюды
Аляхновічы	17-59	штодз.	усюды
Маладзечна	18-28	штодз.	усюды
Аляхновічы	18-58	пт., вых.	усюды
Маладзечна	19-15	штодз.	усюды
Аляхновічы	20-13	штодз.	усюды
Маладзечна	20-36	штодз.	усюды
Маладзечна	22-04	штодз.	б/п п.п. Мясота, Татаршчызна, Крыніца, Селівонаўка

Адпускнік, памятай!

Рызыка заражэння інфекцыяй пры наведванні басейнаў і spa-салонаў мінімальная

Рызыка заражэння якой-небудзь інфекцыяй пры наведванні басейнаў і spa-салонаў мінімальная, заявіў на on-лайн канферэнцыі Белтэлерадыёкампаніі намеснік міністра аховы здароўя—галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Беларусі Міхаіл РЫМЖА.

Ён патлумачыў, што гаворка найперш ідзе пра грыбковыя захворванні, якія жывуць на паверхні вады. Таму вада падвяргаецца абавязковаму абеззаражванню — гэта або хлараванне, або азанаванне. Да таго ж любы чалавек, які захоча наведаць падобныя ўстановы, павінен будзе падаць даведку ад урача дэрмата-венеролага. «Таму рызыка падхапіць у басейнах якія-небудзь захворванні мінімальная. Я б сказаў, што яе проста не існуе», — запэўніў Міхаіл Рымжа.

Паводле яго слоў, беларусы часцей за ўсё хварэюць на рэспіраторныя захворванні — прастудныя, грып і г.д. Што да іншых класічных захворванняў (такіх, як дыфтэрыя, коклюш, менінгакакавая інфекцыя), іх рэгіструюцца толькі адзінкавыя выпадкі. Дзякуючы правядзенню кампаніі па імунізацыі супраць краснухі сярод падлеткаў 12—19 гадоў, удалося звесці колькасць захворванняў на гэту інфекцыю да адзінкавых выпадкаў.

Адной з задач на бліжэйшую перспектыву з'яўляецца зніжэнне інвазіраванасці паразітарнымі захворваннямі. «Нядобра, калі вялікая колькасць дзетак церпіць ад паразітаў накшталт трыхацэфалез і іншых гліснych захворванняў. Тут трэба наводзіць парадак, перадусім у тым асяроддзі, дзе знаходзіцца дзіця. Я маю на ўвазе кантроль за пясочніцамі, у тым ліку дваровымі», — дадаў Міхаіл Рымжа.

Кар. БЕЛТА.

РАСКЛАД РУХУ ЭЛЕКТРАЦЯГНІКОЎ ПА СТАНЦЫІ МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ З 27 МАЯ 2007 ГОДА

Маршрут	Адпраўленне	Дні	Прыпынкі

НА АСІПОВІЧЫ

Адпраўленне са ст. Мінск-Пасажырскі

Пухавічы	0-20	штодз.	б/п Дрычын, Вендзеж, Тэхнікум
Асіповічы	4-49	штодз.	б/п Чыгуначны
Пухавічы	6-05	штодз.	б/п Чыгуначны, Асееўка, Раўнаполле, Дрычын, Тэхнікум
Асіповічы	6-55	штодз.	б/п Чыгуначны, Седча, Зазерка, Н. Сяло, Вендзеж, Вярхі
Асіповічы	6-47	штодз.	усюды
Пухавічы	7-11	вых.	б/п Чыгуначны, Асееўка, Зазерка, Рыбцы, Н. Сяло, Вендзеж
Талька	7-51	штодз.	усюды
Пухавічы	8-05	вых.	б/п Чыгуначны, Зазерка
Асіповічы	8-33	штодз.	усюды
Талька	8-59	вых.	усюды
Асіповічы	9-29	штодз.	усюды
Талька	10-14	вых.	усюды
Асіповічы	10-35	вых.	б/п Асееўка, Зазерка, Рыбцы, Н. Сяло, Вендзеж, Веленскі, Вярхі
Пухавічы	11-03	суб.	б/п Чыгуначны
Асіповічы	11-45	штодз.	усюды
Асіповічы	12-13	вых.	б/п Асееўка, Зазерка, Рыбцы, Н. Сяло, Вендзеж, Вярхі
Асіповічы	13-17	штодз.	усюды
Асіповічы	14-03	штодз.	усюды
Талька	14-31	нядз.	б/п Чыгуначны, Асееўка
Асіповічы	15-04	штодз.	усюды
Талька	15-55	нядз.	б/п Чыгуначны, Мачулішчы, Асееўка, Зазерка, Рыбцы, Н. Сяло, Веленскі
Талька	16-16	штодз.	усюды
Пухавічы	17-03	пт., нядз.	б/п Асееўка, Зазерка, Рыбцы, Раўнаполле, Н. Сяло, Вендзеж
Асіповічы	17-24	штодз.	б/п Чыгуначны
Талька	17-51	штодз.	усюды
Асіповічы	18-23	штодз.	б/п Вярхі
Пухавічы	18-42	пт., нядз.	б/п Чыгуначны, Асееўка, Зазерка, Рыбцы, Н. Сяло, Вендзеж
Асіповічы	19-27	штодз.	усюды
Пухавічы	20-20	штодз.	усюды
Асіповічы	20-57	штодз.	б/п Вярхі
Асіповічы	22-26	штодз.	б/п Вендзеж, Веленскі, Весялоўскі, Вярхі, Савецкі

НА ОРШУ

Адпраўленне з п.п. Інстытут культуры

Орша (стаянка па ст. Барысаў 2-05—4-15)	0-32	штодз.	б/п Дамашаны, Барсукі, Прал. Перамога
Барысаў	4-56	штодз.	б/п Садовы, Слабада, Дамашаны, Загор'е, Барсукі, Прал. Перамога
Крупкі	5-18	штодз.	усюды
Орша	6-28	штодз.	усюды
Барысаў	7-20	штодз.	усюды
Барысаў	8-07	штодз.	усюды
Барысаў	8-38	штодз.	усюды
Орша	9-17	вых.	усюды
Барысаў	9-57	вых.	усюды
Орша	10-48	штодз.	усюды
Барысаў	11-22	вых.	усюды
Орша	13-06	штодз.	б/п Садовы, Слабада, Загор'е, Барсукі, Прал. Перамога, Краснаўка, Галашоўка
Орша	13-30	пт., вых.	да ст. Бобр — усюды, далей з прыпынкамі па станцыях
Орша	14-49	штодз.	усюды
Барысаў	15-30	штодз.	усюды
Крупкі	16-20	штодз.	усюды
Барысаў	16-57	штодз.	усюды
Барысаў	17-26	штодз.	усюды
Орша	18-19	штодз.	усюды
Барысаў	19-36	штодз.	усюды
Барысаў	20-21	штодз.	усюды

Адпраўленне са ст. Мінск-Усходні

Барысаў	10-39	пт., вых.	усюды
Барысаў	12-14	штодз.	усюды
Барысаў	14-23	штодз.	усюды
Барысаў	22-13	штодз.	усюды

Пра магчымыя змяненні ў раскладзе – даведкі па тэлефоне 105

Лепшы тавар — той, што раскупляюць!

Забароны — недальнабачная палітыка

У харчовай краме «Квартал № 3», што на вуліцы Першамайскай у цэнтры Магілёва, прадаецца шмат тавараў з розных абласцей Беларусі.

Прыхільнікі малочнай прадукцыі сталічных прадпрыемстваў добра ведаюць, што іх дні — аўторак і пятніца. Тады можна набыць малако, сыркі, тварог і ёгурты мінскіх вытворцаў. Разбіраюць добра: крыху спазніўся і — чакай наступнага прывозу.

З Мінска сюды прывозяць таксама віна-гарэлачную прадукцыю завода «Крышталь», мясныя вырабы, цукеркі. З Брэста — вядомыя малочныя харчы «Савушкін прадукт», са Слуцка, Гродна і Бярозы — вэнджаныя мяса і каўбасы.

— Трэба, каб асарытымент папаўняўся і быў шырокі выбар тавараў розных вытворцаў, — дзеліцца вопытам загадчыца крамы Жанна Іванова. — Гэта прыцягвае пакупнікоў. Канешне, калі сказаць шчыра, то гандлёваму прадпрыемству прасцей працаваць з адным пастаўшчыком, але гэта сёння наўрад ці будзе даспадобы людзям. Таму імкнёмся задаволіць попыт і зарабіць на разнастайнасці тавараў.

— Магілёўскі аблвыканкам ніколі не прымаў рашэнняў па забароне ў рэалізацыі прадукцыі з іншых рэгіёнаў, — заявіла першы намеснік старшыні Камітэта эканомікі аблвыканкама Любоў Карунная. — І кіраўнік вобласці Барыс Батура заўсёды настойваў на здаровай канкурэнцыі: чалавек мае права выбіраць — па якасці і па цане.

Некалі, магчыма, і існавалі пэўныя местачковыя забароны, але гэта былі надуманыя дзеянні кіраўнікоў раёнаў.

Напрыклад, калісьці ў Чэрыкаўскім раёне забаранялася рэалізацыя хлеба, выпечанага ў абласным цэнтры.

— Гэта было даўно, — каментуе намеснік старшыні Чэрыкаўскага райвыканкама Ігар Балахонаў. — Цяпер такіх забарон няма, мы прадаём і магілёўскі хлеб. Заканадаўства не дазваляе рабіць абмежаванні ў рэалізацыі прадукцыі. Аднак, на мой погляд, гэта ўсё ж прыносіла карысць прадпрыемствам, якія размешчаны на тэрыторыі раёна. У іх была магчымасць больш прадаць, больш вырабіць прадукцыі, а таму даць большы заробак сваім работнікам і мець грошы на развіццё вытворчасці.

Нягледзячы на тое, што чэрыкаўскі хлеб па якасці адпавядаў усім патрабаванням, якія прад'яўляюцца да мясцовых вытворчасцяў, жыхары раёна зусім не прыхільна ставіліся да абмежаванняў, і многія сцвярджалі, што магілёўскія хлебабулачныя вырабы — лепшыя за мясцовыя.

Канешне, які хлеб лічыць больш смачным — справа густу. Аднак у цяперашніх умовах Чэрыкаўскі хлебазавод пайшоў іншым шляхам: у крамах арганізуюцца выставы-продажы прадукцыі з дэгустацыямі. А многія, сцвярджае Ігар Балахонаў, набываюць свой чэрыкаўскі хлеб з пачуцця партыятызму і таму, што разумеюць: лозунг «Купляйце сваё!» мае пад сабой эканамічную выгаду для мясцовага насельніцтва.

— Забароннымі метадамі нельга вырашыць праблему канкурэнтаздольнасці і рэалізацыі прадукцыі, — настойвае Любоў Карунная. — Гэта проста неразумна. Трэба рабіць тэхнічнае пераабсталяванне і на сучаснай тэхніцы вырабляць якасную прадукцыю.

Напрыклад, прадукцыя Магілёўскага ААТ «Бабушкина крынка» без праблем рэалізуецца па ўсёй Беларусі.

— Наша прадукцыя заваёўвае рынкі якасцю сваёй прадукцыі, — пераконвае дырэктар Ігар Кананчук. — Блат і квіткі на тавары даўно скончыліся. І цяпер, калі чалавек аднойчы набыў недабраякасны прадукт, ён тую марку другім разам не купіць. Так што якасць — асноўны аргумент.

Хоць ён не хавае: афіцыйных забарон на рэалізацыю прадукцыі з іншых абласцей няма, а вось тайныя забароны, безумоўна, дзейнічаюць. Тлумачыцца гэта проста: кожны гаспадар на сваёй тэрыторыі імкнецца падтрымаць у першую чаргу мясцовыя прадпрыемствы.

— Аднак, па вялікаму рахунку, я б не стаў на гэтым акцэнтаваць увагу, — прызнаўся Ігар Кананчук. — Мы спрабуем урэгуляваць праблемы, калі яны ўзнікаюць. Імкнёмся знайсці паразуменне і ўрэшце знаходзім.

Малочныя вырабы з Магілёва вязуць у асноўным у суседнія вобласці — Мінскую, Гомельскую і Віцебскую. З заходнімі рэгіёнамі складана супрацоўнічаць з-за вялікіх адлегласцяў, але і туды трапляе «Бабушкина крынка».

Няма ніякіх праблем з рэалізацыяй прадукцыі і ў вядомага Клімавіцкага лікёра-гарэлачнага завода. Начальнік аддзела продажу Валерый Паралёў паведаміў, што традыцыйна шмат прадукцыі ЛГЗ спажываюць у роднай Магілёўскай вобласці, а таксама ў Мінскай.

— Няма ніякіх перашкод для рэалізацыі гарэлкі з Клімавічаў у іншых абласцях, — запэўніў Валерый Паралёў. — Прадавалі б яшчэ болей, калі б мы не патрабавалі папярэдняй аплаты прадукцыі. Наша гарэлка каштуе няшмат — 5400 рублёў у розніцы, і карыстаецца попытам. Мы вырабляем 11—12 тысяч дэкалітраў у суткі.

Аднак у магілёўскіх крамах свае «родныя» віна-гарэлачныя вырабы з Клімавічаў не карыстаюцца вялікім попытам: яны суседнічаюць на паліцах побач з таксама папулярнай прадукцыяй з Мінска і Брэста.

— У нас прадаецца роўна столькі тавараў вытворцаў з іншых абласцей, колькі яны хочуць прадаць, — сцвярджае начальнік Магілёўскага абласнога ўпраўлення гандлю Леанід Ражкоў.

Ва ўпраўленні гандлю няма спецыяльнай статыстыкі — колькі канкрэтна тавараў з іншых абласцей прадаецца ў крамах Магілёўшчыны, але асобныя групы тавараў — як, напрыклад, дзіцячыя малочныя сумесі і мясныя кансервы — увогуле вырабляюцца толькі ў іншых рэгіёнах.

І, канешне, ніхто не павязе хлеб з Брэста ў Магілёў — гэта пустая справа, надта далёкая перавозка. Але на памежжы цалкам магчымая: напрыклад, з мінскіх Старых Дарог хлеб лёгка і без перашкод трапляе ў Бабруйскі і Глускі раёны, і гэта лічыцца звычайнай справай.

— Недальнабачная палітыка забарон не дзейнічае: пакупнік сам выбірае, што яму набыць, — тлумачыць Леанід Ражкоў, — і з таварамі з розных беларускіх рэгіёнаў сёння канкуруюць таксама і расійскія вырабы.

Ілона ІВАНОВА.

■ Садовы ўчастак 10 сотак, апрацаваны, падмурак 6х7 з плітамі перакрыцця, вагончык 4х3 у Маладзечанскім напрамку, 40 км ад МКАД, 2700 у.а. Тэл. (8-017) 216-87-19.

■ Добраўпарадкаваны драўляны дом, вялікі сад, тэлефон; недабудаваны дом 8х9 зручны для перавозу. Тэл. (8-01514) 35-017.

ТАВАРЫ ПЕРААДОЛЕЛІ МЕЖЫ

Менавіта ў Віцебску ў красавіку гэтага года старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Беларусі Зянон Ломаць заявіў, што будзе ініцыяваць прыцягненне да адказнасці службовых асобаў, якія рознымі шляхамі спрабуюць забараніць увоз тавараў вытворцаў іншых рэгіёнаў. Памятаецца, у свой час на поўным сур'ёзе на Віцебшчыне забаранілі пастаўку піва, выраблянага па-за межамі Прыдзвінскага краю. А перад чарговым «Славянскім базарам» аблвыканкам адмяніў сваю ж часовую забарону на ўвоз піва. Як тады растлумачылі чыноўнікі, «госці «базару» павінны мець выбар піва».

А гарэлка мінскіх і брэсцкіх вытворцаў і зараз у дэфіцыце. Хочаш мінскі «Крышталь»? Калі ласка, купляй у так званай сувенірнай бутэльцы! Цана на такую гарэлку бывае ў 2 разы больш за віцебскую. Ёсць і па «нармальнай цане» — менш за 6000 рублёў, але ж каб знайсці яе, трэба ведаць, дзе знаходзяцца канкрэтныя гандлёвыя пункты. Пры гэтым здзіўляе пазіцыя некаторых кіраўнікоў магазінаў: калі знаёмы спытаў у недзяржаўнай краме па вуліцы Гагарына (у самым яе пачатку), чаму няма ў вас даступнай па цане мінскай гарэлкі, афіцыйная прадстаўніца крамы сказала: «А што, нам трэба спецыяльна для гэтага ехаць у Мінск, каб дамовіцца з заводам на пастаўку?» Вось як! Канешне, прасцей прадаваць добрую гарэлку не мясцовай вытворчасці па двайной цане. Віцебская гарэлка, на жаль, у большасці выпадкаў не просіцца на святочны стол, але ж яна зараз «па-за канкурэнцыяй».

Віцебскія вытворцы зараз пачынаюць жыць сапраўды па рыначных умовах. А дзе багаты выбар айчыннай агародніны? А адзення?

А паглядзіце ў віцебскіх крамах, наколькі часта тут можна ўбачыць тэлевізары «Гарызонт»? Канешне, у нас свой «Віцязь», вось і купляйце? А калі ёсць мінскія тэлепрыёмнікі, наўрад ці яны ў поўным асартыменце, як у сталіцы: мадэлі часцей за ўсё не самыя новыя...

Канешне, Віцебшчыне мясцовыя прадпрыемствы давалі і даюць падаткі, і іншыя нюансы ёсць, напрыклад, як тады захаваць калектыў, калі тое, што ён робіць, не карыстаецца попытам? Безумоўна, трэба тады і людзей скарачаць, і прадпрыемства спыняць для пераабсталявання. А дзе грошы для гэтага знайсці? Канешне, прасцей разлічваць на дапамогу ўладаў у «абароне пакупнікоў» ад прадукцыі канкурэнтаў не толькі з іншых абласцей, але і раёнаў сваёй жа вобласці! Калі пры наяўнасці свайго хлебазавода ў раёнах не пускаюць на рынак хлеб суседзяў!

Безумоўна, у тым жа Мінску больш інвестараў, сумесных прадпрыемстваў, дзе выкарыстоўваюць сучасныя тэхналогіі. А хто забараняе шукаць тых жа інвестараў на Віцебшчыне?

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ФІЛАСОФІЮ КЕФІРНАГА ПАТРЫЯТЫЗМУ

дапаможа пераадолець спажывец

У брэсцкім мікрараёне «Кавалёва» ёсць некалькі гандлёвых павільёнаў ААТ «Кобрынскі масласыраробны завод». Пасля завозу свежай прадукцыі там нярэдка нават чэргі выстройваюцца. Прычына такой папулярнасці кобрынскіх малочных прадуктаў відавочная — яны таннейшыя за аналагі пад раскручанымі брэндамі, такімі як, напрыклад, «Савушкін прадукт». Кобрынскае малако, смятану, кефір можна купіць і ў іншых магазінах, а не толькі ў іх фірменным гандлі, а вось масла ў буйных гандлёвых пунктах няма. Чаму? Ды, відаць, таму, што яно больш таннае. А сваё, брэсцкае, тады куды дзяваць?

Цікава, што каментаваць азначаную праблему службовыя асобы афіцыйна не хочуць. Не хочуць псаваць і без таго не бліскучыя адносіны з гандлем абласнога цэнтра. Усё роўна ж трэба нейкія масты наводзіць. А вось калі патэлефануеш пад відам пакупніка ў службы маркетынгу па нумарах, пазначаных на кожным пакеце, на кожным стаканчыку прадукцыі, з пытаннем, чаму вашай прадукцыі мала, тады пачуеш, як цяжка прабівацца на рынак вялікага горада, напрыклад, пружанскім, бярозаўскім, лунінецкім перапрацоўшчыкам. Але ж гэта інфармацыя не афіцыйная, і яе, як кажуць, да справы не прыкладзеш. Напрыклад, дырэктар Кобрынскага масласыраробнага завода Вера Сляхіна прапанавала кампрамісны варыянт, параіла напісаць пра высокаўскі, пружанскі, лунінецкі, іхні ды іншыя заводы ў кантэксце клопату аб пенсіянерах, людзях з невялікім дастаткам. Бо раённыя вытворцы прадаюць сваю прадукцыю па цане, значна ніжэйшай, чым буйныя заводы. На пытанне, ці прыціскаюць кобрынцаў на брэсцкім рынку, Вера Сцяпанаўна адказала прыкладна так:

— Не магу сцвярджаць гэта, пісьмова ніхто не адмовіў у падпісанні дагавора.

— А чаму вашага таннага масла нідзе не відаць?

— Без каментарыяў.

Рэальнае становішча бачна, калі пахадзіць па магазінах абласнога цэнтра. Раённыя заводы ў якасці гандлёвых партнёраў выбіраюць маленькія магазінчыкі. Так, баранавіцкую прадукцыю я знайшла толькі ў невялікім магазіне плодагароднінагандлю «Ягадка». Гэты магазін працуе і з Лунінцам. Смачныя пружанскія малако, смятана, сыры прадаюцца ў невялікім магазінчыку, які належыць Маларыцкаму спажывецкаму таварыству. Высокаўскія малочнікі стараюцца гандляваць на рынках і ў сваіх уласных павільёнах. Вось толькі ў магазінах сістэмы «АСТОР-ВЕСТ» заўважана разнастайнасць геаграфіі вытворчасці малочных прадуктаў. Яны нават працуюць з Ваўкавыскім «Беллактам».

На першы погляд зразумела імкненне заводаў-вытворцаў прадаваць найперш у сябе. Але па сённяшніх мерках гэта нецывілізаваны падыход да рынку. Прадукцыя павінна прабівацць сабе дарогу менавіта дэмакратычным шляхам, калі за яе «прагаласуюць» узносамі са свайго кашалька пакупнікі. А то атрымліваецца амаль што па Вяземскаму, які пісаў: «Многія прызнаюць за патрыятызм безумоўную пахвалу ўсяму, што сваё. Цюрго назваў гэта лакейскім патрыятызмам». А тут праглядваецца кефірны патрыятызм у прамым сэнсе, які часам прыводзіць да канфузаў. Не так даўно ў Брэсцкай вобласці літаральна завярнулі назад машыну сыроў сталічнай вобласці, а ў Мінскую вобласць не пусцілі партыю «Савушкіна прадукту». Як кажуць, «за что боролись». І вось у гэтай барацьбе вытворцаў інтарэсы спажыўцоў, бывае, зусім забываюцца. Але ж і мы, спажыўцы, трэба прызнаць, паказваем сваю поўную пасіўнасць. Зараз ёсць рычагі, праз якія можна ўздзейнічаць на любую гандлёвую фірму. Тыя ж кнігі заўваг і прапаноў. А вось у Моталі і навакольных вёсках знайшлі яшчэ больш дзейсную форму. На раённым сходзе Іванаўскага спажывецкага таварыства вяскоўцы сказалі, што не хочуць больш мірыцца з асартыментнай аднастайнасцю, калі ў іх магазіне гандлююць толькі мотальскай каўбасой. І цяпер у Моталі ды іншых навакольных вёсках прадаюцца каўбасы з Брэста, Бярозы, Пінска.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

А на мой погляд...

«ПРЫ ЖАДАННІ МОЖАМ НАБЫЦЬ ПРАДУКЦЫЮ ЛЮБЫХ ВЫТВОРЦАЎ — І МЯСЦОВЫХ, І З ІНШЫХ РЭГІЁНАЎ»

Даўно мінулі часы, калі, едучы ў вёску, трэба было везці з сабой бохан смачнага хлеба, кілаграм—другі якаснай каўбасы ці замарожаную тушку птушкі. Цяпер жа, маючы грошы, практычна ў любым населеным пункце можна купіць якія заўгодна прысмакі. Праўда, раз-пораз чытачы скардзяцца ў газету, маўляў, чаму нас прымушаюць набываць прадукцыю толькі мясцовых вытворцаў, па розных прычынах забараняючы пастаўкі прадпрыемстваў з іншых раёнаў ці абласцей.

А вам асабіста даводзілася сутыкацца з сітуацыяй, калі ў мясцовым гандлі не ўдавалася набыць жаданыя тавары (прадукты харчавання, іншае) ад вытворцаў з іншых рэгіёнаў?

Люцыя ПАЛАЎЧЭНЯ, пенсіянерка з вёскі Жыліхава Капыльскага раёна:

— Я з такімі праблемамі не сутыкалася. Кожны тыдзень у сераду ў нас працуе кірмаш. Прадпрымальнікі прывозяць на продаж мясапрадукты, каўбасныя вырабы слуцкай, слонімскай, сноўскай вытворчасці. Заўсёды можна знайсці мінскі маянэз, маргарын, часам — сталічны хлеб. Хлебабулачныя вырабы возяць і са Слуцка, але па большасці яны мясцовыя, іх якасць мяне ў прынцыпе задавальняе. У магазінах даволі вялікі выбар малочнай прадукцыі мясцовай жа вытворчасці: малака, смятаны, тварагу, сыра.

Васіль БОЛСУН, начальнік упраўлення кантролю за падакцызнымі таварамі Міністэрства па падатках і зборах:

— Шчыра скажу, што ніколі з такой праблемай не сутыкаўся. Прынамсі, калі гаварыць пра Мінск, дзе столькі магазінаў, у якіх вялікі асартымент любой прадукцыі. Ды і наогул я тут прытрымліваюся меркавання: ну няма, напрыклад, брэсцкага малака, дык я вазьму мінскае. Прадукцыя сталічных прадпрыемстваў нічым не горшая.

Ала ДУДКІНА, начальнік сектара апекі аддзела адукацыі Рэчыцкага райвыканкама:

— Неяк у зімовы час быў перыяд, калі ў гандлі пераважала малочная прадукцыя мясцовай вытворчасці. Але, падкрэслю, можна было знайсці магазіны, дзе былі малочныя вырабы і іншых вытворцаў. Так, у раёне імкнуцца падтрымліваць мясцовых вытворцаў — той жа малаказавод, камбінат па мясаперапрацоўцы, але ў прыватных крамах заўсёды можна знайсці прадукцыю з Брэста, Віцебска, Пінска. Тое ж датычыцца іншых, нехарчовых тавараў — у Рэчыцы, у Гомелі на рынках заўсёды ёсць выбар.

Віктар СВЁКЛА, старшыня Шчорсаўскага сельсавета Савета дэпутатаў Навагрудскага раёна:

— Пра памянёную вамі праблему (што яна існуе ў пэўных рэгіёнах) асабіста я ведаю толькі па публікацыях у сродках масавай інфармацыі. На ўласным вопыце з такой сітуацыяй мне сутыкацца не даводзілася. Калі такія факты недзе маюць месца, лічу, што дзяржава ад такіх абмежаванняў нічога не выіграе, наадварот, толькі згубіць. Думаю, што чалавек у любым горадзе, вёсцы краіны павінен мець магчымасць набываць прадукцыю любога вытворцы, дзе б ён ні працаваў — у сваёй вобласці ці ў суседняй. У нас гэтых абмежаванняў няма — мясная прадукцыя прадстаўлена слонімскімі, гродзенскімі вырабамі, хлеб пераважна мясцовы (добрай якасці і неблагога асартыменту), але можна набыць і мінскі ў індывідуальных прадпрымальнікаў. Малочныя прадукты таксама мясцовыя, але, калі хто жадае, заўсёды знойдзе і вядомыя брэсцкія тавары.

Наталля КАРАГОДА, аператар ЭВМ філіяла Драгічынскага раённага спажывецкага таварыства «Каапнарыхтпрам»:

— Ведаеце, мы трымаем уласную гаспадарку, таму мяса, малако ў нас сваё. Хлеб набываем, так. Ёсць і драгічынскі, і кобрынскі, можна набыць і мінскі. Няма, на мой погляд, праблем і з іншымі рэчамі — калі не ў магазіне, дык на рынку можна набыць тавар практычна любога айчыннага вытворцы.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

Для сталіцы «рэгіянальная дыскрымінацыя» не характэрна

Апошнім часам многа размоў вядзецца вакол дыскрымінацыі айчынных харчовых тавараў па рэгіянальнай прыкмеце. Маўляў, мясцовыя ўлады практыкуюць тайную забарону на пастаўку прадуктаў з іншых абласцей. У выніку «крайнім» застаецца спажывец, у якога адымаюць права выбару.

Найбольш актыўна сваю незадаволенасць сітуацыяй выказвалі мясаперапрацоўшчыкі, якія вясной сутыкнуліся з сур'ёзнай праблемай збыту. Першапачаткова толькі тры прадпрыемствы галіны атрымалі дазвол на экспарт сваёй прадукцыі ў Расію. Астатнім давялося рэалізоўваць усе свае аб'ёмы ў межах краіны. З улікам таго, што доля вывозімай у Расійскую Федэрацыю прадукцыі ў некаторых перапрацоўшчыкаў дасягала 50 працэнтаў, канкурэнцыя на ўнутраным рынку абвастрылася да максімуму. Актыўна пачала мусіравацца тэма рэгіянальнай дыскрымінацыі вытворцаў. Сітуацыя крыху разрадзілася пасля таго, як у сярэдзіне мая спіс мясаперапрацоўчых прадпрыемстваў з правам адгрузкі сваёй прадукцыі на расійскі рынак пашырыўся да 15. Цяпер расіяне могуць ласавацца мяснымі далікатэсамі Бярозаўскага, Барысаўскага, Ваўкавыскага, Гродзенскага, Слонімскага, Пінскага, Віцебскага, Глыбоцкага, Мінскага мясакамбінатаў, а таксама прадукцыяй двух ІП — віцебскага «Глобан» і брэсцкага «Белдэнсан» і СП «Еўрарэйд». Чакаецца, што спіс беларускіх экспарцёраў мясаперапрацоўчай галіны ў Расію будзе працягваць папаўняцца.

Даказаць наяўнасць тайных забарон на ўвоз «чужой» прадукцыі ў пэўны рэгіён складана. Адсутнасць на паліцах мясцовых магазінаў прадуктаў з суседніх раёнаў і абласцей можа быць выклікана аб'ектыўнымі прычынамі (сабекоштам тавару, абмежаванасцю тэрмінаў рэалізацыі, магчымасцю хутка папоўніць асартымент і г.д.).

— Айчынныя перапрацоўшчыкі сёння выраблюць да 10 тысяч найменняў харчовай прадукцыі. Натуральна, у магазіна з гандлёвай плошчай 150 квадратных метраў няма рэальнай магчымасці прадставіць на сваіх паліцах усе 10 тысяч, — заявіла начальнік упраўлення арганізацыі спажывецкага рынку Міністэрства гандлю Любоў Язэпчык. Сярод вытворцаў вызначаюцца лідары, чыю прадукцыю спажыўцы заўсёды хочуць бачыць на прылаўках. Менавіта яе і заказваюць гандлёвыя пункты. У нашых эканамічных умовах сёння паміж перапрацоўшчыкамі ідзе вострая канкурэнтная барацьба. І гэта толькі на карысць спажыўцу.

Меней за ўсіх размовы пра дыскрымінацыю вытворцаў датычацца Мінска. У сталічных магазінах і на харчовых рынках можна знайсці літаральна ўсё, што вырабляецца ў краіне. Калі нечага няма ў адным гандлёвым пункце, яно абавязкова адшукаецца ў іншай. Сапраўды, дэфіцыт плошчы абмяжоўвае магчымасці прадаўцоў прадставіць на сваіх паліцах усе вобласці, аднак да гэтага можна імкнуцца. Што датычыцца менавіта мясаперапрацоўчай галіны, у сталіцу завозяць ласункі Бярозаўскага, Віцебскага, Барысаўскага, Ашмянскага, Глыбоцкага, Гродзенскага і іншых мясакамбінатаў. Калі не хочаце збіваць ногі ў пошуках тавару канкрэтнага вытворцы — завітайце на Камароўскі рынак. Там абавязкова знойдзецца ўсё патрэбнае. Прыкладна такая ж сітуацыя і па іншых групах харчовых тавараў. Асабіста мне вельмі падабаецца рысавы пудзінг вытворчасці «Савушкін-прадукт». Некалькі разоў я «ўпільноўвала» яго ў сваім універсаме ў «спальным» раёне, потым ён знік з паліц. Пацікавілася ў прадаўцоў — высветлілася, што ў нашым магазіне ён не карыстаецца попытам, таму заяўку на яго знялі. А вось іншая прадукцыя таго ж «Савушкіна» прадстаўлена даволі шырокім асартыментным пералікам. Не ў кожным магазіне сталіцы заўсёды бывае піва брэсцкай ці рэчыцкай вытворчасці, аднак пры жаданні яго знайсці можна.

Сталічнай сістэме гандлю, безумоўна, ёсць што ўдасканальваць і над чым працаваць, аднак рэгіянальная дыскрымінацыя вытворцаў харчовых тавараў ёй не ўласціва.

Інга МІНДАЛЁВА.

РЫНАК ІНШАГА РЭГІЁНА ТРЭБА НЕЧЫМ «ЗДЗІВІЦЬ»

Сярод вялікай колькасці рознай дакументацыі ў дырэктара гродзенскага ўніверсама «Планета» Марыі Кунцэвіч ёсць сшытак, з якога яна пачынае кожны рабочы дзень. У ім — зместкі літаральна па кожнай пазіцыі скорапасавальных прадуктаў харчавання, якія аператыўна абнаўляюцца па меры іх продажу. Шматгадовы вопыт дазваляе Марыі Леанідаўне граматна фарміраваць заяўкі і па колькасці, і па асартыменту тавараў. Тым не менш сітуацыя са скорапасавальнай прадукцыяй у яе пад пастаянным кантролем: колькі ў наяўнасці таго ж малака, тварагу, каўбас? Калі заканчваецца тэрмін іх рэалізацыі?

Знаёмства з прылаўкамі гэтага ўніверсама пераканаўча паказвае, што ніякіх абмежаванняў у адносінах да вытворцаў з іншых рэгіёнаў не існуе. «Наш дэвіз: кожнаму пакупніку — шырокі выбар тавараў і высокая культура абслугоўвання», — гаворыць Марыя Кунцэвіч.

І сапраўды, са сваімі вырабамі прадстаўлены і гродзенскія мясаперапрацоўшчыкі, і іх калегі са Слоніма, Ліды, Ашмянаў, Ваўкавыска, Бярозы, Кобрына, СВК імя Дзеншчыкова... Малочныя прадукты таксама прывозяць не толькі з ААТ «Гродна Малкамбінат» і іншых прадпрыемстваў вобласці, але і з Мінска, Брэста, Гомеля. Аналагічна і з півам, гарэлкай, віном, мінеральнай вадой, безалкагольнымі напоямі — магазін супрацоўнічае з вытворцамі і гродзенскага рэгіёна, і сталіцы, Бабруйска, Віцебска, Клімавічаў...

Гэта, канешне, не азначае, што ўніверсам возьме ўсё, што яму прапануюць на рэалізацыю. Па-першае, гэта пры ўсім жаданні немагчыма (асартыментны пералік проста каласальны), а па-другое, гандлёвае прадпрыемства абавязана пралічваць усе плюсы і мінусы. І для пакупніка, і для сябе.

— Калі, скажам, аднолькавае рагу з агародніны вырабляюць у нашым рэгіёне і ў іншай вобласці, то магазіну з улікам транспартных расходаў на яго дастаўку і, адпаведна, цаны продажу больш выгадна гандляваць мясцовай прадукцыяй, — тлумачыць Марыя Кунцэвіч. — Іншая справа, калі прапануецца тое, што не вырабляецца ў нас, і мы ўпэўнены, што на гэты тавар будзе попыт. Тады мы павінны перш за ўсё ўлічваць інтарэсы пакупнікоў, каб у іх быў як мага больш шырокі выбар. Рынак іншага рэгіёна трэба нечым «здзівіць».

А як у іншых гандлёвых пунктах? Мяркуючы па прылаўках, мясцовая прадукцыя ніякіх прывілей перад іншай не мае. Да прыкладу, на рынку «Карона» гродзенская мясапрадукцыя на роўных умовах канкуруе з вырабамі прадпрыемстваў Ліды, Ашмянаў, Ваўкавыска, Мінска, Магілёва, Бярозы, Брэста, Драгічына, Кобрына, Слуцка, Маладзечна... Сыры — не толькі з Гродна, але і са Шчучына, Мінска, Брэста, Кобрына, Оршы...

Многія прадпрыемствы з іншых абласцей рэспублікі ўжо маюць на Гродзеншчыне свае прадстаўніцтвы, філіялы, рэгіянальныя склады: «Белрыба» (Мінск), «Конфа» (Маладзечна), «Ўкон» (Івянец), «Віцьба» (Віцебск), «Слодыч» (Мінск), «Інка-бел» (Брэст), піўзаводы «Аліварыя» і «Крыніца» (Мінск), «Брэсцкае піва», «Вейнянская крыніца» (Магілёў), «Камака плюс» (Барысаў) і іншыя.

Тое, што кіраўніцтвам гандлёвых прадпрыемстваў прымаюцца неабходныя меры па забеспячэнню бесперабойнага гандлю асноўнымі відамі харчовых тавараў не толькі мясцовай вытворчасці, але і прадпрыемстваў іншых рэгіёнаў вобласці і рэспублікі, пацвердзіла нядаўняя праверка Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці. Разам з тым былі ўстаноўлены і некаторыя парушэнні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб процідзеянні манапалістычнай дзейнасці і развіцці канкурэнцыі». У асартыментных пераліках гандлёвых прадпрыемстваў абласнога цэнтра па ўзгадненню з упраўленнем гандлю і паслуг гарвыканкама была ўстаноўлена абавязковасць наяўнасці ў продажы тавараў асобных мясцовых вытворцаў шляхам уключэння колькасці найменняў іх прадукцыі. У прыватнасці, асартыментным пералікам тавараў гандлёвага прадпрыемства «Брэст» быў прадугледжаны продаж пяці найменняў рыбы вэнджанай і вяленай толькі вытворчасці ААТ «Гроднарыба», шасці найменняў пячэння аўсянага і пясочнага, а таксама шасці найменняў пернікаў — толькі «Гроднахлебпрама». Упраўленнем гандлю і паслуг гарвыканкама гэта матывавалася пісьмовымі просьбамі прадпрыемстваў. Аднак такія дзеянні, лічыць Камітэт дзяржкантролю, сведчаць аб дасягнутых прагадненнях дзяржаўнага органа з суб'ектамі гаспадарання, якія перашкаджаюць свабоднаму доступу на таварны рынак вытворцаў харчовых тавараў з іншых рэгіёнаў вобласці і рэспублікі, што мае альбо будзе мець сваім вынікам абмежаванне канкурэнцыі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ПАКУПНІК ВЫБІРАЕ

Мясцовая ўлада хоча, каб прадпрыемствы на тэрыторыі падкантрольнага ёй раёна працавалі стабільна, і гэта зразумела. Людзі маюць працу, а ў бюджэт паступаюць грошы ад падаткаў. Але ж любое прадпрыемства будзе працаваць з прыбыткам, калі на яго прадукцыю ёсць попыт, а калі няма, то ўзнікаюць вялікія праблемы. Улада імкнецца падтрымаць свае прадпрыемствы, дапамагчы ім выстаяць у канкурэнтнай барацьбе за спажыўца і часта гэта рабілася ды і робіцца незаконнымі сродкамі, хоць даказаць гэта даволі цяжка. А найбольш вострая канкурэнцыя разгарнулася паміж прадпрыемствамі харчовай прамысловасці, якія імкнуцца рэалізаваць сваю прадукцыю дзе толькі можна.

Учора

Ляхавіцкі малочны завод праславіўся

ІНВЕСТЫЦЫІ Ў ПРЫГАЖОСЦЬ

Добраўпарадкаванне «пацягнула» на 3 млрд рублёў

Прыгажосць гарадоў і вёсак — справа даволі затратная, але кожны разумее яе неабходнасць, і грошы на гэта знаходзяць. Галоўнае — укласці іх з розумам, тады і належны камфорт для жыхароў удасца стварыць. Раней, кажучы пра «гарадскія» ўмовы, часцей за ўсё ўзгадвалася сталіца ці абласныя цэнтры; глыбінка да такога ўзроўню ў шэрагу выпадкаў яўна не дацягвала. Зараз сітуацыя змянілася — асобныя райцэнтры па добраўпарадкаванню могуць на роўных спаборнічаць з еўрапейскімі гарадамі.

У цэнтральным рэгіёне ў гэтым плане адным з такіх «прыкладаў для пераймання» з'яўляецца Валожынскі раён. Адразу два тутэйшыя населеныя пункты (уласна сам райцэнтр, а таксама гарадскі пасёлак Івянец) кожны ў сваёй падгрупе па выніках мінулагодняга абласнога конкурсу па добраўпарадкаванню занялі першае месца. У чым жа сакрэт?

— Ды няма ніякіх асаблівых сакрэтаў, — усміхаецца старшыня Валожынскага райвыканкама Іван Маркевіч. — Усё зроблена сваімі рукамі, у людзей з'явілася зацікаўленасць у тым, каб добраўпарадкаваць наваколле. Гэта, мабыць, адзін з галоўных вынікаў рэалізацыі сур'ёзнай праграмы па навядзенню парадку на зямлі. Кожны тыдзень у райвыканкаме збіраецца спецыяльны штаб, дзе мы грунтоўна аналізуем правядзенне работ па добраўпарадкаванню. Апошнім часам Валожынскі край значна папрыгажэў. За апошнія тры гады на правядзенні добраўпарадкавання было асвоена каля 3 мільярдаў рублёў. Сёлета, як плануецца, адпаведныя выдаткі складуць 1,5 млрд рублёў. Гэта апраўданыя ўкладанні, сапраўдныя інвестыцыі ў прыгажосць. Заўсёды трэба задумвацца не толькі над тым, каб цяпер стварыць належны камфорт, а і над тым, што мы пакінем сваім дзецям і ўнукам.

Старажытны Валожын (упершыню горад узгадваецца ў 1400 годзе) апошнім часам быццам бы памаладзеў. Усе работы па добраўпарадкаванню пачалі з гістарычнага цэнтра: галоўны сквер зараз выглядае вельмі рамантычна — тут устаноўлены прыгожыя лаўкі і дэкаратыўныя свяцільні. Гэта ў мясцовых жыхароў, бадай, адно з самых любімых месцаў адпачынку і сустрэч. Дарэчы, добрая «падсветка» ёсць па ўсім горадзе, так што ўвечары Валожын ніколькі не губляе свайго шарму, а, наадварот, становіцца яшчэ больш загадкавым і таямнічым. Усяго на вуліцах, паведаміў начальнік аддзела жыллёва-камунальнай гаспадаркі Валожынскага райвыканкама Якаў Дабрахотаў, штовечар запальваюць больш за сотню ліхтароў, у якіх (патрэба часу!) «эканомныя» лямпачкі.

Тратуарнай пліткай ужо «акультурылі» дзесятак вуліц, работа працягваецца і далей. Гарадскія «стрыт» афармляюцца з вялікім густам: паўсюль цікавыя так званыя «малыя архітэктурныя формы», альпійскія горкі, прыгожыя фасады дамоў і шмат чаго яшчэ.

Асобна — пра кветкі. Пакуль яшчэ халаднавата, а як пацяплее, то Валожыншчына будзе літаральна патанаць у жывых фарбах, і так да позняй восені. У мінулым годзе ў райцэнтры было высаджана 12 тысяч кветак і 520 дэкаратыўных дрэў, сёлета будзе не менш.

Анатоль Яныш — карэнны валожынец. Яго продкі па матчынай лініі, як ён падлічыў, жылі тут яшчэ трыста гадоў таму. Цесць Яныша ўжо дзевяты дзесятак размяняў, стары ўзгадвае, як было «за Польшчай» і кажа, што такой прыгажосці, як зараз, і не ўспомніць. Анатоль Альбінавіч параўноўваў Валожын з тымі мясцінамі, дзе выпадала бываць (з украінскай сталіцай, прыбалтыйскімі гарадамі), і лічыць, што родны горад шмат у чым выйграе. У першую чаргу праз удалае спалучэнне гістарычных каштоўнасцяў і сучасных архітэктурных рашэнняў. Валожын і ў савецкі час быў вельмі «зялёным», аднак будынкі зусім не песцілі вока. А зараз — усё гарманічна.

Чым яшчэ прывабліве старажытны горад? Што адразу кідаецца ў вочы, дык гэта дагледжанасць тэрыторый вакол шматкватэрных дамоў. Такія дворы і ў сталіцы не паўсюль убачыш. Вакол дамоў робяцца сучасныя спартыўныя і дзіцячыя пляцоўкі, дзе малыя заўсёды могуць знайсці занятак па душы. Па-добраму пазайздросціў дзецям і іх бацькам, паколькі ў маім дворы (каля двух вялікіх дзевяціпавярховікаў) ёсць толькі адны (!) арэлі. У Валожыне ж сёлета дадаткова плануецца абсталяваць яшчэ 3 спартыўныя і 4 дзіцячыя пляцоўкі.

Хутка ў горадзе з'явіцца сапраўдны цэнтр адпачынку — зараз ідзе рэканструкцыя мясцовага кінатэатра «Юнацтва», правядзенне работ «пацягне» на 1,2—1,3 мільярда рублёў. Тут плануецца зрабіць вялікую залу (на 430 месцаў), добры «танцпол», кафэ. Актыўны ўдзел у навядзенні парадку на зямлі бяруць прадпрыемствы — летась яны выдаткавалі на гэтыя патрэбы 280 мільёнаў рублёў. Як адзначыў старшыня Савета дырэктараў Валянцін Трушко, за апошні час агульнымі сіламі праведзена комплекснае добраўпарадкаванне 59 шматкватэрных жылых дамоў, на чарзе — тэрыторыя прыватнага сектара.

— Добраўпарадкаванне ніколькі не прыпыняецца, а, наадварот, толькі набірае тэмпы, — заўважыў Іван Маркевіч. — Гэта датычыцца ўсяго раёна, дарэчы, аднаго з самых буйных на Міншчыне — на яго тэрыторыі 428 вёсак. Разам з сельсаветамі, кіраўнікамі гаспадарак мы і тут наводзім парадак. Пра вёскі нельга забываць, тут няпростая сітуацыя, паколькі сярод жыхароў шмат пенсіянераў. Асобным з іх ужо проста не па сілах нешта зрабіць на ўласным падворку, састарэлым трэба дапамагаць. Таму ў вёсках створаны спецыяльныя брыгады, якія наводзяць належны парадак.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Валожынскі раён.



Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

ЗАМЕСТ «ДРУЖБЫ»

Расія пабудуе новы нафтаправод

Старшыня расійскага ўрада Міхаіл Фрадкоў падпісаў днямі распараджэнне аб адабрэнні прапановы Мінпрамэнерга Расіі і кампаніі «Транснафта» па праектаванню нафтаправода ў абход Беларусі.

Афіцыйная назва нафтаправода — Балтыйская трубаправодная сістэма-2. Яна павінна быць пабудавана ад Унечы (Бранская вобласць) да Прыморска (Ленінградская вобласць) і стане альтэрнатывай нафтаправоду «Дружба», які праходзіць па тэрыторыі Беларусі і па якому ажыццяўляецца транспарціроўка расійскай нафты на беларускія НПЗ і ў краіны Еўропы.

У распараджэнні Міхаіла Фрадкова ўтрымліваецца даручэнне Мінпрамэнерга Расіі пры ўдзеле кампаніі «Транснафта» «забяспечыць падрыхтоўку ва ўстаноўленым парадку неабходнай дакументацыі па будаўніцтву» БТС-2. Расбуду даручаецца «забяспечыць з удзелам зацікаўленых федэральных органаў выканаўчай улады правядзенне ва ўстаноўленым парадку дзяржаўнай экспертызы дакументацыі» па будаўніцтву.

Сёння праз участак нафтаправода «Дружба» ва Унечы пракачваецца прыкладна 100 млн тон нафты ў год. 20 млн ідуць на беларускія НПЗ, 80 — еўрапейскім краінам. Кіраўніцтва кампаніі «Транснафта» заяўляе, што магутнасць БТС-2 павінна скласці ад 50 да 80 млн тон нафты ў год, а прыкладны тэрмін будаўніцтва новага нафтаправода складзе паўтара года.

Сяргей КУЗНЯЦОЎ.

ПОДЗВІГ РАЗВЕДЧЫКАЎ

Супрацоўнікі Магілёўскага і Гомельскага ўпраўленняў КДБ ушанавалі памяць байцоў атрада спецыяльнага прызначэння «Слаўны», які дзейнічаў на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Пра гэта паведаміла прэс-група УКДБ па Магілёўскай вобласці.

У 1943 годзе атрад «Слаўны» быў сфарміраваны з супрацоўнікаў органаў дзяржбяспекі. Ён знаходзіўся ў тыле групы нямецкіх армій «Цэнтр» і збіраў разведвальную інфармацыю, учыняў дыверсіі на транспартных магістралях, граміў невялікія вайсковыя гарнізоны. База атрада знаходзілася ў балотах Клічаўскага раёна, паблізу вёскі Усакіна.

Яшчэ доўгія гады пасля вайны дзейнасць «Слаўнага» заставалася таямніцай: яе хавалі не толькі архівы КДБ, але і цяжкапраходныя балоты Клічаўшчыны. І толькі ў 1997 годзе ва ўрочышчы Верамейкі на месцы базы, дзе пахаваны 21 баец атрада, быў створаны мемарыяльны комплекс.

Супрацоўнікі КДБ, прадстаўнікі мясцовых уладаў, школьнікі пабывалі ва ўрочышчы разам з ветэранамі «Слаўнага». Зінаіда Шабан і Аляксей Піменаў, нягледзячы на паважны ўзрост, прайшлі два кіламетры па лясной гаці, каб пабываць на магілах аднапалчан, ускласці кветкі і вянкі.

Алена КАЗЛОВА.

Ведай нашых

БІЗНЭС ПА-БЕЛАРУСКУ: ПОГЛЯД З-ЗА МЯЖЫ

На днях знаёмы прынёс у рэдакцыю рускамоўную газету. Называецца «Новое русское слово». — «На, — кажа, — паглядзі. У Іспаніі куплена. Тут інфармацыя пра краіны былога Савецкага Саюза. Нават пра вашу «Дарыду» і яго заснавальніка Уладзіміра Дзялендзіка вялікі артыкул...»

Журналісцкая цікаўнасць хутка прасвятліла сітуацыю. У мяне на стале — штотыднёвая газета на 24 старонках фармата А2, з агульным тыражом 150 тысяч экзэмпляраў. Зарэгістравана ў Расійскай Федэрацыі ў сакавіку 2006 года. Друкуецца ў краінах Заходняй Еўропы, СНД, Германіі, распаўсюджваецца ў Балтыі...

Адразу скажу, што ў агульным кантэксце нумара, у якім, напрыклад, на поўную моц распавядаецца аб колішніх ўзаемаадносінах Пуціна і Беразоўскага падчас «разборак» ад перадачы тэлекампаніі ГРТ у дзяржаўныя рукі, ці падрабязнасці палітычнай сітуацыі ў Грузіі, ва Украіне, альбо ў Малдове, інфармацыйнае «вяшчанне» пра Беларусь пададзена практычна без намёкаў на палітыку. Станоўчы імідж Беларусі пададзены праз фірму «Дарыда» — цяперашняга лідара на айчыннym рынку па выпуску мінеральнай і пітной вады, газаваных напіткаў і яго першага заснавальніка Уладзіміра Дзялендзіка. На нядаўнім футбольным матчы ў Кунцаўшчыне я запытаў Уладзіміра Віктаравіча аб «рэкламнасці» гэтай публікацыі. Спадар Дзялендзік, які ўжо каторы год запар паспяхова працуе на дэпутацкай ніве, заставаючыся старшынёй праўлення футбольнага клуба «Дарыда» і спонсарам шматлікіх мерапрыемстваў, якія адбываюцца ў Мінскім раёне, катэгарычна заявіў, што ніякіх заказных артыкулаў на захад ён не пасылаў і тым больш не заказваў.

Але ж вернемся да бізнэс-тэмы, са шматзначным загалоўкам «Клады трэба шукаць на глыбіні 387 метраў». Сэнс яго тлумачыцца радком вышэй. «Героя гэтага артыкула Уладзіміра Дзялендзіка Прэзідэнт Лукашэнка назваў «сялянскім мужыком». Схітрыў...» — гэта падагаловак матэрыяла. Верагодна, што ў поўнай перадрукоўцы «іспанскага» матэрыялу аб «Дарыдзе» няма патрэбы, бо на старонках «Звязды» нямала інфармацыі ўжо друкавалася. Таму лагічней будзе скарыстаць вытрымкі артыкула, захаваўшы пры гэтым цэласнасць і агульны сэнс матэрыялу.

Уся справа ў футболе...

«Футбол, канешне, не такі папулярны від спорту, як, скажам, хакей. Але Уладзімір Дзялендзік любіць з самага дзяцінства менавіта футбол. Любіць з таго часу, як у 1950-х ганяў мяч на зарослым бур'яном полі ў вёсцы Зажэвічы Мінскай вобласці. І калі працаваў кінамеханікам у Салігорску, а потым слесарам на мінскіх заводах, і калі вучыўся на эканаміста ў Кіеўскім універсітэце — ён не пераставаў моцна любіць футбол, а не тэніс, горныя лыжы ці рыдлёўку. А калі Уладзімір Віктаравіч стаў гендырэктарам унітарнага прыватнага прадпрыемства «Дарыда», якое выпускае аднайменную мінеральную ваду, яго гарачае пачуццё да футбола знайшло ўрэшце ўвасабленне ў рэальных справах.

Спачатку плуг, потым парламент...

Менавіта так, а не інакш, можна назваць узыходжанне Уладзіміра Дзялендзіка па службовай лесвіцы, перафразуючы выраз аднаго літаратурнага персанажа...

«У нас у парламенце няма бізнэсменаў, — заявіў аднойчы Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. — Адзін толькі сельскі бізнэсмен Дзялендзік, які ваду штампуе. Дык ён выйграў парламенцкія выбары толькі дзякуючы таму, што інвестуе ў людзей, і спартыўную каманду ўтрымлівае, і базу будуе. Ну, такі вось ён сялянскі мужык».

Аб «Дарыдзе»

«Прадпрыемства «Дарыда» было ўтворана ў 1992 годзе практычна адразу пасля развалу Савецкага Саюза. За кароткі тэрмін яно стала адным з лідараў сярод вытворцаў прахаладжальных напіткаў у Беларусі. Сёння кампанія займае больш за 60 працэнтаў рынку безалкагольных напіткаў, больш за 15 працэнтаў у агульным аб'ёме рэалізацыі складае экспарт, у асноўным у краіны Балтыі і Расію.

Вада «Дарыды» ўжо зацікавіла палякаў. Аднак для таго, каб прабіць па-сапраўднаму шырокую дарогу на самы «смачны» — расійскі рынак, не хапае нават палітычнай вагі Дзялендзіка. Лобі «Нарзана» і «Есентукоў», нават кантрафактных, яму перамагчы не ўдаецца і даводзіцца задавольвацца пакуль тым, што расійскі рынак для «Дарыды», па крайняй меры, крыху прыадчынены.

У 2004 годзе мінеральная вада «Дарыда» праходзіла выпрабаванні на адпаведнасць еўрапейскім стандартам якасці (больш за 300 аналізаў і тэстаў) і ў пачатку 2005 года была афіцыйна прызнана натуральнай мінеральнай вадой. Зараз гэта першая і адзіная мінеральная вада беларускай вытворчасці, якая стала прызнаным прадуктам на еўрапейскім рынку. Сёння гандлёвая марка «Дарыда» ўваходзіць у дзесятку самых вядомых брэндаў Беларусі...

Футбол — яго другое жыццё

«Спансіраваць футбольныя каманды Дзялендзік пачаў даўно. Як толькі сродкі дазволілі, пачаў падтрымліваць беларускім рублём міні-футбольную каманду. Але праз некаторы час «Ніва» пераехала ў Дзяржынскі раён, і старшыня Мінскага райвыканкама Леанід Русак задаў лагічнае пытанне: «Навошта нам спансіраваць клуб Дзяржынскага раёна, калі мы можам утрымліваць свой?» Так з'явілася ждановіцкая «Дарыда».

Яшчэ некалькі гадоў таму на месцы стадыёна «Дарыда» касілі траву і пасвілі кароў. Дзялендзік у сцісліх тэрміны змог узвесці спартыўнае збудаванне, якое ёсць не ва ўсіх клубаў вышэйшай лігі....

А нядаўна Уладзімір Дзялендзік запрасіў на месца трэнера каманды Анатоля Байдачнага, былога галоўнага трэнера нацыянальнай зборнай Беларусі... Дзялендзік мае намер падрыхтаваць сваіх футбалістаў, а не купляць за вялікія грошы легіянераў, якія мяняюць клубы як пальчаткі.

Мецэнацтва — справа тонкая...

«Увогуле беларускі спорт для Дзялендзіка — асобная і хворая тэма. Як дэпутат змагаўся з усіх сіл супраць таго, каб наведванне спартыўных секцый стала для дзяцей платным. «У нас пакуль не такая багатая дзяржава, каб дазваляць сабе гэтую раскошу, — сказаў тады Дзялендзік. — І пры такім стаўленні да справы ніколі і ніякага спорту ў нас не будзе».

Спонсарства для Беларусі — тэма складаная. Пры прагрэсіўнай падатковай шкале, якая дзейнічае ў краіне, мецэнацтвам займацца неяк не з рукі, прадпрыемства аддае спорту свой асабісты прыбытак ва ўрон уласнаму развіццю. Дзялендзік прасоўвае законапраект, па якому падатак на прыбытак змяншаецца на тую суму, якую прадпрымальнік інвестуе ў дабрачынны праект. Прыкладна такая ж схема, што існуе ў многіх еўрапейскіх краінах. Пры гэтым Дзялендзік лічыць, што да падобных праектаў, якія знікаюць падатак, можа адносіцца не толькі будаўніцтва царквы, бібліятэкі ці бальніцы, але і, напрыклад, пакупка дарагога легіянера для нацыянальнай зборнай. Чаму? «Прэстыж нацыі — гэта палёт на Месяц і залаты алімпійскі медаль», — сказаў прэзідэнт Кенадзі. Уладзімір Дзялендзік з гэтым поўнасцю згодны».

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

Крымінал

ЗАБОЙЦА АСУДЖАНЫ ДА РАССТРЭЛУ

Па прыгавору Вярхоўнага суда Беларусі, які быў 22 мая абвешчаны ў Гродне, былы старшы лейтэнант міліцыі, камандзір роты райаддзела дэпартамента «Ахова» МУС Аляксандр Сяргейчык асуджаны да выключнай меры пакарання — расстрэлу.

Судова-псіхіятрычнай экспертызай пярэварацень у пагонах, якога арыштавалі ў лютым мінулага года, быў прызнаны пры свядомасці. Крымінальная справа налічвае сорак тамоў, абвінавачваннем былі прадстаўлены суду доказы па дванаццаці забойствах, а таксама іншых злачынствах.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

НАСУПЕРАК ІНТАРЭСАМ СЛУЖБЫ

Суд Бабруйскага раёна прысудзіў былому супрацоўніку міліцыі 4 гады пазбаўлення волі за злоўжыванне службовымі паўнамоцтвамі.

Як паведаміла прэс-група УКДБ па Магілёўскай вобласці, участковы інспектар міліцыі з Бабруйска працяглы час дапамагаў пазбегнуць пакарання групе асобаў, якія займаліся рэалізацыяй нелегальнага спіртавой прадукцыі. Бабруйскі гарадскі аддзел УКДБ выявіў, што капітан міліцыі за пэўнае ўзнагароджанне папярэджваў нелегальных гандляроў аб праверках і спецыяльных мерапрыемствах, якія планаваліся і праводзіліся праваахоўнымі органамі. Сваімі дзеяннямі гэты чалавек дыскрэдытаваў званне супрацоўніка міліцыі і прычыніў істотны ўрон дзяржаўным і грамадскім інтарэсам.

Алена КАЗЛОВА.

ЖЫЛЛЁ БУДУЕЦЦА, АЛЕ Ж...

Сёлета на Віцебшчыне трэба пабудаваць 1430 жылых дамоў і кватэр — у сельскай мясцовасці. У першым квартале гэтага года план выкананы толькі на 18 працэнтаў. Да такой высновы прыйшлі спецыялісты Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці, якія прааналізавалі выкананне праграмы жыллёвага будаўніцтва.

У прыватнасці, меней, чым было прадугледжана, увялі ў эксплуатацыю жылля ў Дубровенскім, Лепельскім, Лёзненскім, Сенненскім і Талачынскім раёнах... А ў сакавіку ў Гарадоцкім раёне быў здадзены ў эксплуатацыю жылы дом, будаўніцтва якога на момант праверкі завершана не было. За першы квартал для льготнай катэгорыі грамадзян пабудавана толькі 16 кватэр, а ўсяго на год плануецца 100... Пры гэтым кватэры для шматдзетных сем'яў будуюцца з апераджэннем тэмпаў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» РЕАЛИЗУЕТ:

АВТОМОБИЛЬНАЯ ТЕХНИКА

1. А/м УАЗ — 1500000-5040000 руб.
2. А/м ГАЗ — 2200000-4500000 руб.
3. А/м ЗИЛ — 2300000-5300000 руб.
4. А/м «УРАЛ» — 4000000-12000000 руб.
5. А/м КаМАЗ — 11500000-12300000 руб.
6. Трактор Т-150К — 4000000 руб.
7. Трактор ДТ-75 — 3700000-4100000 руб.
8. Прицепы и п/прицепы — 1000000-3500000 руб.
9. Автомобильные двигатели — 1100000 руб., **а также запчасти и ремкомплекты к ним — всего порядка 300 позиций.**

ИМУЩЕСТВО РАКЕТНО-АРТИЛЛЕРИЙСКОГО УПРАВЛЕНИЯ

1. Изделие 8Т311 №38737678 на ш. ЗиЛ-131 — 2800000 руб.
2. Автошасси ЗИЛ-131 — 2500000-3900000 руб.
3. Прицеп 1-П-1,5 — 125000-410000 руб.
4. Шасси 1-П-2,5 — 480000 руб.
5. Шасси 2-ПН-2 — 450000-745000 руб.
6. Агрегат питания АБ2-0/230-М1 — 290000-800000 руб.
7. Агрегат бензоэлектрический АБ-4-П/115 — 770000 руб.
8. Таль электрическая ЭТС-3200 — 600000 руб.
9. Таль электрическая г/п 5т — 950000 руб.
10. Кузов-фургон КМ66ДС — 420000 руб.
11. Кабина аппаратная от изд.9С82 — 400000 руб.
12. Электроточило ЭТ-2801 — 65000 руб.
13. Настольно-сверлильный станок НС-12А — 330000 руб.
14. Стол слесарный складной 165х65 — 70000 руб.
15. Насос БКФ-4 — 5000 руб.
16. Генератор ацетиленовый АСП-10 — 60000 руб.
17. Агрегат сварочный УДГ-301У — 350000 руб.
18. Сварочный преобразователь ПД-502 — 200000 руб.
19. Устройство зарядноразрядное УЗР-15УЗ — 82000 руб.
20. Унифицированное зарядно-распределительное устройство УЗРУ — 2100000 руб.
21. Баллон емк. 40л — 22000 руб.
22. Автокран 9Т31М на ш. УРАЛ-375 — 5600000 руб.
23. Автошасси КРАЗ-255Б — 8000000 руб.
24. Агрегат АД-10Т/230 — 750000 руб.
25. Электростанция ЭСД-2-12 на пр.2-ПН-2 — 4500000-17000000 руб.
26. Двигатель УД2 — 200000 руб.
27. Двигатель УД25Г — 150000-280000 руб.
28. Токарно-винторезный станок ИТ-1М — 7000000 руб.
29. Токарно-винторезный станок ТВ-200 — 1130000 руб.
30. Универсально-фрезерный станок 676 — 930000 руб.
31. Мастерская МРС-АР на ш. ЗиЛ-131 — 9000000 руб.
32. Мотопомпа МП-800Б — 500000 руб.
33. Отопитель ОВ-65 с кунгом КМ-131 — 900000 руб.
34. Блок питания ТБП-52 — 60000 руб.
35. Выпрямитель селеновый ВСА-5А — 10000 руб.
36. Отопительная установка ОВ-95 — 300000 руб.
37. Трансформатор 220/12В — 10000 руб.
38. Тиски слесарные — 43000 руб.
39. Наковальня с подставкой — 60000 руб.
40. МАЗ-5224В с кунгом П-10 — 2000000 руб.
41. МАЗ-5207В (ВШ) с кунгом П-6М — 1500000 руб.

ИМУЩЕСТВО ВВС И ВОЙСК ПВО

1. Авиационные двигатели — 10000000-340000000 руб.
2. Автошасси ЗИЛ-131 — 2950000-3800000 руб.
3. Прицеп бортовой СМЗ-8325 — 800000 руб.
4. Прицеп 2-ПН-2 — 950000 руб.
5. Двигатель ЗИЛ-375 — 3050000 руб.
6. Раздаточная коробка АПА-5Д — 950000 руб.
7. Кислородозатодобывающая станция АКДС-70М — 110000000-183500000 руб.
8. Автомоб. кислороднозарядная станция АКЗС-75 — 5500000-15700000 руб.
9. Аэродромный кондиционер АК/АМК — 14200000-143100000 руб.
10. Резервуар для хран.и трансп.жидкого кислорода ТРЖК-2У — 3000000 руб.
11. Заправщик углекислотный авиационный ЗУА-1000 — 2700000000 руб.
12. Газификатор сжиженных газов ГСГ-250/420 — 40250000 руб.
13. Унифицированная газозарядная станция УГЗС.МА — 57200000 руб.
14. Установка для проверки гидросистем УПГ — 18000000-123800000 руб.
15. Авиационный подвижной электроагрегат АПА — 7300000-196500000 руб.
16. Аэродромный электромоторгенератор АЭМГ-50М1 — 2450000-9230000 руб.
17. Электрогидроустановка ЭГУ — 11500000-54200000 руб.
18. Унифицированная компрессорная станция УКС-400В-П4 — 5600000-40700000 руб.
19. Воздухозаправщик ВЗ-20/350 — 11700000-11800000 руб.
20. Агрегат АБ-2/АБ-4 — 150000-1300000 руб.
21. Электростанция ЭСД 2-12 — 6550000 руб.
22. Кабель КМБп-4 — 45000 руб.
23. Электр. таль — 270000-390000 руб.
24. Подвесной топливный бак — 350000-700000 руб.
25. Костюм ВК-3М — 30000 руб.
26. Парашюты — 51000-1628000 руб.
27. Парашютно-тормозная система — 64000-618000 руб.
28. Парашютно-десантная жидкая тара — 406000 руб.
29. Редуктор хвостовой — 1200000 руб.
30. Втулка несущего винта — 6500000-57000000 руб.
31. Втулка рулевого винта — 36000000-250700000 руб.
32. Автомат перекоса — 5800000-6000000 руб.
33. Промежуточный редуктор — 18000000-27000000 руб.
34. Хвостовой редуктор — 30000000-31000000 руб.
35. Хвостовой вал — 20000000 руб.
36. Гидроусилитель КАУ — 4000000 руб.
37. Главный редуктор ВР-2 — 17000000-37300000 руб.
38. Лопасти несущего винта Ми-2 — 5000000 руб.
39. Комплект элементов металлоконструкций СРМ-10,8хОН — 18500000 руб.
40. Покрышка (шина) — 70000-150000 руб.
41. Приборы: линейки поверочные, генераторы, теодолиты, микрометры, нивелиры, контактроры, глубиномеры, реле, осциллографы и многое другое — 1300-4430000 руб.
42. Обмывочно-нейтрализационная машина — 6900000 руб.
43. Электростанция ЭСД-30-ВС/400-М2 — 4400000 руб.
44. Ручная пневматическая машина СМ-21-6-12000 — 25000 руб.
45. Пневмомолоток КМП-14 — 49000-53000 руб.
46. Пневмоерезбозавертная машина РМП-22-8-160 — 58000 руб.
47. Радиолокационная прицельно-навигационная система КУПОЛ-II-76 — 130000000 руб.

ВДС

1. Парашюты: десантные, запасные, спортивные, вышковые, ПТЛ-72 с КЗУ — 40000-90000 руб.
2. Куполы площадью: 50, 55, 83 м.кв. (без строп) — 45000-65000 руб.
3. ПГС-500 серии 2 с платформами и сотобломками — 90000 руб.
4. Подвесная система к ПГС-500 — 11000 руб.
5. Веревки вытяжные к ПГС-500 — 600 руб.
6. Мешок ПГС-500 — 1000 руб.
7. ПДСБ-1 — 50000-80000 руб.
8. Многокупольная парашютная система МКС-5-128Р в пятикупольном варианте — 2700000 руб.
9. Купола стабилизирующие парашютов Д-5 серии 2 — 8000 руб.
10. Подвесная система к парашютам Д-6 — 4000 руб.
11. Стабилизирующие системы с куполом 1,5 м.кв. к парашютам Д-6 — 7100 руб.
12. Вытяжная парашютная система ВПС-8 — 150000 руб.
13. Контейнер грузовой ГК-30Р сухопутного варианта — 14000-15000 руб.
14. Наружные наметы ПРС — 130000 руб.
15. Веревки вытяжные без предохранительных чехлов и тросов — 500 руб.
16. Веревки раскрытия к парашютам ОКС-4 — 500 руб.
17. Сумки переносные к основным/запасным/грузовым парашютам — 3000 руб.
18. Утиль капроновый — 1000 руб.
19. Парашютная платформа П-7 — 1720000 руб.
20. Парашютный прибор АД-3У-Д-165 — 2000 руб.
21. Парашютный прибор ППК-У-240А-Д — 4100 руб.
22. Светомаяки СД-02-10 — 4500 руб.
23. Жилеты спасательные САЖ-43П серии 2 — 6000 руб.

ИНЖЕНЕРНАЯ ТЕХНИКА

1. Экскаватор ЭО-2621В на ш.ЮМЗ-6КЛ тр-р 8351 — 16800000 руб.
2. Экскаватор Э-305БВ на ш.КрАЗ-255Б — 25000000 руб.
3. Экскаватор ЭО-3322Д — 57400000 руб.
4. Путепрокладчик БАТ-М на шасси АТ-Т — 78500000 руб.
5. Землеройная машина ПЗМ-2 на ш. тр-ра Т-155 — 52000000-62000000 руб.
6. Снегоочиститель ДЭ-220А на ш.ДТ-75М 19800000 руб.
7. Дизель-молот ДМ-240 — 2000000 руб.
8. Кран автомобильный КС-3572 на ш. КрАЗ-255Б — 19000000 руб.
9. Кран автомобильный КС-2561Д на шасси ЗиЛ-130 — 11000000 руб.
10. Кран автомобильный КС-3562Б на шасси МАЗ-5334А — 17500000 руб.
11. Кран автомобильный 8Т-210 на шасси УРАЛ-375 — 4500000 руб.
12. Кран автомобильный К-162М на шасси КрАЗ-257 — 10500000 руб.
13. Кран автомобильный TW-1031WL «WILHAG» — 11000000 руб.
14. Электропогрузчик ЭП-103-2,8У1,1 — 1900000 руб.
15. Самопогрузчик СП-4901 на ш. ЗИЛ-131 — 17000000 руб.
16. Электростанция ЭСД-10ВС/230-М на пр. ТАПЗ-755 — 3000000 руб.
17. Электростанция ЭСД-75ВС/230М на пр. 2-ПН-6 — 6000000 руб.
18. Электростанция АЗДС-20-М2 — 1500000-3500000 руб.
19. Катер БМК-130МЛ — 39000000 руб.
20. Звено речное ПМП — 4200000 руб.
21. Тротил в шашках по 200г — 6000000 руб.
22. Тротил в шашках по 400г — 5600000 руб.
23. Тротил в шашках по 75г с резьбовой втулкой — 7000000 руб.

БРОНЕТАНКОВОЕ УПРАВЛЕНИЕ

1. Обод с шиной (каток) — 90000 руб.
2. Коробка передач в сборе — 390000 руб.
3. Колесо ведущее 54.11сб-4Г — 70000 руб.
4. Радиатор водяной 432.31.001сб-1 — 360000 руб.
5. Электростанция ЭД-60-Т/230-1РП — 10000000 руб.
6. Танкоремонтная мастерская ТРМА-70 — 8400000-9000000 руб.
7. Танковый тягач БТС-2 — 20000000 руб.
8. Танковый тягач ИВБТ — 60000000 руб.
9. Колесо в сборе 41-3101008 КИ-80 — 150000 руб.
10. Каток в сборе 40П-3204005 — 25000 руб.
11. Балансир 54.12.2сб-6А — 20000 руб.
12. Торсионный вал 54.12.003-4А — 14000-15000 руб.
13. Амортизатор 54.14.4сб-4Б — 19500 руб.
14. Гусеница 613.44.22сб-4В — 1500000 руб.
15. Мотоцикл МВ-650М-1 — 1450000-1500000 руб.
16. Электрогазосварочная мастерская ЭГСМ-70 — 9000000 руб.
17. Мастерская ремонтно-механическая МРМ — 10000000 руб.
18. Автошасси ЗИЛ-131 с кузовом-фургоном КМ-131 — 4300000-7700000 руб.

ИМУЩЕСТВО УПРАВЛЕНИЯ СВЯЗИ

1. Кузов-фургон К-66 — 1600000 руб.
2. Кузов-фургон К1.131 — 2000000-2100000 руб.
3. Кузов-фургон К1.375 — 4500000 руб.

ХИМИЧЕСКОЕ ИМУЩЕСТВО

1. Автошасси ЗИЛ-131 с кузовом-фургоном К-131 — 4400000 руб.
2. Автошасси ЗИЛ-131 С/о силовой машины автодегазационной станции АГВ-3У — 9000000-9500000 руб.
3. Электроагрегат АБ-4-0/230-М1 — 800000-1000000 руб.
4. Электроагрегат АБ-2-0/230-М1 — 800000-1100000 руб.
5. Цистерна Ц-2 — 1100000 руб.
6. Установка ФВУА-100-Н-24Ф — 500000 руб.
7. Комплект ДК-4 — 16000-23000 руб.
8. Прибор ПРХР-А — 1500000 руб.
9. Коробка к ПМГ-2 — 1500 руб.
10. Плащ ОП-1М — 11200 руб.
11. Чулки защитные — 5100 руб.
12. Перчатки БЛ-1М — 450 руб.
13. Моноэтаноламин — 490 руб.
14. Порошок СФ-2У — 500 руб.
15. Дымовая шашка ДМ-11 — 2100 руб.
16. Ручная дымовая граната РДГ — 1000-1100 руб.
17. Щетка сб.07-8 из к-та ДК-4 — 1000 руб.
18. Ящик из под дымов — 500 руб.
19. Ящик ст. для СЗ — 1100-5000 руб.
20. Костюм Л-1 — 26000 руб.
21. Противогаз ПМГ — 7000 руб.
22. Фильтро-вентиляционный агрегат ФВА-49 — 50000 руб.

ИМУЩЕСТВО СЛУЖБЫ ГСМ

1. Установка МНУГ-10(10М) — 65000 руб.
2. Установка МНУГ-20 — 270000-1200000 руб.
3. ТЗА-7,5-5334 — 12000000 руб.
4. Резервуары — 308920-1300000 руб.
5. Бочка БСО-1-200 — 27000 руб.
6. Масла, смазки, составы пропиточные — 300000-64000000 руб.
7. Автоцистерны АЦ — 3000000-13000000 руб.
8. Автотопливозаправщики АТЗ/АТМЗ/ТЗА — 3300000-60000000 руб.
9. АКЦ-4-255БМ — 11000000 руб.
10. ППЦ-16,3-5410 — 20000000 руб.
11. ПСГ-75/160/240 — 2500000-37000000 руб.
12. ВСЗ-66 — 73500000 руб.
13. МЗ-66 — 2500000-11200000 руб.
14. ТММ-200 тягач К-701 — 47000000 руб.
15. ПНУ-200-2 — 19000000-69000000 руб.
16. Установка МНУГ-60 — 280000 руб.
17. Установка МНУРГ-60 — 450000 руб.
18. Установка МНУК-50 — 1500000-2800000 руб.
19. Установка МНУМ-14 — 850000-2270000 руб.
20. Установка МНУМ-50 — 500000 руб.
21. Прицепы-цистерны ПЦ — 900000-2500000 руб.
22. ПЦМ-6-8925 — 10000000 руб.
23. Лаборатория 8Ю-44М-1 — 240000 руб.
24. Ручной насос БКФ-4 — 6000-36000 руб.
25. АТЗ-30 — 1810000000 руб.
26. ЖД цистерна ЖКЦ-35 — 19000000 руб.
27. ЖД цистерна ЖГЦ-60 — 10000000 руб.
28. Муфта аварийная ПМТ — 21000 руб.
29. Хомут ав.1-ст. 250мм — 7000 руб.
30

Фестывалі

Б'Е ГАДЗІННІК СТАРОЙ ВЕЖЫ...

Шпацыруеш па Нясвіжы і раз-пораз чуеш раскацісты гук, які толькі спрыяе летуценнаму настрою ў гасцей. Чуеш яго і адразу разумееш, дзе знаходзішся і адкуль гэта: гадзіннік нясвіжскай ратушы лічыць хвіліны, гадзіны, дні і стагоддзі жыцця горада. І нават калі стрэлкі не рухаліся і голас у гадзінніка прапаў, ён ведаў сваё: захоўваў адзіны для горада час, які да пары ўвасабляўся ў маўклівым сведчанні спраў чалавечых. А цяпер рэхам разносіць і спалучае для людзей самыя розныя гарадскія імгненні...

Віртуозныя

Цяпер слухаць гадзіннік на ратушы ходзяць не толькі з экскурсіямі. Для аматараў музыкі тут пачаў адлічваць час «музычны гадзіннік» — яшчэ летась, калі ў ратушы адбыўся першы канцэрт. А сёлета, на фестывалю «Музы Нясвіжа» дванаццатым фестывалі, у старажытных сценах ужо нават асаблівая музычная праграма прагучала.

Канешне, цяжка ўявіць, каб у ранейшыя часы паланез Мацея Радзівіла гучаў у ратушы — ён павінен быў выконвацца ў палацы, на якім-небудзь балі. Але сёння баль там, дзе збіраюцца людзі, дзе гучыць музыка. Тых, даўніх часоў таксама. І тых творцаў, слава якіх пайшла па свеце гэтак жа, як некалі ведала Еўропа імёны Радзівілаў. Міхаіла Агінскага, напрыклад, якія ліставаўся з гаспадарамі Нясвіжскага палаца. Манюшкі і Орды, хоць яны з іншых мястэчак, але адна краіна ўсіх з'яднала. А сёння яшчэ — і нашы выдатныя музыканты. Вось хоць бы струнны квартэт, які з'яўляецца лаўрэатам конкурсу імя Агінскага. У ансамбля кларнетыстаў таксама выдатныя музыкі, як і ў ансамбля выканаўцаў на драўляных духавых інструментах, які адкрыў адмысловую Асамблею, каб іграць разам у адным канцэрце маглі знаныя віртуозы і юныя таленты, якія сёння ўслаўляюць Беларусь. І зразумела, што на пустым месцы гэта ўсё не ўзнікла, што былі папярэднікі...

Парадаксальныя

Калі раней нашы музыказнаўцы вывучалі беларускае музычнае мастацтва, то здзіўляліся таму, што небагата яго: не было вялікага музычнага пласту, як у мастацтве іншых краін тых жа стагоддзяў, а была толькі народная музыка. Гэтаму знаходзілася на той час тлумачэнне: па нашай зямлі прайшлі шматлікія знішчальныя войны. Маўляў, таму мы не маем рукапісаў музычных твораў. Доступу ў музычныя архівы іншых краін не было...

Тады так здавалася даследчыкам музыкі. Але цяпер яны кажуць, што раней было нават прасцей патрапіць у архівы іншых краін, прасцей паехаць у Маскву, Пецер, дзе шмат што захоўвалася. Зараз, калі прынятыя адпаведныя законы, не даюць нават зазірнуць, абараняючы сваё багацце. Але праблема нават не ў гэтым.

— Праблема ў тым, што многае з таго багацця мы не лічылі сваім, — сцвярджае доктар мастацтвазнаўства Вольга Дадзіёмава. — Нашу спадчыну прымалі за «не нашу». Яе сапраўды было цяжка ўключыць у кантэкст беларускай культуры. Праглядаеш нейкі твор, а на ім па-польску напісана, ніводнага беларускага слова. Але так у нейкі час павялося, што эліта і просты люд размаўлялі на розных мовах. Такая ж сітуацыя была ў Расіі, дзе вышэйшыя колы карысталіся французскай мовай, іншая справа, што расіян розных саслоўяў яднала праваслаўная царква. У нас і тут быў падзел: просты люд у большасці сваёй ішоў у царкву, князі — у касцёл. Таму мы іх лічылі чужымі і нават не разглядалі сачыненні Радзівілаў як творы, якія маюць дачыненне да Беларусі. Хоць усім сёння вядома, што першую беларускую оперу «Агатка», дзе галоўнай гераіняй была простая сялянка, напісаў у Нясвіжы немец Ян Голанд, які працаваў пры двары Радзівілаў... Праблема нашай музычнай спадчыны (як і ўвогуле культурнай) у гістарычным шляху краіны, у нашай уласнай свядомасці: што лічыць сваім. У тым, што Беларусь уваходзіла ў склад розных дзяржаў, якія прылічылі нашых творцаў да сваёй культуры. Цяпер «белыя плямы» запоўненыя, мы ведаем, што наша прафесійнае музычнае мастацтва ўзнікла не ў мінулым стагоддзі, не на пустым месцы, што наша спадчына не знікла назаўсёды. Адбываецца яе вяртанне ў нашу свядомасць.

Адноўленыя

У свядомасці застаюцца многія з'явы з мінулага, якія паступова раскрывае Нясвіж. Адноўленая ратуша, дарэчы, працуе і не ў фестывальныя дні. У ёй адчыненыя пяць залаў, кожны з якіх можа раскрыць таямніцы сярэднявечча. У зале ўрачыстасцяў вельмі ўрачыста размясціліся партрэты, якія па заказу Міністэрства культуры выканаліі вядомыя мастакі, нашы сучаснікі. Стаяць комины, зробленыя паводле знойдзеных на раскопках палаца рэшткаў радзівілаўскай кафлі. Ёсць зала суда, архіў, казна, кабінет бурмістра. Кожная абстаўленая стылізаванай мэбляй, кожная можа распавесці нейкую гісторыю.

...Нясвіжскі архіварыус быў вельмі адказны чалавек — каля 4 тысяч архіўных дакументаў захаваліся ў ратушы. Дзякуючы архіву можна паглядзець, як выглядаў колькі стагоддзяў таму пашпарт нясвіжскага мешчаніна. Справы вяліся з усёй адказнасцю. Нясвіжскі пісар напрыканцы XVI—XVII стагоддзяў павінен быў ведаць чатыры мовы — беларускую, рускую, польскую і латынь, мець каліграфічны почырк. Такім напісаны літаральна ўсе дакументы. Сярод іх ёсць вельмі цікавыя.

Напрыклад, дакумент 1732 года засведчыў жаданне князя Мікалая Радзівіла Сіроткі выдаткоўваць пэўную суму грошай «на падтрымку бедных паненак». За гэтыя грошы можна было набыць карову. А гэта значыць, што дзяўчына ўжо не застанецца без пасагу. У Нясвіжы не было «беспасажніц», дзяўчаты маглі знайсці сабе жаніха, застацца ў родным горадзе, нарадзіць тут дзяцей. Вось вам дбанне аб паляпшэнні дэмаграфічнай сітуацыі! Ці яшчэ прыклад прадуманай «сацыяльнай палітыкі». У адной з залаў ратушы вельмі ўразіў вялізны куфар. Ён выконваў важную місію. Калі ў сям'і паміралі тата з маці, дзеці заставаліся сіротамі, улады бралі на захаванне ўсё, што ёсць каштоўнага ў хаце, потым вярталі тым жа дзецям, калі тыя сталелі — каб не пладзіліся жабракі.

— Мы плануем у адной з залаў паставіць макет горада, як ён выглядаў у XVIII стагоддзі, — распавядае Марына Станіслаўчык, загадчык сектара музея-запаведніка «Нясвіж». — З'явяцца ў залах васковыя фігуры войта і казначэя, дзеля большай цікавасці наведвальнікаў. Але экскурсій і цяпер багата. Каля 13 тысяч экскурсійных груп пабывалі ў Нясвіжскай ратушы ў 2006 годзе. Іх будзе яшчэ больш, калі адкрыецца першая чарга палацавага комплексу.

Гаспадарлівыя

Гэта паводле планаў павінна здарыцца бліжэй да канца года. Але мясцовыя кіраўнікі ўжо зараз думаюць, як падцягнуць горад да ўзроўню адноўленага палаца. Каб больш прывабіць тых жа турыстаў-экскурсантаў. Кветкі будуць упрыгожваць Нясвіж ужо сёлета. Дамам у цэнтры пакрысе будзе нададзены еўрапейскі выгляд. У цудоўным парку з'явяцца зручныя кавярні — без іх жа сёння які турызм? Таксама як і без гатэляў. Усё будзе, канешне, не адразу. І ў гэта няцяжка паверыць, калі ведаеш, што Нясвіжскі раён з'яўляецца сёння прыкладам эканамічнага развіцця для іншых рэгіёнаў Міншчыны і нават краіны і не толькі ў культурнай галіне стаў заканадаўцам доўгага тону. Доўгага тону на любоў і гонар сваімі здабыткамі. Гэта, дарэчы, спрыяе поспеху. За час існавання фестывалю ў раёне чацвёрты раз памяняўся старшыня — усе папярэднікі Макара рушылі працаваць у больш высокія структуры. Ігар Макар, вядомы гаспадарнік, тым не менш не адмовіўся ад ідэі правесці «Музы Нясвіжа», ён раней быў сярод спонсараў і з задавальненнем прыходзіў на канцэрты разам з жонкай. «Нясвіж быў, ёсць і будзе тварам ва ўсіх галінах — эканамічнай, сельскагаспадарчай, культурнай», — запэўніў старшыня райвыканкама. І паабяцаў праз два-тры гады правесці фестываль ужо ў новым Доме культуры.

Пашыраныя

Пашырэнне аўдыторыі слухачоў, праўда, адбылося ўжо сёлета — праз прамую трансляцыю радыё «Культура». Але ці можа канцэрт, які перадаецца па радыё, адлюстраваць настрой, з якім слухае музыку зала? У Нясвіжы звычайна гучыць беларуская музыка, якую мала дзе пачуеш.

— Гэта вельмі адказна і гэта вельмі цяжка, — гаворыць мастацкі кіраўнік фестывалю Міхаіл Фінберг. — Таму што трэба трымаць высокую планку ва ўсім, што робіш, а сёлета ў праграме быў спектакль Мінскага абласнога тэатра, выстава партрэтаў класікаў з фондаў музеяў Янкі Купалы і Якуба Коласа. Мы імкнуліся захаваць класічны накірунак — Камерны аркестр Нацыянальнага канцэртнага аркестра і ансамблі падрыхтавалі ўзоры беларускай музыкі, якая была напісана ў XX стагоддзі.

Беларуская музыка мінулага стагоддзя — гэта музыка нацыянальнай беларускай кампазітарскай школы. Цэлы шэраг вядомых імёнаў. І тут ёсць нешта вельмі незвычайнае. Раней мы аддавалі, а потым шукалі ў іншых краінах, а ў мінулым стагоддзі ўсё змянілася. Прафесійныя музыканты сталі прыязджаць у Беларусь і тут заставаліся. Мікалай Аладаў — выхаванец пецярбургскай школы. Руская музычная традыцыя ўжо з мінулых стагоддзяў пайшла па шляху выкарыстання народных мелодый. Гэтага шляху трымаліся кампазітары, якія прыехалі з Расіі і сталі беларускімі творцамі. Яны пісалі ў духу беларускага фальклору. Аладаў, напрыклад. Ён жа стварaў у Беларусі прафесійную музычную адукацыю, быў рэктарам кансерваторыі. Леў Абеліёвіч, ураджэнец Вільнюса, але вучыўся ў Варшаве. Ваяваў — ваенная тэма стала адной з галоўных у яго творчасці, што вельмі па-беларуску. Кампазітар Мікалай Чуркін нарадзіўся ў Арменіі, але найшоў сябе ў Беларусі, пасяліўся ў Мсціславе. Патрыярх беларускай кампазітарскай школы, ён зацікавіўся беларускай народнай музыкай. Запісваў шмат народных мелодый, якія потым выкарыстоўваў у музыцы. Яго твор «Вызваленне працы» стаў першай беларускай операй. Чуркін свядома арыентаваўся на беларускі фальклор, мову, на беларускую ментальнасць. Гучала ў Нясвіжы яго мазурка з драмы «Раскіданае гняздо» — хіба такое напішаш, не набраўшыся «беларускасці»? Яўген Глебаў — са Смаленшчыны. Аўтар цудоўных беларускіх балетаў, і тут не трэба нават тлумачыць, кожны і так скажа пра яго «наш»! Колькі нашых кампазітараў прайшло школу Анатоля Багатырова, які вучыў шанаваць музыку, якая «ад прадзедаў спакон вякоў»... Наш сучаснік кампазітар Дзмітрый Смольскі вельмі цікавіцца беларускай спадчынай. Шануе традыцыі, закладзеныя папярэднікамі, сам ужо стаўшы класікам. Ведаць — гэта адно, а вось адчуваць «класічнасць» яго твора «Сымон-музыка»... Можна толькі ў Нясвіжы, дзе гучыць беларуская музыка. Тая, якая не на адзін дзень, якая ніколі не будзе разжалаваная ў «шлягеры мінулых гадоў». Вось «Развітанне з радзімай» Агінскага нікто і ніколі не змог бы так назваць. Таму што ёсць у ім сапраўдны, вечны боль беларусаў за радзіму, якую яны хочуць бачыць. У Нясвіжы на гэтай музыцы зала заўсёды ўзнімаецца...

— Пяшчотны, таямнічы культурны фестываль насамрэч даўно пачаў акцыю «За незалежную Беларусь!», якая пайшла па краіне сёння, — адзначыў першы намеснік міністра культуры Уладзімір Рылатка. — Цяпер мы ведаем дакладна, што без гістарычных ведаў сапраўднай незалежнасці не бывае.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.56	21.18	16.22
Віцебск —	4.38	21.14	16.36
Магілёў —	4.46	21.08	16.22
Гомель —	4.50	20.57	16.07
Гродна —	5.12	21.32	16.20
Брэст —	5.21	21.25	16.04

Месяц

Першая квадра 24 мая.

Месяц у сузор'і Дзевы.

Імяніны

Пр. *Таісіі, Анісіма, Купрыяна, Сямёна.*

К. *Івоны, Рэнаты, Міхала, Яна.*

Надвор'е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА	+21 — +23 °C	МАСКВА	+20 — +22 °C
ВІЛЬНЮС	+18 — +20 °C	РЫГА	+19 — +21 °C
КІЕЎ	+29 — +31 °C	С-ПЕЦЯРБУРГ	+18 — +20 °C

Без ападкаў

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Дзве даты

23 мая

1572 год — у Вільні пачаў работу першы Галоўны з'езд Вялікага княства Літоўскага. Гэтыя з'езды з'яўляліся саслоўна-прадстаўнічымі органамі, на іх з'язджаліся ўпаўнаважаныя прадстаўнікі ад шляхты паветаў і ваяводстваў, духавенства, гарадоў. Склікаліся вялікімі князямі літоўскімі ў час бескаралеўя, а таксама па ініцыятыве шляхты беларускіх і літоўскіх зямель. На іх вырашаліся пытанні забеспячэння знешняй бяспекі дзяржавы, вызначаліся прынцыпы арганізацыі ўлады, пазіцыі ВКЛ у адносінах з Польскай Каронай і кандыдатамі на трон, прымаліся падаткі, разглядаліся праекты законаў, абмяркоўваліся кандыдатуры на розныя дзяржаўныя пасады. З'езды збіраліся ў асноўным у Вільні, некаторыя засядалі ў Гродне, Навагрудку, Ружанах, Слоніме.



1592 год — у Венецыі інквізіцыяй арыштаваны італьянскі філосаф Джардана Бруна, якога абвінавацілі ў ерасі.

Цытата дня:

«Востры язык — адзіная калючая зброя, якая ад частага ўжывання становіцца яшчэ больш калючай».

Вашынгтон Ірвінг (1783—1859), амерыканскі пісьменнік.

У суд Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці паступіла заява аб аб'яўленні памёрлай **МАЛЕЦІНАЙ Людмілы Уладзіміраўны**, 24 ліпеня 1964 года нараджэння, ураджэнкі г. Семіпалацінска (Казахстан) і жыхаркі г. Івацэвічы, вул. Чарткова, д. 37, кв. 47 (Брэсцкай вобл.).

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Малеціну Л.У., паведаміць іх суду Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

У суд Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **АБДУЛАЕВА Ханлара Арызман** аглы, 7 студзеня 1969 года нараджэння, ураджэнца сяла Тофігі Агдашскага раёна Рэспублікі Азербайджан, апошняе вядомае месца жыхарства якога па стану на кастрычнік 2004 года: г. Жлобін, вул. Школьная, 7.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Абдулаева Х.А.а., паведаміць іх суду Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Інфарм-укол

АНТЫАКСІДАНТЫ ДЛЯ МАЛОЧНАЙ ЗАЛОЗЫ

Самаабследаванне малочнай залозы варта праводзіць рэгулярна — 1 раз у месяц, праз 5—10 дзён пасля завяршэння менструацый. Калі ў жанчыны іх няма, то варта даследаваць малочную залозу кожны месяц у адны і тыя ж дні. Адзін раз у год неабходна абследавацца ў хірурга, гінеколага ці анколага і рабіць мамаграфію.

Калі падчас самаабследавання вы выявілі пэўныя змяненні — шчыльныя ўчасткі ў выглядзе «гарошыны», «вішні», «слівы» і г.д., неабходна тэрмінова звярнуцца да ўрача і ні ў якім разе не займацца самалячэннем!

Прычынамі захворвання малочных залоз могуць быць траўмы грудзей, стрэс, псіхічныя траўмы, няправільнае харчаванне, няхватка вітамінаў, запушчаныя запаленчыя захворванні палавых органаў, дабраякасныя захворванні малочнай залозы ці эндакрыннай сістэмы, спадчыннасць і іншае. Захворванне можна папярэдзіць. Нават калі гаворка ідзе пра рак малочнай залозы.

- Абараняйце грудзі ад траўм.
- Беражыце нервовую сістэму.
- Уключайце ў рацыён полівітаміны для жанчын.
- Рэгулярна прымайце антыаксідантныя комплексы, рэкамендаваныя для прымянення ў галіне анкалогіі і мамалогіі.

Антыаксідантныя комплексы аднаўляюць структуру пашкоджаных клетак і абарончыя сілы арганізма, запавольваюць працэсы будавання ў арганізме, зніжаюць рызыку ўзнікнення анкалагічных захворванняў. Антыаксіданты перашкаджаюць утварэнню свабодных радыкалаў пры стрэсах: пры таксічным уздзеянні цяжкіх металаў, радыенуклідаў, ультрафіялетавых і іанізуючых выпраменьванняў. Антыаксідантны комплекс з селенам не толькі спрыяе поспеху ў прафілактыцы мастапатыі, але і зніжае рызыку злаякаснага перараджэння тканак малочнай залозы.

Букет незвядальны

Першы рэспубліканскі фестываль-кірмаш рамёстваў «Вясновы букет» прадэманстраваў Беларусь самабытную і патэнцыяльна багатую

Кажуць, падобнага яшчэ не было. Каб адным разам сабраліся лепшыя майстры з усёй Беларусі па ўсіх, лічы, відах рамёстваў — больш за 250 удзельнікаў. Ды і ў такім добрым месцы — у Лошыцкім парку ў Мінску, дзе табе і бласлаўлёная Свіслач, і старадаўняя сядзіба, і рэшткі капліцы, і стары яблыневы сад у квецені... Надвор'е было — лепшага не пажадаеш. Яно кампенсавала недахоп рэкламы фестывалю і папрацавала на тое, каб парк напоўніўся наведвальнікамі якраз тады, калі можна было выбраць сабе што-небудзь непаўторнае, рукамі чалавечымі і сэрцам, і думкамі створанае. Альбо сябру, альбо каханаму, альбо дзіцяці. Ды яшчэ і самому зрабіць падкову ці саткаць колькі радкоў на рушніку, ці спасцігнуць сакрэт карункавай выцінанкі... І ўсё гэта пад спевы, пад жарты ды музыку, якую імкнуліся і не маглі перапець салаўі.

Але бадай што самае галоўнае — той, хто знарок альбо выпадкова завітаў у Лошыцкі парк у гэтую нядзелю, адкрыў для сябе новую краіну. Краіну, якая выклікае гонар, якая не падобная ні на адну іншую, краіну, якая спявае гімн жыццю і сама адначасова сталая, мудрая і маладая, поўная жыцця і фарбаў.

— Фестываль такі ладзіцца ўпершыню, ён прысвечаны 15-годдзю Беларускага саюза майстроў народнай творчасці, — расказала выканаўчы дырэктар аб'яднання Тамара Харланчук. — Сюды прыехалі з Дамоў рамёстваў не толькі абласных цэнтраў, але і раёнаў, і гарадоў. Да таго ж, мы запрасілі ўсіх членаў Саюза, а іх каля 400 чалавек. І прыехаў той, хто змог. Сабралася такое багацце рамёстваў, якога яшчэ не было ні на адным свяце на Беларусі. І работы прывезены самага высокага ўзроўню.

Фестываль стаў нечаканасцю і для саміх удзельнікаў.

— Вялікі наплыў людзей і людзей неабыякавых, — усміхаецца керамічст з Магілёва Наталля Русіян. — Раней такой цікавасці да рукатворных рэчаў не было. Я нават марожанае з'есці не змагла — растала, бо ўвесь час нехта альбо распытвае, альбо нешта купляе. Адчуваецца, што, нарэшце, наспеў попыт на наша, на нацыянальнае. Прычым, калі раней ён быў больш сярод іншаземцаў, то зараз — сярод саміх беларусаў.

Наталля працуе ў Магілёўскім этнаграфічным музеі, дэманструе для наведвальнікаў сваё рамяство — керамічныя свісцёлкі, акарыны, званочкі, флейты, ладзіць майстар-класы. У Мінск яна прывезла рэчы ўнікальныя — флейты, на якіх трэба іграць удвух — для каханых, каб разам прыгожыя мелодыі ствараць.

Больш за сто дудак зрабіў сваімі рукамі знакаміты майстар з Гродзеншчыны Мар'ян Скрамблевіч, і кожная мае свой голас. На фестываль у Мінск ён прывёз, можа, дзесяткі два, сярод якіх дудка-трысцінка, дудка-трубка, акарына ў выглядзе рыбы, двайныя і трайныя трубкі і лыжка, на якой таксама можна іграць вуснамі...

— Я шчаслівы, што сюды прыехаў, бо атрымаў столькі ўдзячных і захопленых позіркаў, столькі дзіцячых і дзявочых шчырых усмешак і добрых слоў, колькі не купіш ні за якія грошы, — кажа майстар.

Ён ведае, што яго мастацтва запатрабаванае прафесіяналамі-музыкамі, але дзякуючы фестывалю, ён упэўніўся, што яно цікава і для самых розных людзей — ад малечы да старых. А значыць, ёсць, дзеля каго дамаўляцца з дрэвамі пра музыку. Адно такое — тутавае — было прывезена 30 гадоў таму на Гродзеншчыну з Украіны — у падарунак на вяселле беларуса і ўкраінкі. І цяпер вось яно, пасля рук Мар'яна, пяе людзям пра нешта шчымлівае, таямнічае і светлае.

— Фестываль яшчэ раз паказаў, што мы маем вялізную магчымасць зарабляць грошы, дзякуючы народнай творчасці, — сказаў адзін з арганізатараў Юрый Адамовіч, майстра па мастацкай апрацоўцы дрэва і металу. — Усё гэта цікава і для нашых турыстаў і для замежных. Трэба толькі разумна падаць людзям, антураж стварыць адпаведны, тую ж паркоўку зручную зрабіць. Лошыцкі парк цудоўна падыходзіць для такіх мерапрыемстваў. І калі фестываль стане традыцыйным, калі ў ім адкрыць Цэнтр рамёстваў, то з'явяцца грошы і на рэканструкцыю сядзібы і на развіццё саміх рамёстваў.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

УСМІХНЁМСЯ!

Даішнік спыняе машыну. Падыходзіць, пытаецца сурова:

— Вы знак бачылі?

Вадзіцель:

— Бачыў.

Даішнік раптам прыемна ўсміхаецца:

— Сынок мой намаляваў...

☺

— Афіцыянт, я ў вашым супе славіў прусака!

— Нічога страшнага, вам яшчэ пашанцавала. Бачыце наведвальніка каля акна?

— Бачу, ну і што?..

— Дык вось ён не славіў...

☺

Муж — жонцы:

— Я прапаноўваю правесці навагоднія святы ў максімальна спакойнай сямейнай абстаноўцы, як гэта было калісьці.

Жонка заўважае, што муж успамінае нешта вельмі прыемнае, аж слёзы на вачах выступілі. Яна пяшчотна абдымае яго.

— Я згодная, любы. Давай абгаворым дэталі.

— Выдатная думка. Значыцца так — я куплю каўбасы, сыру, бутэлек пяць партвейну, а ты з'ездзіш у госці да сваіх бацькоў.

Спачатку беларус, а пасля журналіст!

Сусветны Дзень роднай мовы адзначаецца 21 лютага. Аднак мы любім ствараць свае святы, што часам і не супадаюць з календаром. Вось і студэнты факультэта журналістыкі БДУ вырашылі правесці Дзень беларускай мовы — у маі.

Падрыхтоўка пачалася з «плакатнай кампаніі». Першы курс распытваў выкладчыкаў пра самае мілагучнае слова ў беларускай мове. Найбольш выбітныя цытаты з'явіліся на афішах, што развешваліся на сценах факультэта. Прычым асабліва цікава было прачытаць выказванні настаўнікаў фізкультуры. Так, Аляксандра Давыдзіка можна пахваліць за вынаходлівасць: «Вот как по-белорусски будет слово «баскетбол»? Нет, не баскетбол, а «кошыкбол», потому что «backet» в переводе на белорусский значит «кошык».

У гэты дзень было вырашана размаўляць выключна па-беларуску. Нават супрацоўнікі сталовай і ахова прынялі такія ўмовы.

Арганізавалі вечарыну «Патэльня кахання».

— Каханне — гэта тое, што нам усім блізка, а значыць, яно аб'ядноўвае, — тлумачыць ідэю выбару назвы Ася Паплаўская.

Моладзь і каханне — непарыўныя, таму на вечарыне гучалі песні, вершы і проста словы пра гэта пачуццё. Пачалося ўсё з сярэднявечных танцаў, потым была паэзія. Дзявочыя сэрцы закалыхаліся, калі на сцэну выйшаў выкладчык і паэт Арцём Кавалеўскі. Любіміца першага курса, выкладчыца Аксана Бязлепкіна таксама парадавала сваёй творчасцю. Гучалі вершы Вікі Трэнас, Глеба Лабадзенкі і іншых. Паэтаў змянялі музыкі: Яўген Валошын спяваў «Калыханку», Андрэй Бананаў здзівіў публіку смеласцю інтымнай тэматыкі, а Зміцер Папко даказаў, што рэп па-беларуску не горшы за сусветны.

У прамежках паміж выступленні вядучыя правядзілі гульні «Разынкі-гузікі». Дзве каманды з педагогаў пад кіраўніцтвам Вікі Трэнас і Арцёма Кавалеўскага складалі верш па першаму радку «Сяджу на патэльні кахання...». А ў той жа час адбывалася гульня з залай. Гледачы падзяліліся на два сектары і выконвалі заданні па гісторыі, беларускай мове і літаратуры. Ніхто не здолеў узгадаць назву шахматнай фігуры «пешка» паводле Вацлава Ластоўскага. Затое цяпер ужо дакладна ведаюць слова «ніжнік».

Не меншую цікавасць выклікаў конкурс сярод кіраўніцтва факультэта (дэкана С.В. Дубовіка і яго намеснікаў) і выкладчыкаў. Удзельнікам прапаноўвалася не проста заняцца тыповым беларускім заняткам — пачысціць бульбу, але і выразаць з яе сардэчка.

Усім удзельнікам раздаваліся прызы — цукеркі і дыскі з прадубляванымі на беларускую мову фільмамі «Шрэк-2» і «Маленькая калядная казачка» (Швецыя). Завяршыўся Дзень беларускай мовы беларускай дыскатэкай.

«Плакатная кампанія» будзе працягвацца. Выкладчыкам варта ўжо зараз рыхтавацца не толькі слухаць на заліках студэнтаў, але і самім адказваць на пытанні студэнтаў па мове, а пасля чытаць іх на афішах...

Студэнты факультэта журналістыкі засведчылі, што беларуская мова — сярод нас. Беларуская мова — гэта модна.

— Мы хочам, каб моладзь адчувала сябе перш за ўсё беларусамі, а пасля журналістамі, — гавораць арганізатары Дня роднай мовы.

Наталля ІСАЕВІЧ.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19(тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79,

e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zviazda.by **E-mail:** info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 34.693. Індэкс 63850. Зак. № 2756. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12